Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
№ 93 (28709)
18 МАЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ. ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ +TV ПРАГРАМА



**Сфера паслуг: ад прыватнага да агульнага**
СТАР. 5



**Як жыве «Надзея»**
МС



**Чаго не хапіла на «Еўрабачанні»?**
СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый МІЦКЕВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Інфарматызацыя дазваляе знаходзіць новыя шляхі вырашэння прыкладных задач у прававой сферы, служыць добрым імпульсам для ўдасканалення нарматворчай і правапрымяняльнай дзейнасці, спрыяе павышэнню эфектыўнасці нацыянальнага заканадаўства. Беларусь, прызнаючы велізарны патэнцыял інфарматызацыі, праводзіць дзяржаўную палітыку, накіраваную на актыўнае ўкараненне гэтых тэхналогій у жыццё, у тым ліку ў прававую сферу. Сёння ў краіне комплексна вырашаны пытанні забеспячэння юрыдычных і фізічных асоб актуальнай прававой інфармацыяй у электронным выглядзе».*

ISSN 1990 - 763X
18093

# У ІВАНА — ПАСЯЎНАЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У вёсцы Снядзін Петрыкаўскага раёна — час сяўбы. Сёлета вялікая вада з Прыпяці зноў падтапіла населены пункт. Нягледзячы на капрызы прыроды, вяскоўцы ўсё роўна дбаюць пра свае агароды і соткі. Некаторыя з іх ужо не маюць сілы, каб навесці парадак на зямлі і пасадзіць бульбу, памідоры і агуркі. І тады ім дапамагаюць сацыяльныя работнікі. Іван РУБЧЭЎСКІ, пад апекай у якога знаходзяцца сем пенсіянераў і інвалідаў, своечасова праводзіць пасяўную, не забываючы пра кожнага падапечнага. На гэтым здымку Іван дапамагае сям'і Ніны ЗАНКЕВІЧ.**

СТАР. 4

■ Падпіска-2018

## ШЧАСЛІВЫЯ...

**«Калі ёсць у газеты шчыра адданы падпісчык, то гэта я...» З такіх вось прызнанняў пачынаюцца многія лісты ў рэдакцыю і многія, нават... выпадковыя, знаёмствы.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У апошнім розыгрышы прызоў набор садовага інструменту No Brand выйграла **Лідзія Васілеўна ДРАБА** з аграгарадка Чапукі Мёрскага раёна і, вядома ж, узрадавалася. А вось каб пад'ехаць ды забраць... За блізкі свет...

На шчасце, у Лідзіі Васілеўны ёсць сястра — Раіса Васілеўна. І ў той у Мінску — дзеці. Вось і сумясціла яна надоўгае гасцяванне ў іх з кароткім візітам у рэдакцыю, дзе расказала, што «Звязду» яе малодшая выпісвае гадоў 25, а то і болей, што газета вельмі падабаецца ўсёй сям'і: гаспадару Мікалаю (па прафесіі ён кіроўца і старэйшына вуліцы), дачцэ Таццяне, сыну Яўгену, які жыве цяпер асобна, працуе галоўным інжынерам на «Полацкгазе» і выхоўвае слаўную дачушку Дашачку, што сама наша падпісчыца ўсё жыццё настаўнічае ў Чапукоўскай сярэдняй школе, што вучыла ў тым ліку нашу шаноўную каляжанку Надзею Дрындрожык, што дом Драбаў з ранняй вясны патанае ў кветках... І не толькі. А таму звяздоўскі прыз у выглядзе набору садовага інструменту, вядома ж, спатрэбіцца.

А яшчэ шаноўная Раіса Васілеўна з ахвотай... сфатаграфавалася, бо, сказала, што з сястрой яны, як дзве кроплі вады і ўсё жыццё — рука аб руку, і ў бядзе, і ў радасці.

...На пытанне, ці шчаслівыя, розныя людзі і ў розныя часы адказваюць па-рознаму, але найчасцей — услед за Жванецкім — адмоўна.

Сёстры на тое ж пытанне, адказваюць: «Так». І маюць, як выглядае, рацыю.

***Вось так, ненавязліва, мы нагадваем чытачам, што пачалася новая падпісная кампанія і што, аформіўшы падпіску на «Звязду», можна не толькі пяць разоў на тыдзень атрымліваць газету, але і выйграць каштоўныя прызы.***

■ Разумныя грошы

## З «пластыкам» за мяжу

### Рэальна нават вярнуць няправільна спісаныя там грошы

**Хутка сезон адпачынкаў, многія паедуць за мяжу і возьмуць з сабой банкаўскія карткі. Вядома, з імі зручней, чым з наяўнымі. Але трэба дзейнічаць разумна, каб не сутыкнуцца з цяжкасцямі і не застацца ў чужой краіне без грошай.**

«Казкі ўсё гэта», — скажа дасведчаны карыстальнік карткі. На самай справе не. Такіх гісторый маса. Самая распаўсюджаная праблема — вы паспрабавалі нешта аплаціць па картцы, але транзакцыя не прайшла. Потым высвятляецца, што «пластык» быў заблакаваны. Ці яшчэ адна складанасць: у некаторых краінах (напрыклад, Кітаі ці Японіі) банкаматы не прымаюць чатырохзначны пін-код, а патрабуюць шасцізначны. Альбо не счытваюць карткі самых распаўсюджаных плацежных сістэм — Visa і MasterCard. Што рабіць?

### Якую картку выбраць?

Наш эксперт безнаяўных плацяжоў, рэгіянальны **менеджар Visa ў Беларусі, Азербайджане і Малдове Ігар КАВАЛЁЎ** лічыць, што выбар залежыць ад краіны, у якую вы збіраецеся. Напрыклад, у ЗША ці Японіі шмат старых тэрміналаў, дзе счытваецца толькі картка з магнітнай палоскай. А вось у Вялікабрытаніі ўсё наадварот — касіры з цяжкасцю спраўляюцца з карткамі без чыпаў, ім гэта нязвыкла.

СТАР. 4

■ Парламенцкі дзённік

# У АДПАВЕДНАСЦІ З РЭАЛІЯМІ

## Галоўныя навіны пра Жыллёвы кодэкс, сітуацыю на рынку працы і меры супраць наркагандляроў

**Учора падчас пасяджэння чацвёртай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу дэпутаты разгледзелі восем пытанняў, сярод іх — законапраекты, звязаныя з абаронай правоў спажыўцоў, Жыллёвым кодэксам, Дэкрэтам № 1, змяненні ў Павятраны кодэкс, а таксама ратыфікацыя пагадненняў, пратаколаў і мемарандумаў з Грузіяй, Мазамбікам, Намібіяй і СНД у розных сферах.**

### Калі дом падлягае зносу

**Міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Аляксандр ЦЕРАХАЎ**, прадстаўляючы законапраект аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы па пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін, адзначыў, што, нягледзячы на нядаўняе прыняцце цяперашняга Жыллёвага кодэкса (у 2012 годзе), жыллёвыя рэаліі істотна змяніліся, таму неабходны актуальныя прававыя акты. Новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса не змяшчае рэвалюцыйных навін, але сістэматызуе ў адзіным дакуменце тое, што было выпрацавана за апошнія гады.

У чым жа заключаюцца прынцыповыя адрозненні новага Жыллёвага кодэкса? Напрыклад, з'явіцца магчымасць пераводу арэнднага жылля ў жылыя памяшканні сацыяльнага карыстання, але толькі для пэўнай катэгорыі грамадзян. Міністр растлумачыў, што масавасць такога працэсу не маецца на ўвазе. «Так, ёсць 11 катэгорый грамадзян, з улікам даходаў якіх прымаецца рашэнне, і сем катэгорый без уліку даходаў», — адзначыў міністр.

Акрамя таго, у праекце закона ўрэгуляваны аспекты фінансавай арэнды жылых памяшканняў, адлюстравана новая структура дзяржаўнага жыллёвага фонду (сацыяльнае жыллё, жыллё ў інтэрнатах, спецыяльныя жылыя памяшканні і арэнднае жыллё), замацаваны абавязак удзельнікаў долевай уласнасці аплачваць жыллёва-камунальныя паслугі (ЖКП) суразмерна сваёй долі.

Дэпутаты закранулі тэму аптымальнага выбару месца жыхарства для людзей, чые дамы павінны знесці пад патрэбу забудовы іншых аб'ектаў, паколькі сёння нямала выпадкаў, калі жыхары не задаволены варыянтамі замены. Аляксандр Церахаў падкрэсліў, што гэтае пытанне будзе абмяркоўвацца экспертамі і парламентарыямі падчас падрыхтоўкі праекта да другога чытання, таксама будзе ўлічвацца меркаванне розных ведамстваў і органаў. «На маю думку, было б правільна даць чалавеку магчымасць выбраць жыллё ў тым жа раёне», — дадаў ён.

Пазней, размаўляючы з журналістамі, міністр падкрэсліў, што празрыстасці пры аплаце ЖКП у інтэрнэце павінна быць больш. Гэтую пазіцыю падтрымліваюць і дэпутаты. «Увёў паказанні прыбораў уліку водазабеспячэння — і ты павінен бачыць, колькі табе налічана за ваду, — растлумачыў ён. — У канчатковым выніку перад тым як пацвердзіць свой плацеж, чалавек павінен бачыць усю структуру, за што плаціць. Па-мойму, гэта неабходна зрабіць для таго, каб у далейшым адмовіцца ад папяровых рахункаў-паведамленняў. Работа ў гэтым напрамку ідзе. Да канца года гэтую тэму ўжо пабачым».

### Сітуацыя на рынку працы паляпшаецца

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ** прадставіла Дэкрэт № 1 аб садзейнічанні занятасці. Так, амаль палова раёнаў з напружанай сітуацыяй на рынку працы палепшыла яе.

«На 2018 год вызначаны 48 тэрыторый з напружанай сітуацыяй на рынку працы, — адзначыла яна. — Вынікі першага квартала сведчаць, што ў 23 раёнах сітуацыя палепшылася, што складае 48 % ад іх агульнай колькасці. Не змянілася — у 20, пагоршылася — у пяці раёнах: у Кобрынскім, Аршанскім, Полацкім, Хойніцкім і Слуцкім».

Міністр падкрэсліла, што дэкрэт закліканы актывізаваць рынак працы, садзейнічаць працаўладкаванню ўсіх ахвотных. З гэтай мэтай ствараюцца спецыяльныя камісіі, у якія ўваходзяць не толькі дэпутаты і чыноўнікі, але і прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў.

Яшчэ Ірына Касцевіч расказала, што зараз вывучаецца магчымасць пераходу на электронныя працоўныя кніжкі. Акрамя таго, дадала яна, што пакуль пашыраць спіс паслуг, за якія людзі без працы будуць плаціць па поўных тарыфах, не плануецца.

### Паслабленні ў антынаркатычны закон

У кулуарах сесіі **старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Валянцін МІХНЕВІЧ** расказаў, што законапраект аб змякчэнні крымінальнай адказнасці за незаконны абарот наркотыкаў можа быць прыняты ў першым чытанні на вясновай сесіі, калі не будзе істотных канцэптуальных заўваг з боку дэпутацкага корпуса.

«Па законапраекце адбудзецца вялікая праца, — адзначыў ён. — Тыя прапановы, якія выказвалі дэпутаты, рэалізаваны ў гэтым праекце. Там якраз вызначаны парадак адпаведнасці пакарання здзейсненаму ўчынку».

Валянцін Міхневіч расказаў пра меркаваныя паслабленні ў законапраекце: так, у частцы 2 артыкула 328 (незаконныя з мэтай збыту выраб, перапрацоўка, набыццё, захоўванне, перавозка або перасылка або незаконны збыт наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсораў або аналагаў) прадугледжана паніжэнне ніжняй санкцыі з пяці да трох гадоў, тое ж самае датычыцца і часткі 3 гэтага ж артыкула: зніжэнне мінімальнага тэрміну пакарання з васьмі да шасці гадоў.

Ён таксама дадаў, што дакумент саправды аб'ёмны і датычыцца не толькі наркатычных злачынстваў. Будуць вывучаны пазіцыі розных ведамстваў па гэтым пытанні, а папраўкі плануецца ўнесці яшчэ ў Крымінальна-працэсуальны і Крымінальна-выканаўчы кодэксы.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ЭРДАГАН ЗАЯВІЎ ПРА КРАХ ААН



Прэзідэнт Турцыі Таіп Эрдаган заявіў, што Арганізацыя Аб'яднаных Нацый вычарпала свае магчымасці па вырашэнні сусветных праблем, перадае словы турэцкага лідара агенцтва Anadolu.

«ААН вычарпаная, знясіленая, гэтая арганізацыя рухнула», — сказаў Эрдаган на вячэры падчас святога для мусульман посту Рамадан.

Таксама турэцкі лідар чарговы раз асудзіў ваенныя дзеянні Ізраіля ў сектары Газа: ізраільская армія выкарыстоўвае зброю супраць палесцінскіх дэманстрантаў, абураных адкрыццём пасольства ЗША ў Іерусаліме.

У сувязі з гэтымі падзеямі Турцыя адклікала сваіх паслоў з Ізраіля і ЗША. Ізраіль прыняў рашэнне аб высылцы турэцкага консула ў Іерусаліме.

## ДАДОН АБВЯСЦІЎ ПРА МАГЧЫМАЕ ЗАКРЫЦЦЁ ОФІСА НАТА Ў МАЛДОВЕ

Малдова — нейтральная краіна і не будзе станавіцца часткай якога-небудзь ваеннага блока, заявіў прэзідэнт рэспублікі Ігар Дадон, спасылаючыся на «меркаванне большасці грамадзян». Пра гэта ён сказаў у інтэрв'ю газеце «Вести», апублікаваным у чацвер, 17 мая.

Офіс НАТА па інфармаванні ў Кішынёве, па словах Дадона, спрабуе змяняць грамадскую думку. «Думаю, у іх у кароткатэрміновай перспектыве нічога не атрымаецца. А ў сярэднетэрміновай, нагадаю, я заўсёды выступаў супраць офіса НАТА ў Кішынёве. Ёсць вялікая імавернасць, што пасля парламенцкіх выбараў у канцы гэтага года офіс альянсу будзе закрыты», — дадаў прэзідэнт.

Паўночнаатлантычны альянс зацікаўлены ў Малдове, бо яму «трэба як мага бліжэй падабрацца да межаў Расійскай Федэрацыі», тлумачыць Дадон.

Малдова супрацоўнічае з НАТА з 1994 года ў рамках індывідуальнага плана партнёрства. Цэнтр інфармацыі і дакументацыі НАТА быў адкрыты ў Кішынёве ў 2007 годзе. У снежні 2017 года ў горадзе адкрылася бюро сувязі альянсу, Дадон актыўна выступаў супраць гэтага кроку.

У Малдове працягваецца супрацьстаянне паміж па-прарасійску настроеным прэзідэнтам Дадонам і прозаходняй парламенцкай большасцю.

## ЗА ГОД ГЕРМАНІЯ ВЫДАТКАВАЛА НА БЕЖАНЦАЎ БОЛЬШ 20 МЛРД ЕЎРА

Выдаткі на ўтрыманне і інтэграцыю бежанцаў, а таксама на ліквідацыю прычын іміграцыі ў краінах выхаду абышліся федэральнаму бюджэту Германіі ў 2017 годзе ў 20,8 млрд еўра. Пра гэта паведаміла газета Handelsblatt, спасылаючыся на справаздачу Міністэрства фінансаў ФРГ.

Большую частку — 14,2 мільярда еўра — Германія патраціла на ліквідацыю прычын узнікнення хваль бежанцаў у краінах іх выхаду. Гэтыя грошы размяркоўваліся праз МЗС ФРГ і Міністэрства эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця. 6,6 мільярда еўра былі накіраваны ў федэральныя землі і камуны, на якія лёг асноўны цяжар у забеспячэнні бежанцаў жыллём, інтэграцыйнымі курсамі і іншымі відамі дапамогі.

9 мая ўрад Германіі ўзгадніў тэкст законапраекта пра ўз'яднанне сем'яў бежанцаў, якія атрымалі ў ФРГ абмежаваную ступень абароны. Згодна з ім, са жніўня 2018 года бежанцам дазволяць прывезці іх мужа ці жонку і непаўналетніх дзяцей. Акрамя таго, права падаць запыт на ўз'яднанне атрымаюць бацькі падлеткаў, якія ўжо знаходзяцца на тэрыторыі ФРГ. У Германію такім чынам змогуць уязджаць не больш за 1000 чалавек у месяц.

## РАСКАЗАЦЬ ПРА ТОЕ, ШТО ХВАЛЮЕ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі па ўсёй Беларусі пройдуць у гэтую суботу, 19 мая. На сувязь з насельніцтвам выйдуць кіраўнікі ў рэгіёнах і Мінгарвыканкаме. Вынік такога дыялогу — аператыўнае вырашэнне надзённых пытанняў, зрэшты, ад суботы да суботы колькасць праблемных званкоў скарачаецца.**

Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 у суботу правядуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Віктар Сяргеевіч ЛАПЦЕЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

■ З нагоды

## УЛАДАЛЬНІКАЎ ІНТЭРНЭТ-ПРЭМІІ «ТІБО-2018» УЗНАГАРОДЗІЛІ Ў МІНСКУ

**Конкурс на самы лепшы беларускі інтэрнэт-рэсурс сёлета праводзіўся па дзесяці асноўных намінацыях. Усяго было пададзена 330 заявак.**

Як падкрэсліў **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ**, сёння шмат гаворыцца аб лічбавай будучыні і лічбавай эканоміцы. «Хацелася б пажадаць усім удзельнікам цырымоніі, каб яны як мага шырэй прадстаўлялі лічбавую будучыню ў нашай сучаснасці», — заявіў ён.

Найлепшым інтэрнэт-рэсурсам рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання прызнаны сайт Міністэрства аховы здароўя. Сярод інтэрнэт-рэсурсаў гарадскіх, абласных і раённых выканаўчых камітэтаў першае месца прысуджана афіцыйнаму сайту Іўеўскага райвыканкама. Члены журы таксама назвалі найлепшыя інфармацыйныя рэсурсы. У гэтым годзе першае месца прысуджана парталу «СБ. Беларусь сегодня».

■ Транспарт

# САЧЭННЕ ЗА ГРУЗАВІКАМІ

**Прадпрыемства «АГАТ — сістэмы кіравання» сумесна з аператарам velcom плануюць запусціць у тэставую эксплуатацыю сістэму глабальнага маніторынгу грузавых аўтамабіляў.**

На першым этапе плануецца рэалізаваць восем інавацыйных праектаў у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Адзін з іх прадугледжвае выпрабаванне сістэмы глабальнага маніторынгу ў сферы аўтамабілебудавання з выкарыстаннем тэхналогіі геалакацыі. Тэсціраванне павінна прайсці ў найбуйнейшым у краіне дата-цэнтры velcom. **Запуск сістэмы дасць магчымасць павысіць прадукцыйнасць кар'ернай тэхнікі і знізіць эксплуатацыйныя выдаткі.**

Сістэма маніторынгу можа аўтаматычна збіраць інфармацыю пра месцазнаходжанне (з дакладнасцю да 10 метраў) і хуткасць грузавога аўтамабіля. Яна таксама заклікана адсочваць стан вузлоў і агрэгатаў велікагрузных машын. Для гэтага на грузавікі ўстаноўлены бартавыя модулі вытворчасці «АГАТ», якія праз спадарожнікі GPS і ГЛАНАСС перадаюць інфармацыю ў «мазгавы цэнтр». Дата-цэнтр у сваю чаргу адказвае за атрыманне, апрацоўку і сістэматызацыю даных.

«Аб'яднанне намаганняў дазволіць дасягнуць сінергетычнага эфекту, паколькі кожная кампанія валодае ўнікальным вопытам у сваёй галіне. Праекты, якія мы плануем рэалізаваць, дадуць магчымасць павысіць эфектыўнасць эканомікі краіны і прыўнесці інавацыі ў розныя галіны. Усё гэта будзе спрыяць развіццю Беларусі і ўмацаванню яе пазіцый на сусветным рынку. Нашы намаганні таксама будуць накіраваны на павышэнне інфармацыйнай бяспекі краіны», — звярнуў увагу **дырэктар ААТ «АГАТ — сістэмы кіравання» Генадзь КАЗАКОЎ.**

Узаемадзеянне двух кампаній адкрывае шырокія магчымасці для рэалізацыі высокатэхналагічных праектаў у Беларусі.

«Мы разлічваем, што наша супрацоўніцтва стане выдатным прыкладам партнёрства прыватнай і дзяржаўнай арганізацыі. Сумеснымі намаганнямі будуць распрацаваны і ўкаранёны рашэнні на стыку тэлекамунікацый, транспарту і геаінфармацыйных сістэм. Вялікую ролю адыгрываюць тэхналогіі Big Data і «інтэрнэт рэчаў». Пры гэтым найбуйнейшы ў краіне дата-цэнтр забяспечыць неабходнымі вылічальнымі магутнасцямі і кругласутачным доступам да інфармацыйных рэсурсаў», — адзначыў **генеральны дырэктар кампаніі velcom Гельмут ДУЗ.**

Супрацоўніцтва кампаній будзе накіравана на пабудову лічбавых сістэм, якія патрабуюцца для ўстойлівага развіцця краіны.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Справы духоўныя

# Нябесная заступніца сацыяльных службаў

## У Мінск прыбудуць мошчы святых вялікай княгіні Елісаветы і інакіні Варвары

**Святыні з вечара 19 мая і да абеду 20 мая будуць знаходзіцца ў Свята-Духавым кафедральным саборы Мінска. З пяці гадзін вечара 20 мая да 22 мая кругласутачны доступ арганізаваны ў Дзяржаўным храме Свята-Елісавецінскага манастыра ў мікрараёне Навінкі.**

Княгіня Елісавета — адна з агульнашанаваных святых у праваслаўных вернікаў. Больш за дзясятак храмаў у свеце пабудаваны ў яе гонар. Прыбыцця мошчаў княгіні Елісаветы асабліва чакаюць насельніцы манастыра (іх больш за 100) у Навінках, які носіць яе імя.

— Сёстры кажуць: «Матушка Елісавета прыедзе». Спачатку не верыцца, пакуль не ўбачыш афішы. Прыезд нашай святой стане сапраўдным душэўным уздымам для сясцёр, — кажа манашка Свята-Елісавецінскага манастыра Сафія (Крупіна).

Манастыр невыпадкова носіць імя святой княгіні. Побач з ім знаходзяцца дзіцячы і дарослы псіханеўралагічныя дыспансеры, рэспубліканскі цэнтр псіхічнага здароўя. Такія хворыя патрабуюць асаблівай любові і клопату, якія пры жыцці паказвала Елісавета і яе паплечніцы ў створаным ёю Марфа-Марыінскім прыстанку.

— Калі выбіралі месца для манастыра, тут была пустка. Разумелі, што мы размесцімся побач з бальніцай і павінны акармляць людзей, якія знаходзяцца там, — адзначае манашка Сафія (Крупіна).

Падзвіжніца ХХ стагоддзя вядомая як нябесная заступніца лекараў, супрацоўнікаў сацыяльных службаў і дабрачынцаў. «Святая Елісавета — яна таксама і ахоўніца сямейных пар і духоўна нямоглых. Многія людзі хварэюць духоўна — стрэсы, гонка ў працы. Галоўнае, каб чалавек ішоў да святыні з верай. Ад каўчэга з мошчамі княгіні Елісаветы кожны прыхаджанін пойдзе суцешаны», — сказала манашка Сафія.

У Мінск з Нью-Ёрка будзе прынесены каўчэг з правіцай княгіні і часткай мошчаў інакіні Варвары. «Нават маленькая рэштка мошчаў святога валодае такой жа сілаю харыства Божага, як і ўсе мошчы, таму часткі вымаюцца для пакланення, — адзначае Аляксандр Бендзін, доктар гістарычных навук, прафесар кафедры багаслоўя Інстытута тэалогіі БДУ. — Да мошчаў звяртаюцца людзі, якія апынуліся ў цяжкіх жыццёвых абставінах, — хвароба, гора. Чалавек разумее сваё поўнае бяссілле, і застаецца апошняя надзея — на дапамогу Божую...

**Марыя ДАДАЛКА**

■ Надвор'е

# НА ВЫХАДНЫЯ ПАХАЛАДНЕЕ

## У нядзелю да нас завітае паветра з паўночных шырот

**У бліжэйшыя дні ў краіне захаваецца няўстойлівае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу тэрыторыя нашай краіны застанецца пад уплывам франтальных надзелаў, якія абумовяць на яе большай частцы кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 9—14 цяпла, удзень — ад плюс 16 градусаў на паўночным захадзе да 23 цяпла на паўднёвым усходзе краіны. У нядзелю чакаецца змена надвор'я і пахаладае. Так, 20 мая на тэрыторыю краіны распаўсюдзіць уплыў вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў халоднай паветранай масе паўночных шырот. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы месцамі па Гомельскай вобласці, а ўдзень у асобных раёнах Віцебскай вобласці не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 3—8 цяпла, толькі па паўднёвым усходзе яна складзе плюс 9—12 градусаў, удзень тэмпература павысіцца да плюс 14—21 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня захаваецца няўстойлівае надвор'е. У панядзелак уначы ў асобных раёнах, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе усяго плюс 3—10 градусаў, але ўдзень павялічыцца да 13—19 цяпла, а месцамі прыгрэе ад плюс 20 да плюс 22 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## БРУК З ІМЁНАМІ

**Магілёў працягвае падрыхтоўку да V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Ідзе рэканструкцыя шэрагу аб'ектаў, у тым ліку галоўнага — плошчы Славы.**

Як мы ўжо паведамлялі раней, яна будзе выбрукаваная гранітнай пліткай. Дарэчы, імяннной. Жыхарам горада прапанавалі ўвекавечыць сваё імя падчас акцыі «Імёны Магілёва». Для гэтага трэба ў перыяд да 15 чэрвеня звярнуцца ў гарадское ўпраўленне камунальных прадпрыемстваў з квітанцыяй аб аплаце 65 рублёў, заключыць дагавор і атрымаць сертыфікат. Удзельнік акцыі пры гэтым атрымае права на гравіроўку свайго прозвішча, імя і імя па бацьку на гранітным бруку плошчы Славы. Замест сябе ахвотныя могуць упісаць імя нейкай асобы, якая пакінула след у гісторыі горада. Удзел у добрай справе могуць прымаць не толькі магіляўчане, але і жыхары іншых абласцей і нават краін.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## АХВЯРЫ ДАРОСЛАЙ ЯЗДЫ

**Лячэнне дзяцей, што пацярпелі ў аварыі пад Камянцом, працягваецца.**

Непаўналетнія пасажыры з Украіны, якія трапілі ў ДТЗ, праходзяць курс лячэння ў Брэсцкай абласной бальніцы. Нагадаем, аварыя адбылася ў сем гадзін раніцы 13 мая на трасе Р98. Кіроўца мікрааўтобуса, грамадзянін Украіны, не справіўся з кіраваннем і сутыкнуўся з аўтапагрузчыкам «Амкадор». У выніку адзін юны пасажыр загінуў, шасцёра атрымалі цялесныя пашкоджанні і былі дастаўлены ў Камянецкую райбальніцу, адтуль іх перавезлі ў Брэст.

Чацвёра пацыентаў ужо пераведзены з рэанімацыі ў іншыя аддзяленні, двое па-ранейшаму знаходзяцца ў рэанімацыі, іх стан характарызуецца як стабільна цяжкі. Пра гэта паведаміў **намеснік галоўнага ўрача Брэсцкай абласной бальніцы Вячаслаў ГАЎРЫЛЕНКА**. У абласным цэнтры знаходзяцца бацькі і родныя пацярпелых. А 12-гадовага хлопчыка, які загінуў, ужо пахавалі на радзіме.

Тым часам у Столінскую раённую бальніцу паступілі на лячэнне двое маленькіх дзяцей, якіх бацька перавозіў у машыне нават без дзіцячых крэслаў. Аварыю пад Столінам справакаваў кіроўца «мерсэдэса», які ехаў з прычэпам. Той прычэп, не замацаваны як след, адарваўся і выехаў на сустрэчную паласу, дзе ў яго ўляцеў «фольксваген». У выніку ДТЗ хлопчык, якому няма і трох гадоў, атрымаў траўмы галавы, а дзяўчынка, якой тры месяцы застаецца да двух гадоў, атрымала перелом сцягна. Ва ўпраўленні ДАІ паведамілі, што кіроўца першай машыны 45 разоў прыцягваўся да адказнасці за парушэнне правілаў на дарозе, а бацька пацярпелых дзяцей — 42 разы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## НЕ ЎКЛЮЧАЙ, БО ЛЯСНЕ

**«Белтэлекам» рэкамендуе выключаць мадэмы падчас навальніц.**

У «Белтэлекам» рэкамендуюць адключаць мадэмы і прыстаўкі падчас навальніц. Як растлумачылі ў кампаніі, метэаралагічныя з'явы ўтвараюць электрамагнітны імпульс, які ствараe магутную шырокапалосную перашкоду, што можа паўплываць на працу бесправадных прыбораў (Bluetooth, Wi-Fi) і на электрычныя сеткі. Таму пасля непагадзі абсталяванне можа перастаць працаваць.

«У выпадку, калі ў вас з'явілася праблема, паспрабуйце ўключыць абсталяванне ў іншую разетку або ўстанавіць заводскія налады. Калі гэтыя дзеянні не дапамагаюць, звярніцеся ў сэрвісны цэнтр кампаніі для замены прыстаўкі ці мадэма», — звярнулі ўвагу спецыялісты тэхнічнай падтрымкі «Белтэлекам».

Згодна з парадкам аказання паслуг, каб пазбегнуць пашкоджанняў абсталявання апаратара, выкліканых уплывам метэаралагічных з'яў (напрыклад, навальнічных разрадаў), абанент павінен выключаць абсталяванне з сеткі электрасілкавання пры іх узнікненні.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

## ПАЧАЛОСЯ ПАЛЯВАННЕ НА КАЗУЛЮ

**Здабываць дазволена дарослых самцоў, а таксама селекцыйных жывёл гэтага віду любога полу і ўзросту.**

У адпаведнасці з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, паляванне на казулю дазволена на працягу сутак спосабамі — з засады, з падыходу. Дапускаецца выкарыстанне ў якасці прылад палявання наразной (з дульнай энергіяй кулі звыш 1500 джоуляў), гладкаствольнай (з выкарыстаннем патронаў з куляй або карцечу) і кідальнай (паляўнічыя лукі і арбалеты) паляўнічай зброі, нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Для вышуку здабытых і здабычы параненых паляўнічых жывёл у працэсе летняга палявання на еўрапейскую казулю можна выкарыстоўваць выжлаў, спаніэляў, рэтрывераў, тэр'ераў і таксаў, а таксама сабак іншых парод, якія маюць палявы дыплом па крывяным следзе.

Згодна з сумесным растлумачэннем некаторых пытанняў прымянення Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання (лісты Мінлясгаса і Дзяржінспекцыі), датай пераходу капытных паляўнічых жывёл з узроставай групы «маладняк» ва ўзроставую групу «дарослыя» варта лічыць дату пачатку новага біялагічнага года — 1 красавіка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## КАЛІ АЛКАГОЛЬ ПАД ЗАБАРОНАЙ

**Продаж алкагольных напояў будзе абмежаваны ў Мінску 30 мая і 9 чэрвеня з-за правядзення апошніх званкоў і выпускных вечароў у школах. Адпаведнае рашэнне Мінгарвыканкама ад 4 мая 2018 года № 1480 афіцыйна апублікавана ў сераду на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

У прыватнасці, не будуць прадавацца алкагольныя напоі — гарэлка, лікёра-гарэлачныя вырабы, віны, каньяк, брэндзі, кальвадос, шампанскае і іншыя з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7 % і вышэй — з 8 гадзін раніцы 30 мая да 8 гадзін раніцы 31 мая і з 8 гадзін раніцы 9 чэрвеня да 8 гадзін раніцы 10 чэрвеня. У гэты ж перыяд у крамах не будуць рэалізоўваць піва і слабаалкагольныя напоі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту не больш за 7 %.

Гэта абмежаванне не закране продажу алкаголю ў аб'ектах грамадскага харчавання, але толькі ў выпадку, калі напоі прапануюцца ў разліў. Згаданае рашэнне Мінгарвыканкама ўступіла ў сілу з даты афіцыйнага апублікавання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Плыў па горадзе водар...

## Тыдзень бэзу праходзіць у Батанічным садзе



Знакаміты бэзавы сад Цэнтральнага батанічнага сада НАН налічвае больш за 250 сартоў, у тым ліку больш за 16 — уласнай селекцыі. Ацаніць дэкаратыўную калекцыю бэзу, навучыцца мастацтву вырошчвання гэтага віду, праконсультавацца ў вядучых спецыялістаў ЦБС можна штодня, акрамя панядзелка.

Кульмінацыяй Тыдня стане культурна-асветніцкае мерапрыемства «Бэзавыя мроі», якое пройдзе 19 мая. Толькі ў гэты дзень куратар калекцыі бэзу, кандыдат біялагічных навук Наталля Македонская правядзе пазнавальныя гутаркі з наведвальнікамі, раскажа, як зрабіць правільны выбар, набываючы саджанцы бэзу для свайго ўчастка. Вопытны спецыяліст-візажыст Вольга Грыбава зацікавіць многіх наведвальніц сваім майстар-класам «Пяшчотны вобраз бэзу, або Як зрабіць макіяж на рамантычны вечар».

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

■ Цікава пачытаць

# Кніжны Сусвет у адным скверы

**Гарадскі кніжны фестываль «Горад і Кнігі» ў Мінску запрашае на літаратурныя прыгоды чацвёрты раз.**

Сёлета арганізатары фестывалю — Навуковая бібліятэка БНТУ, праект «ЗаЧытанне» і ГА «Беларуская бібліятэчная асацыяцыя» прапануюць гасцям каля сотні самых розных мерапрыемстваў на пяці пляцоўках. Усе праграмы так ці інакш звязаны з кнігамі, аднак вызначаны і асноўныя тэмы гэтага года: Мінск, навука, коміксы і фантастыка, казкі аб прафесіях, асаблівыя дзеці. Сярод паважаных удзельнікаў і запрошаных спікераў будуць госці з Расіі, Швецыі і Фінляндыі.

Наведвальнікі фестывалю змогуць спазнаць Мінск навобмацак, паспрачацца пра дзіцячую літаратуру, праверыць, ці моцна фізіка адрозніваецца ад фантастыкі і стварыць унікальную рэч сваімі рукамі. У праграме запланаваны лекцыі, інтэрактыўныя чытанні, гульні, трэнінгі, майстар-класы, выстава hand-made герояў з сучасных кніг «Смяшлівыя цуды». Аматары кніжных сусветаў «Гары Потэра» і «Уладара пярсцёнкаў» змогуць паўдзельнічаць у варкшопе і прайсці выпрабаванне ў «Дуэльным клубе». Для дзяцей і дарослых уваход на мерапрыемствы вольны. Фестываль адбудзецца 18—19 мая ў скверы перад будынкам БНТУ (праспект Незалежнасці, 65). Падрабязную праграму можна паглядзець на сайце http://bookfest.by/ru/programma.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**

# З «пластыкам» за мяжу

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У цэлым самы зручны варыянт — бескантактавы «пластык». У некаторых гарадах ён дазволіць беспраблемна карыстацца грамадскім транспартам, дзе не трэба будзе без неабходнасці ўнікаць у схему куплі талонаў і праязных. Гэта даступна ў гарадах ЗША, Расіі, Украіны, Вялікабрытаніі і іншых краін.

Спецыяліст лічыць, што менавіта чыпавая або бескантактавая картка дапаможа засцерагчы сябе ад махлярства. Бо вы не выпускаеце яе з рук для невялікіх пакупак. Украсці грошы з сучаснай плацежнай карткі значна цяжэй: перашкодзяць адразу некалькі ўзроўняў абароны. Гэта нашмат камфортней і бяспечней, бо наяўныя з кашалька могуць выцягнуць, пры гэтым шанцы вярнуць украдзенае роўныя нулю.

## Ёсць краіны, дзе «кэш» не бяруць

Не ўсе ведаюць пра існаванне шасцізначных пін-кодаў. Гэта ў першую чаргу датычыцца Кітая. У краіне проста велізарны аб'ём эмісіі картак, таму чатырох лічбаў недастаткова па меркаваннях бяспекі. Сустракаюцца тэрміналы і банкаматы з шасцізначным пін-кодам і ў Еўропе, напрыклад у Італіі і Партугаліі. Калі вы апынуліся ў сітуацыі, дзе трэба ўвесці шэсць лічбаў, прасунутыя карыстальнікі рэкамендуюць паспрабаваць перад сваім кодам паставіць два нулі. Але гэта не афіцыйнае рашэнне, а хутчэй лайфхакі.

У Азіі, напрыклад у Кітаі і Японіі, далёка не ўсе банкаматы абслугоўваюць карткі міжнародных плацежных сістэм. «Затое ў Паўднёвай Карэі, Сінгапуры і Тайландзе безнаяўны разлік пракраўся практычна ўсюды, таму абменьваць трэба толькі невялікія сумы на дробныя затраты. У краінах Афрыкі вельмі папулярныя мабільныя плацяжы з дапамогай QR-кода. У большасці краін ЕС і Скандынавіі з дапамогай бескантактавай карткі вы зможаце аплаціць праезд і пакупкі на касе самаабслугоўвання, а вось у маленькіх крамках Швецыі могуць і не прымаць наяўныя», — дзеліцца Ігар Кавалёў.

Пэўныя асаблівасці здзяйснення аплат ёсць практычна ў кожнай краіне, таму перад паездкай лепш пачытаць у інтэрнэце водгукі па канкрэтнай краіне, каб пазбегнуць непрыемных сюрпрызаў. Плюс у некаторых краінах, напрыклад у тым жа Кітаі, карты Visa і MasterCard прымаюць далёка не ўсюды.

## Уся справа ў валюце

Ці можна за мяжой карыстацца сваёй зарплатнай карткай? Многія эксперты адназначна рэкамендуюць мець для замежных паездак асобную картку. Яе можна блакаваць пасля кожнай паездкі і «ўключаць» зноў напярэдадні наступнай. Сваю зарплатную картку можна выкарыстоўваць толькі тады, калі ўпэўнены ў тым месцы, дзе збіраецеся расплачвацца ёю. Акрамя таго, спецыялісты раяць не выпускаць другую картку ў сваім банку або ў банку, у якога такі ж працэсінг — у выпадку тэхнічных збояў вы пазбавіцеся адразу абодвух «кашалькоў».

У якой валюце лепш браць картку? У цэлым плацежныя сістэмы ўстанаўліваюць добрыя курсы абмену валют па картках. Акрамя таго, у Беларусі банкі прытрымліваюцца рэкамендацый Нацыянальнага банка аб тым, каб курсы па картцы былі не горшыя, чым у абменных пунктах. Калі ў вас картка ў беларускіх рублях, то пры стабільнай сітуацыі на валютна-абменным рынку сэнсу турбавацца аб курсах няма.

Калі турыст плануе збіраць грошы на паездку за мяжу, то ў гэтым выпадку лепш рабіць так. Адкрывайце рахунак у еўра для разлікаў у Еўропе, а ў доларах — для разлікаў у ЗША. Калі плануецца паездка ў іншыя краіны, звярніцеся ў свой банк па кансультацыю або паглядзіце ў сваім дагаворы карт-рахунку, па якой схеме адбываецца канвертацыя пры разліках за мяжой.

## Каб не было блакіроўкі

Калі збіраецеся ў паездку, пажадана патэлефанаваць у свой банк і папярэдзіць аб выездзе. Таксама варта загадзя пацікавіцца, што рабіць, калі картка будзе заблакавана не па вашай ініцыятыве.

Алгарытмы блакавання карткі пры выездзе за мяжу або пры нестандартных для вас дзеяннях ва ўсіх банкаў розныя. У некаторых банках пералік запланаваных да наведвання краін можна дадаць у інтэрнэт-кабінеце кліента. Тады, калі купіце піцу ў рэстаране ў Берліне, гэта не падасца банку падазронай актыўнасцю па карце. Самі плацежныя сістэмы дзеляцца з банкамі статыстыкай па махлярскіх аперацыях, і, калі ў нейкай краіне іх узровень перавышае разумныя межы, банк абавязкова пастараецца засцерагчы сваіх кліентаў.

У гэтых выпадках банкі імкнуцца блакаваць не само выкарыстанне карткі ў канкрэтнай краіне, а асобныя аперацыі. У 90 % выпадкаў гэта менавіта зняцце наяўных па магнітнай паласе. Асабліва часта можна сустрэць блакаванне аперацый па рэгіёне Паўднёва-Усходняй Азіі. Там распаўсюджаныя і скімеры-накладкі на картапрыёмніку банкамата, якія счытваюць і перадаюць злачынцам даныя карткі, і проста зняцце наяўных грошай па выкрадзеных у іншай краіне рэквізітах.

> **«У большасці краін ЕС і Скандынавіі з дапамогай бескантактавай карткі вы зможаце аплаціць праезд і пакупкі на касе самаабслугоўвання, а вось у маленькіх крамках Швецыі могуць і не прымаць наяўныя».**

Калі ўжо сітуацыя патрабуе менавіта наяўных грошай, лепш здымаць іх у банкаматах унутры аддзяленняў банкаў. І, вядома, браць з сабой у паездку трохі наяўных на непрадбачаныя выпадкі.

## Канвертацыя па мінімуме

Грошы звычайна блакуюцца да таго моманту, пакуль не пройдзе працэдура зняцця аперацыі паміж прадаўцом, плацежнай сістэмай і банкам.

Калі валюта куплі і валюта карткі аднолькавыя, то вы гэтага нават не заўважыце. А вось калі валюты розныя, напрыклад, вы за мяжой расплачваецеся рублёвай картай, то ў дзень куплі сродкі блакуюцца па бягучым абменным курсе, а спісваюцца канчаткова праз некалькі дзён па актуальным курсе. Тут сума можа змяніцца.

Таму для пакупак за мяжой рэкамендуецца адкрыць валютную картку ў доларах або еўра. Вядома, многія краіны маюць сваю валюту — у такіх выпадках трэба звяртаць увагу прадаўца пры афармленні пакупак на выбар валюты спісання — звычайна ёсць выбар паміж мясцовай валютай, доларам і еўра. Рэкамендуецца расплачвацца валютай краіны, у якой здзяйсняецца купля, — так вы мінімізуеце выдаткі пры канвертацыі.

## Вашу картку не прымаюць

Калі збіраецеся ў любую краіну, нават блізкую, то вам рэкамендуецца зайсці на сайт адпаведнага пасольства і пачытаць інфармацыю аб мясцовых плацежных сістэмах. Праблемы могуць паўстаць на некаторых аддаленых тэрыторыях, у закрытых дзяржавах (напрыклад, у Паўночнай Карэі ці Іране), краінах, якія знаходзяцца ў стане ваеннага канфлікту.

Таксама можна сутыкнуцца з сітуацыяй, калі не прымаюць канкрэтны від карткі, хутчэй за ўсё, гэта будуць Visa Electron ці Maestro. У Кітаі ёсць свая плацежная сістэма Union Pay — пакуль беларускія банкі такія карткі не выпускаюць.

Падыходзячы да крамы або рэстарана, звярніце ўвагу на наклейку з лагатыпамі плацежных сістэм на дзвярах і пераканайцеся, што адзін з іх намаляваны і на вашай картцы. Калі не ўбачылі такую, не саромейцеся ўдакладніць у работніка гандлёвага аб'екта, ці прымаюць яны да аплаты вашу картку. Каб мінімізаваць рызыкі па адмове ў абслугоўванні «пластыку» адной плацежнай сістэмы, можна выпусціць дадатковую картку да рахунку іншай плацежнай сістэмы і атрымаць яшчэ адзін сродак плацяжу.

## Копіі чэкаў — абавязкова

Ці рэальна вярнуць няправільна спісаныя грошы пасля паездкі? Так, можна, і для гэтага трэба звярнуцца ў банк. Як правіла, для вяртання няправільна спісанай сумы неабходна ініцыяваць працэдуру апратэставання плацяжу — таму перад зваротам у банк варта падрыхтаваць копіі чэкаў, якія з'яўляюцца аргументамі абгрунтаванасці апрацыі.

Аднак сама працэдура аспрэчвання плацяжу займае доўгі час (да 90 дзён), таму варта запасціся цярпеннем і быць гатовым да таго, што банк можа запытаць дадатковую інфармацыю. Каб мінімізаваць выпадкі некарэктнага спісання, падключыце SMS-інфармаванне да картак. Так вы зможаце кантраляваць усе аперацыі ў момант іх здзяйснення. Калі нешта пайшло не так, паспрабуйце аператыўна звязацца з банкам для атрымання кансультацыі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Будзь у курсе!

## ЗА БІЛЕТ НА ЦЯГНІК — СМАРТ-КАРТАЙ

**Беларуская чыгунка сумесна з дзяржаўным прадпрыемствам «Мінсктранс» укараніла новы спосаб аплаты праезду ў цягніках гарадскіх ліній з дапамогай смарт-картаў, якія выкарыстоўваюцца для аплаты праезду ў грамадскім транспарце сталіцы, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.**

Для таго каб аплаціць праезд у цягніках гарадскіх ліній, папярэдне на смарт-карту неабходна запісаць тарыф у выглядзе транспартных тарыфных адзінак (ТТА), якія будуць спісвацца ў залежнасці ад адлегласці, якую праедзе пасажыр. Адна ТТА эквівалентная адной капейцы. На смарт-карту можна запісаць тарыфныя планы коштам: 1, 2, 5, 10, 15, 20, 25, 30, 35, 40, 45, 50 рублёў, якімі пасажыр можа скарыстацца ў любы зручны для яго час.

Да нядаўняга часу з выкарыстаннем бескантактных смарт-картаў можна было аплаціць праезд толькі з тэрмінам дзеяння тарыфу на 3, 5, 10, 20 і 30 сутак у цягніках гарадскіх ліній і грамадскім транспарце Мінска — метро, тралейбусах, трамваях, аўтобусах. Набыць адзіны праязны можна на любую камбінацыю названых відаў транспарту або толькі на цягнікі гарадскіх ліній. Папоўніць смарт-карту можна ў любой чыгуначнай касе па маршруце руху цягнікоў гарадскіх ліній.

Для аплаты праезду смарт-картай з ТТА пры ўваходзе ў цягнік гарадскіх ліній неабходна прыкласці яе да валідатара, пры гэтым на табло апошняга выводзіцца паведамленне пра найменне станцыі, да якой праведзена аплата. Пасля прыбыцця цягніка на станцыю прызначэння пры выхадзе з вагона трэба паўторна прыкласці смарт-карту да валідатара. На табло выводзіцца канчатковы баланс карты.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# У ІВАНА — ПАСЯЎНАЯ







*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вёска Снядзін знаходзіцца побач з Прыпяццю і часта, асабліва вясною, аказваецца адрэзанай вадою ад навакольнага свету. Некалі гэтая палеская вёска была шматлюдная, перспектыўная, і, канешне, працавітая. А сёння, на жаль, населены пункт — месца пражывання людзей пераважна пенсійнага ўзросту. Шэсць гадоў ужо, як Іван Рубчэўскі асвоіў «жаночую», як раней лічылася, спецыяльнасць. Акрамя «дзяжурных» абавязкаў — прыбраць у хаце і ў двары, нанасіць дроў і вады, купіць прадукты, лекі і заплаціць за святло, сацработнік падключаецца да пасяўной. У сяўбе Івану часта дапамагае сын Дзмітрый — працавіты і надзейны трактарыст. А яшчэ ў памочніках — матацыкл, на якім сацработнік паспявае да кожнага са сваіх падапечных.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**




## ДЗЕД ЯНУК І МУРЧУНЯ

У суседняй з намі вёсцы, паблізу, жыве, а дакладней сказаць, дажывае свой век дзед Янук. Дзеці яго даўно павырасталі і ўцяклі ў горад, жонка гадоў шэсць таму памерла, пасля чаго досыць спраўная раней дзедава гаспадарка паступова стала скарачацца і нарэшце скарацілася да аднаго ката, што таксама памёр ад старасці. «Значыць, і мне пара», — вырашыў гаспадар.

Развітальны настрой яго яшчэ больш абвастрыўся, калі сёлета напрадвесні ён трапіў у бальніцу.

Пасля яе дзеці хацелі забраць дзеда ў горад, але той рашуча запярэчыў: маўляў, дома і труна гатовая (сам зрабіў пасля раптоўнай смерці жонкі), і на могілкі блізка: можна заехаць на знаёмай падводзе і бясплатна, а не на «бусе» за шалёныя грошы...

Была і яшчэ адна прычына, дзеля якой ён імкнуўся дахаты і пра якую, вядома ж, змаўчаў, каб дзеці не падумалі, што бацька здзяцінеў.

Справа ў тым, што напярэдадні ў яго з'явіўся новы каток, прычым з вельмі пакручастым лёсам. Нарадзіўся ён недзе ў горадзе, і першыя гаспадары, відаць, любілі яго — прывучылі да латка, — але ж потым па нейкай прычыне выгналі...

І ці толькі яны, бо Таня, унучка Януковай суседкі Любы, падабрала кацянятка зусім схуднелым і замурзаным: прынесла дамоў, пакарміла, «пасяліла» ў прыгожай скрыньцы. А вечарам прыйшлі з работы бацькі і ўчынілі грандыёзны скандал: энерваваная маці пагражала нават выкінуць прыблуду, але Таня заплакала так, што гаротніка ў выхадныя бацька павёз у вёску, дзе каты, вядома ж, болей патрэбныя.

Такім чынам кацяня зноў змяніла «прапіску», прычым не ў апошні раз, бо, калі сын паехаў, баба Люба, ведаючы, як сумуе Янук па старым каце, вырашыла зрабіць добрую справу — прынесці яму новага, маладога.

Так і зажылі яны ўдваіх — дзед Янук і Мурчуня (бо стары дужа ж добра засынаў пад муркатанне ката), які рос пакрысе на прывезеных дзецьмі макаронах ды ліверцы. Калі ж нейкая з кілбас была не даспадобы, дзед у аўталаўцы купляў сухі каціны корм, а Мурчуня за гэта прыносіў у хату злоўленую мыш і з удзячнасцю клаў яе да дзедавых ног.

Трэба сказаць, што ногі гэтыя ў дзеда балелі, і варта было старому прылегчы ды выпрастаць іх, як кот укладваўся зверху, і дзед праз якую гадзіну як быццам адчуваў палёгку.

Але ж гэта — калі Мур быў дома, бо на згоне зімы ён усё-ткі знік. «Мусіць, загуляў», — падумаў быў дзед, якога якраз тады ж «схапіў апендыцыт», ён загрымеў у бальніцу — першы раз у жыцці... Цудам выжыў, без апендыкса, з новым словам «перытаніт» вярнуўся ў родную хату, сеў на лаўку і тут жа на калені яму ўскочыў кот: учапіўся кіпцюрамі ў куртку, стаў лізаць няброты дзедаў твар ды біць галавою ў нос...

Радасць ката была вельмі вялікая! Ды і дзед расчуліўся ледзь не да слёз. Пасля гэтага ён калі-ніколі стаў частаваць Мурчуню смятанай, а то і кавалачкам мяса, не прагаяў больш са стала і з лыжка, ад чаго кот пачуваў сябе сапраўдным гаспадаром — гэта найменей.

...На пачатку мая дзедаў сусед Юзік у аўталаўцы ўзяў пляшку гарэлкі, запрасіў Янука адзначыць нараджэнне ўнука.

Выпівалі яны ўдвух, няспешна, з маленькіх кілішкаў — успаміналі даўніну. Потым Янук прыплёўся дадому спаць.

Кот, здалося, награў яму месца?.. Але ж як толькі дзед нахіліўся, каб дастаць з-пад яго коўдру, Мур грозна ашчэрыўся.

— Ты што — з глузду з'ехаў: не хочаш, каб я тут лёг? — не зразумеў гаспадар і зноў пацягнуўся па коўдру.

Кот грозна зашыпеў, кінуўся на дзеда і нават падрапаў яму руку.

— Во, ліха, — падумаў Янук, — п'яных нават кот не любіць.

Прыйшлося пасцаць сабе на канапе ў зале.

Назаўтра раніцай дзед устаў, напіўся халоднай вады, наліў кату малака (таго чамусьці не было, хоць дагэтуль кожны ранак цёрся аб ногі), паставіў на пліту чайнік, адрэзаў лусту... Нават паклікаў...

Мурчуня не ішоў.

Прыйшлося самому прыклыпаць у спальню.

На ягоным ложку, ля сцяны, «кот»... карміў чацвярых кацянят.

**А. Полаз,**
*Вілейскі раён.*

## ТАКОЕ КІНО

Карцінка гэта недзе з васьмідзясятых гадоў мінулага стагоддзя, з тых самых часоў, калі шэфы актыўна дапамагалі вёсцы.

Значыць, група жанчын з нашага райцэнтра, прыбраўшыся ў курткі-плашчы-гумовікі і пабраўшы з сабою нажы, а то і спецыяльныя секачы (невялікія такія сякеркі, каб адсякаць бацвінне), на заказным аўтобусе выехала ў калгас на ўборку буракоў. Праца гэта, вядома ж, не з прыемных, а тут яшчэ і надвор'е... Не, дождж не ліў, ён нават не ішоў, ён — імжэў і тым самым з ранку мачыў зямлю, тыя буракі і — адпаведна — жаночыя рукі, боты, вопратку...

Але ж вось нарэшце працоўны дзень скончаны: стомленыя, змерзлыя жанчыны едуць у горад, дамоў — спяць ды бачаць, як зараз паскідаюць з сябе ўсё мокрае-бруднае, як адзенуцца ў чыстае, хатняе, як будуць адагравацца, але...

Праўду кажучы, не ўсё тое збываецца, на што чалавек спадзяваецца: заказны аўтобус з жанкамі, праехаўшы некалькі вёрстаў, спыніўся. «Аварыя наперадзе», — сказаў кіроўца, ды і самі пасажыркі бачылі, што дарогу ім перакрыў вялізны аўтамабіль MAN з замежнымі нумарамі. Кіроўца, як выглядала, хацеў абмінуць чарговае месца рамонту і нешта там не разлічыў, бо задняя колы фуры занесла ў кювет.

Выбрацца адтуль «сваімі сіламі» ў замежніка не атрымалася.

Не ўдавалася гэта і трактарысту, які ўзяў машыну на буксір: трос яго аж трашчаў ад натугі, пярэднія колы «Беларуса», можна сказаць, адрываліся ад зямлі, але фура заставалася, дзе была.

— Мы тут да вечара будзем стаяць, — прызнала адна з жанчын.

— Трэба дапамагчы, — прапанавала другая.

— Чым? — прастагнаў аўтобус.

— Ды галля насекчы, пад колы накідаць. Мы з мужам заўжды так робім, калі «сядзем» на сваім «жыгулі»... Айда, дзяўчаты!

Двойчы іх заклікаць, дзякуй богу, не прыйшлося: пабраўшы свае секачы-нажы, яны смела выйшлі з аўтобуса — рушылі ў бок кіроўцы.

Замежнік, убачыўшы з дзясятак перапэцканых і «ўзброеных» нажамі жанчын, спалатнеў ад страху (паліччыў, мусіць, што фуру ідуць рабаваць... А можа, і яго прыкончаць)...

— Не! Калі ласка, не! Толькі не гэта! — стаў прасіцца ён па-англійску.

На шчасце, сярод «уборшчыц» буракоў знайшлася адна, якая добра ведала гэтую мову. Яна і растлумачыла кіроўцу (той з Галандыі быў), што — канкрэтна — яны збіраюцца рабіць... А потым — яшчэ і паказала: гэта значыць, разам з сяброўкамі стала ссякаць ды падносіць жэрдкі, галлё, якое трактарыст падкладваў пад колы фуры.

Прапанаўвалі жанкі і, што называецца, плечы падставіць — падштурхнуць тую фуру, але кіроўца зноў залапатаў сваё «No! No!.. Cinema... Cinema».

— І сапраўды — кіно, хоць і без немцаў, — зарагаталі жанкі. — Паперліся, бач, на беднага хлопца — гуртам, з нажамі...

— Дык мы ж хацелі як лепей.

— Так, хацелі... А чалавек — ледзь ад страху не памёр.

...З трэцяй ці чацвёртай спробы той замежны аўтамабіль ускараскаўся на дарогу. Кіроўца павёў яго ў адзін бок, жанчыны ў аўтобусе паехалі ў другі. Ні стомы, ні дрэннага настрою ў «экіпажах» як не было.

**Аляксандр Матошка,**
*в. Янкавічы, Расонскі раён.*

## ГАСЦІНЕЦ ДЛЯ ЎНУКА

...Баба Тома зранку поркалася ў гародзе, калі туды ж завітаў яе ўнучак Санёк. Жыў ён зусім непадалёк, у сваёй вясковай бабулі, а да вось гэтай, гарадской (сядзіба ёй ад свекрыві дасталася), прыходзіў хіба пагасціць.

— Ну вось і ў цябе пустазелля нарасло, — з сумам заўважыў тады, — ты таксама праполкай занятая. А я хацеў у шашкі згуляць...

«Значыць, няма з кім дзіцяці, калі да мяне прыйшло», — зашкадавала мальца бабуля, разгінаючы спіну. І ўжо ўголас дадала:

— Ну дык пойдзем, згуляем, я якраз адпачыць збіралася...

І ў гэты час, па праўдзе кажучы, нешта сабраць сабе на абед, хуценька з'есці ды зноў у грады, але...

Што ты будзеш рабіць: села з Сашкам гуляць у шашкі, «размовы размаўляць».

— Ты любіш сасіскі? — спытаў у бабулі ўнук і, не чакаючы адказу, прызнаўся: — А я дык вельмі... Еў бы і еў іх! Хоць кожную хвіліну.

— Я адвару табе, — падахвоцілася бабуля.

— А навошта? — не зразумеў хлапчук. — Мне і так смачна будзе.

Гаспадыня крутнулася да халадзільніка, прынесла сасіску: для пачатку — адну (хлопчык з'еў), потым яшчэ адну, але, перастаўляючы шашкі, тэму не змяніў: па-ранейшаму гаварыў пра сасіскі. Баба Тома прынесла яму яшчэ дзве, а затым сканцэнтравалася на гульні: выгляд зрабіла, што размоў не чуе.

Не, сканчай яна не была. Але ж на гэты раз прыехала ў вёску на чатыры дні і, каб не траціць час на гатаванне абедаў, узяла з сабой тых самых сасісак. Разлічвала, што сёння, у першы дзень, дзве штукі адварыць з бульбай, у другі — падсмажыць з яйкамі, на трэці — згатуе супчык...

Паловы сасісак ужо не было, крамы ў вёсцы таксама...

З гадзіну прагуляўшы з унукам у шашкі, баба Тома паднялася з канапы, прыўстаў і Санька, пры гэтым з кішэні ў яго на падлогу выпала сасіска.

— Гэта я з сабой, — прызнаўся хлопчык і стаў расказваць, як яны з сябрам любяць пікнікі: набіраюць хлеба, вараных яек, сасісак і потым ядуць — на прыродзе, па-даросламу...

«А яно ж і праўда, падрос мой унук, — прызнала бабуля, — а я ўсё цукеркі, усё прысмакі яму... Як малому... Наступны раз трэба шмат сасісак купіць. І ўнук будзе рады, і мне пасціць не прыйдзецца.

**Таццяна Чэкед,**
*г. Гомель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

■ Неасабісты суб'ектыў



# АД ПРЫВАТНАГА ДА АГУЛЬНАГА

**Працаваць на сябе — значыць працаваць добра. А калі не на сябе?**

2. в течение двух месяцев, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Гомельский межгородской филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него (г. Гомель, ул. Войкова, 87);

3. выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Участникам аукциона предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с членами комиссии (по предварительному согласованию).

Справки по адресу: Гомельский район, деревня Зябровка, ул. Комсомольская, 30, тел.: 94-95-45, 94-96-00.

# АД УШАЧ — ДА ІНДЫІ І НЕПАЛА

**Дзённікавай памяццю паэта можна смела назваць чарговую кнігу запісаў, рабочых нататак Рыгора Барадуліна, выдадзеную «Кнігазборам».**




Ахоплівае чацвёрты па ліку том сведчанні памяці з 1983—1988 гадоў. Якім жа быў гэты перыяд у жыцці майстра слова, нястомнага вандроўніка па Беларусі і свеце? Рыгор Іванавіч пабываў у ЗША як удзельнік чарговай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у складзе дэлегацыі БССР, у Францыі разам з рускімі паэтамі і перакладчыкамі, Польшчы, Балгарыі, Непале і Індыі. Па традыцыі шмат папаездзіў па розных мясцінах Савецкага Саюза. Геаграфія яго зацікаўленняў была звязана з Мурманскам, Масквой, Талінам, Псковам, Таджыкістанам. І беларускія куточкі былі ў полі зроку паэта — ён наведаў Бярэзінскі запаведнік, Баранавічы, Гомель, Полацк, Гродна, Віцебск, Барысаў, Магілёў, Бялынічы, Кублічы, Пуцілкавічы, Ушачы... А колькі сустрэч — з П. Панчанкам, А. Вялюгіным, Героем Савецкага Саюза У. Е. Лабанком... І праз запісы гаворак, уражанняў перад чытачом паўстае яркая, шматгранная асоба нераўнадушнага да жыцця чалавека, творцы, які не проста збіраў уражанні, а спрабаваў разабрацца ў самых галоўных сутнасных праявах чалавечага жыцця.

З цікавасцю, учытваючыся часам у зусім лаканічныя запісы, адкрываеш творчыя задумы пісьменніка. У прадмове «Ад укладальніка» Наталля Давыдзенка (яна сабрала і збірае ўсе тамы запісаў) звяртае ўвагу і на такі праект Рыгора Барадуліна: «...А яшчэ — запісаны шчодра насычаны план задуманай (у кастрычніку 1983 года) разам з М. Стральцовым, але, на жаль, не спраўджанай «Кнігі дружбы», які хочацца прывесці цалкам: «...проза, вершы, экспромт, Прыбалтыка, Азія, Усход, партрэт сяброў, характар культуры, застолле, вяселле, дарога, прывал, самалёт, на валах, начлег, пра пераклады, эпіграмы, партрэты людзей, сяброў, рэчаў (студня, клець, дрэва ля кляштара), нешта з песняў праз рэаліі, Германаў, Кулешоў, Броўка, пра шапку ці пра аборы». І дадаць: дзённікі і запісы паэта ці не працягваюць ствараць год за годам менавіта падобную кнігу?..»

Выданне тамоў памяці Рыгора Барадуліна з агульнай назвай «Дзённікі і запісы» прадаўжаецца. Сачыце за планамі выдавецтва «Кнігазбор» і зазірайце ў кнігарні — не сумнявайцеся, вас чакае чытанне, напоўненае шмат якімі цікавосткамі.

**Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.03 | 21.11 | 16.08 |
| Віцебск — | 4.46 | 21.07 | 16.21 |
| Магілёў — | 4.52 | 21.01 | 16.09 |
| Гомель — | 4.56 | 20.50 | 15.54 |
| Гродна — | 5.19 | 21.25 | 16.06 |
| Брэст — | 5.27 | 21.18 | 15.51 |

## Месяц

*Маладзік 15 мая. Месяц у сузор'і Рака.*

## Імяніны

**Пр.** *Ірыны, Абрама, Якава.*
**К.** *Аляксандры, Наталлі, Эрыка, Яны.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА






## Фотаслова

Яўгена ПЯСЕЦКАГА

Там ветрык кудлаціць альшыну,
У зацені шэпт ручая,
Матуля з букетам язміну...
Ты ўсюды са мной ва ўспамінах,
Маленькая вёска мая.

На картах шукаць цябе марна,
Экспрэсы туды не вязуць.
Той край у былое схаваны —
Ні ветрыку, ні ўрагану
Маленства майго не вярнуць.

Далёкай вясне не забыцца —
Пялёсткі, як снег на траве...
Да скону мне плёс будзе сніцца —
Адтуль, нібы з чыстай крыніцы,
Жыцця майго рэчка плыве.

## УСМІХНЕМСЯ

**— ЗАГС, слухаю.**
**— Добры вечар, дзяўчына. Я хачу вярнуць жонку.**
**— Яна ад вас сышла?**
**— Не. Мне здаецца, яна зламалася.**
**— Тады вам трэба звярнуцца ў траўматалогію.**
**— Не, вы мяне не зразумелі. Яна спачатку працавала. А потым перастала працаваць.**

## Даты | Падзеі | Людзі

**18 МАЯ**

### У краіне

**1913** год — нарадзіўся Кісялёў Рыгор Якаўлевіч (в. Мікалаеўка, цяпер у Буда-Кашалёўскім раёне), дзяржаўны дзеяч Беларусі, кандыдат гістарычных навук, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У 1942—1953 гадах быў на партыйнай рабоце. З 1953 года — міністр культуры, з 1964-га — міністр асветы Беларусі, у 1968—1970 гадах — намеснік старшыні Савета Міністраў БССР. Памёр у 1970 годзе.

**1938** год — 80 гадоў таму нарадзіўся Міхаіл Антонавіч Казінец (в. Цынцэвічы, цяпер у Вілейскім раёне), дырыжор, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў, народны артыст Беларусі. З 1972 года — дырыжор, з 1975-га — мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча. Першы інтэрпрэтатар многіх твораў беларускай музыкі, у тым ліку Канцэрта для фартэпіяна і народнага аркестра Г. Вагнера, «Святочнай паэмы» і «Юбілейнай уверцюры» Я. Глебава, сімфоніі «Памяць Зямлі» і іншых. У 1985—2005 гадах быў рэктарам Беларускай акадэміі музыкі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі «За духоўнае адраджэнне», узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны.



**1968** год — 50 гадоў таму нарадзіўся Сяргей Анатолевіч Мартынаў, беларускі спартсмен (стральба кулявая, вінтоўка), заслужаны майстар спорту Беларусі. Чэмпіён Алімпійскіх гульняў (2012), бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў (2000, 2004) у асабістым заліку, чэмпіён свету ў камандным заліку (1990, 1994 — двухразовы). Уладальнік Кубка свету (1989, 2000). Рэкардсмен свету (1998, 2000).

**1998** год — у Мінску адкрыты Музей сучаснага выяўленчага мастацтва. У калекцыі каля 2,5 тысячы экспанатаў — твораў сучасных беларускіх аўтараў. Прадстаўлены класічны жывапіс, графіка, скульптура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, фота і плакаты. Асноўныя напрамкі дзейнасці: вывучэнне сучаснага беларускага выяўленчага мастацтва, правядзенне канферэнцый і сімпозіумаў, пленэраў, міжнародных выставачных праектаў. Музей спрыяе пашырэнню і развіццю культурнай прасторы, з'яўляецца выставачным і інфармацыйным цэнтрам, адлюстроўвае новыя пошукі ў сучасным беларускім мастацтве.

### У свеце

*Міжнародны дзень музеяў. Праводзіцца па рашэнні 11-й Генеральнай канферэнцыі Міжнароднага савета музеяў, якая адбылася ў маі 1977 года. Упершыню адзначаўся ў 1978 годзе.*

**1048** год — нарадзіўся Амар Хаям (1048—1131), персідскі і таджыкскі паэт, матэматык, філосаф. Яго рубаі (чатырохрадкоўі) карыстаюцца сусветнай папулярнасцю.

**1923** год — французскі інжынер Антуан Барнай атрымаў патэнт на тэлефон з дыскавым наборам нумара.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1850.
Нумар падпісаны ў 19.30 17 мая 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

18 мая 2018 г. № 20 (453)




стар. 4,13

Чый двор лепшы?



стар. 15

Трымайся... за зямлю



стар. 16

Прыгажосць патрабуе ахвяр?

ТЭМА ТЫДНЯ

# НЕ МАЁ, А НАША

## Як жыве першы ў краіне камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — баранавіцкая «Надзея»

**ЦЯПЕРАШНІ кіраўнік «Надзеі», настаўніца гімназіі № 1 Кацярына КУХАРЧЫК кажа, што гэта і ёсць прыклад нефармальнага аб'яднання грамадзян мікрараёна для ажыццяўлення самакіравання. Агульная справа не толькі яднае людзей — яна здольная мяняць светапогляд, стаўленне да сябе, суседзяў, да агульнай маёмасці. Як вынік, у гэтым раёне горада фіксуецца значна меншы ўзровень злачыннасці. Тут не ўскрываюць, не ламаюць машыны, не псуюць лаўкі і дзіцячыя пляцоўкі. Тое, што зроблена агульнымі намаганнямі, зберагаецца таксама грамадой. І гэта далёка не ўсе плюсы «Надзеі».**



### Пачатак

Варта нагадаць, што добрая справа ва ўсходнім мікрараёне Баранавіч, дакладней, на вуліцы Паркавай, пачалася ў 2003-м. Так што сёлета камітэт можа адзначаць 15-годдзе. Гэта да слова. Тагачасны дэпутат гарадскога Савета Анатоль Банкевіч прапанаваў аб'яднаць намаганні жыльцоў 15 кааператыўных дамоў па вуліцы Паркавай па добраўпарадкаванні і падтрыманні парадку на прыдамавых тэрыторыях.

Гаворка ішла пра тры тысячы жыхароў. Былі праведзены сходы грамадзян, людзям падрабязна і цярпліва тлумачылі перавагі такога аб'яднання, пераконвалі ў неабходнасці ўдзелу кожнага ў добрай справе. Ініцыятыву падтрымалі ЖЭС № 5 і гарадскі Савет дэпутатаў, пры іх арганізацыйным удзеле быў створаны камітэт «Надзея». Пачаліся суботнікі, людзі адарваліся ад канап, выйшлі з дамоў і многае зрабілі сваімі рукамі. Калі ж агульная справа атрымала арганізацыйнае ўвасабленне, з'явілася магчымасць атрымаць і гранты, у тым ліку замежныя, па лініі фінансавання Сусветнага банка. За еўрапейскія грошы, а таксама за сродкі, выдзеленыя з гарадскога бюджэту, сабраныя грамадзянамі, карэнным чынам палепшылі асвятленне двароў, пабудавалі і абсталявалі дзіцячыя пляцоўкі, многае зрабілі па добраўпарадкаванні. Быў адкрыты рахунак у банку, на якім акумуляваліся ўсе сродкі з самых розных крыніц і з якога аплачвалі работы.

Такім чынам былі ўстаноўлены вулічныя ліхтары, выкананы работы па добраўпарадкаванні 18 дваровых тэрыторый. Апошняе мае на ўвазе ўзвядзенне дзіцячых і спартыўных пляцовак, альтанак. Таксама былі зроблены пляцоўкі для збору бытавых адходаў, адрамантаваны лаўкі для адпачынку, фасады дамоў і дахі.

стар. 4

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

# ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ

**ЗВЯРТАЮЧЫСЯ нядаўна да парламента і беларускага народа, Прэзідэнт даручыў вывучыць магчымасць павышэння ролі мясцовых Саветаў дэпутатаў у вырашэнні пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў. Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу актыўна ўключыўся ў гэтую работу. Пра тое, якія крокі ўжо зроблены ў названым кірунку, «МС» папрасіла расказаць старшыню Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА.**



### У АСНОВЕ — КЛОПАТ ПРА ЛЮДЗЕЙ

— У першую чаргу хацеў бы адзначыць стратэгічную накіраванасць паслання кіраўніка дзяржавы. Па сутнасці, гэта праграмны дакумент на перспектыву, у якім дакладна пазначаны шляхі далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка вызначыў галоўны кірунак — павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва. З гэтай мэтай неабходна забяспечыць апераджальны ў параўнанні з сусветным эканамічны рост нашай краіны. Трэба будзе да канца наступнай пяцігодкі дасягнуць узроўню ВУП не менш за 100 мільярдаў долараў. Задача няпростая, для яе вырашэння неабходна максімальна задзейнічаць усе інтэлектуальныя і эканамічныя рэсурсы рэспублікі, у тым ліку і патэнцыял мясцовых Саветаў.

Кіраўнік дзяржавы неаднаразова падкрэсліваў, што ў аснове дзейнасці ўсіх органаў улады павінен быць клопат пра людзей. У гэтым сутнасць рэгіянальнай палітыкі, якая праводзіцца кіраўніцтвам нашай краіны.

Прэзідыум Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі зацвердзіў план дзеянняў па выкананні даручэнняў Прэзідэнта ў 2018 годзе. У адпаведнасці з ім створана маніторынгавая група для атрымання аб'ектыўнай і ўсебаковай інфармацыі пра ход вырашэння праблемных пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў і выпрацоўкі прапаноў па іх вырашэнні. У тым ліку ўсебакова вывучаецца пытанне пра павышэнне ролі мясцовых Саветаў дэпутатаў у жыцці грамадства.

Сёлета ў лютым адбылася значная агульнадзяржаўная палітычная падзея — выбары ў мясцовыя Саветы. Дэпутатамі абрана больш за 18 тысяч чалавек. Гэта сур'ёзны рэсурс, які павінен быць выкарыстаны для вырашэння актуальных пытанняў развіцця рэгіёнаў і краіны ў цэлым. Для ўдасканалення падыходаў да сумеснай работы дэпутацкага корпуса і выканаўчай улады пачынаючы з красавіка тры пасяджэнні запар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі плануем прысвяціць павышэнню ролі органаў мясцовага самакіравання ў вырашэнні пытанняў устойлівага развіцця рэгіёнаў. На аснове вывучэння вопыту работы мясцовых Саветаў дэпутатаў, аналізу існуючых праблем і магчымасцяў іх вырашэння плануем выпрацаваць прапановы па ўдасканаленні дзейнасці мясцовых органаў улады ў павышэнні эканамічнага патэнцыялу рэгіёнаў, стварэнні спрыяльных умоў для развіцця прадпрымальніцкага асяроддзя, забеспячэнні занятасці насельніцтва.

### ПАВЫСІЦЬ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ, ЗНІЗІЦЬ ДАТАЦЫЙНАСЦЬ

***— На пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, якое ўжо адбылося ў Слаўгарадзе, абмяркоўваліся праблемы раёнаў, пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы. Якія рашэнні прынятыя па выніках абмеркавання ўсіх набалелых праблем гэтага рэгіёна?***

— Выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання прайшло ў Слаўгарадзе 26 красавіка, у дзень 32-й гадавіны катастрофы на Чарнобыльскай станцыі.

стар. 3

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## У глабальным кантэксце

*У Мінску прайшоў круглы стол, прысвечаны Мэтам устойлівага развіцця*

**Іх усяго 17, і ўжо некалькі гадоў яны — галоўныя арыенціры для ўсяго чалавецтва на шляху да агульнага дабрабыту. Мэты ўстойлівага развіцця ўключаюць ліквідацыю беднасці, голаду, развіццё гендарнай раўнавагі, якаснай адукацыі і іншых даброт аў, дасягнуць якіх магчыма толькі супольна.**

Тэма круглага стала — «Партнёрства пры фарміраванні і прымяненні індыкатараў дасягнення Мэт устойлівага развіцця». **Намеснік пастаяннага прадстаўніка ПРААН у Беларусі Закары ТЭЙЛАР** адзначыў, што дасягненне раўнамернага прагрэсу ў рэалізацыі Мэт у краіне стала магчымым у тым ліку дзякуючы сістэме паказчыкаў (індыкатараў). «Калі нешта немагчыма вымераць, то немагчыма гэтым кіраваць і паляпшаць. Таму стварэнне ў Рэспубліцы Беларусь платформаў і сістэм адсочвання праз паказчыкі з'яўляецца адным з ключавых фактараў поспеху, якога дасягнулі», — кажа Закары Тэйлар.

На міжнароднай арэне Беларусь адзначаюць як аднаго з лідараў у рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця. Але асабліва важна, каб гэты працэс адбываўся ўнутры краіны. Сёння ў яго ўключаны і органы ўлады, і грамадскія колы. «Мы асаблівае значэнне надаём рабоце нашай партнёрскай групы. Яна адкрытая, туды ўваходзяць прадстаўнікі грамадскасці, дзелавых колаў, бізнесу — тыя, хто зацікаўлены ў рабоце па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Для таго каб гэтая работа ішла мэтанакіравана, у партнёрскай групе вызначылі лідараў, якія будуць узначальваць групы эканомікі, экалогіі, сацыяльнай работы і палітыкі. Яны павінны разумець, што адбываецца і якія паказчыкі (індыкатары) неабходна выкарыстоўваць», — сказала **Мар'яна ШЧОТКІНА, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу.**

Асаблівая роля ў намечанай рабоце належыць заканадаўчай уладзе. «Парламент тут грае вялікую ролю, таму што ўся прававая база і перадусім заканадаўства павінны абавязкова стварацца з тым, каб адсочваць прагрэс па Мэтах устойлівага развіцця. Мы, дарэчы, ужо ўзнімалі пытанне, і яно было падтрымана, што любы законапраект, які ўносіцца ў парламент, павінен мець радок або раздзел, які гаворыць аб Мэтах устойлівага развіцця», — адзначыла Мар'яна Шчоткіна.

## Завіталі заходнія суседзі

*У Савеце Рэспублікі прынялі прадстаўніка сената Польшчы*



**У верхняй палаце беларускага парламента адбылася сустрэча старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірыны СТАРАВОЙТАВАЙ з намеснікам старшыні камісіі сената Рэспублікі Польшча па пытаннях эміграцыі і сувязях з палякамі за мяжой Мацеем ЛУЧАКАМ. У сустрэчы таксама прыняла ўдзел член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Кацярына ДУЛАВА.**

Бакі адзначылі пазітыўныя тэндэнцыі ў развіцці беларуска-польскага міжпарламенцкага дыялогу, а таксама абмеркавалі пытанні далейшага ўдасканалення ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Польшча ў навуковай, адукацыйнай, культурнай і іншых сферах.

## Прапановы ад сенатараў

*Як будуць выконвацца даручэнні Прэзідэнта?*

**Прэзідыум Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі зацвердзіў план дзеянняў па выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы ў 2018 годзе.**

План накіраваны на рэалізацыю даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, дадзеных падчас справаздачы ўрада, Нацыянальнага банка, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама 2 сакавіка гэтага года, звароту са штогадовым Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 24 красавіка, а таксама нарады па рашэнні актуальных пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі 3 мая.

Асаблівая ўвага ў дакуменце ўдзелена пытанням фарміравання нарматыўнай базы для пабудовы эканомікі, якая забяспечвае дасягненне да канца 2025 года аб'ёма ўнутранага валавога прадукту на ўзроўні $100 мільярдаў. З гэтай мэтай будуць падрыхтаваны прапановы для ўключэння ў праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады аднача сова з прапановамі па прававым забеспячэнні іх рэалізацыі.

**Марыя ДАДАЛКА, Вераніка ПУСТАВІТ.**

# ЧАЛАВЕК З ЯГО ІНТАРЭСАМІ — У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

### У Гродне прайшоў маштабны форум, на якім абмеркавалі актуальныя пытанні мясцовага самакіравання

**ТЭМАЙ для шырокага абмеркавання на семінары стала павышэнне эфектыўнасці дзейнасці дэпутатаў мясцовых Саветаў як найважнейшага фактару развіцця рэгіёна. Яго кіраўнікі шукалі адказы на пытанні, якія метады больш прыдатныя сёння ў рабоце з насельніцтвам, якія найлепшыя формы зваротнай сувязі існуюць на практыцы і як народным абраннікам будаваць работу ў сваёй акрузе.**

На абласным семінары прысутнічалі дэпутаты ўсіх узроўняў, намеснікі старшынь гар- і райвыканкамаў, ідэалагічны актыў Гродзеншчыны. У рабоце форуму прынялі ўдзел намеснік Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Жаўняк, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Сяргей Раўнейка, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Ала Сопікава.

Адкрываючы пасяджэнне, **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК** падкрэсліў, што мясцовыя Саветы пасля выбараў, якія прайшлі сёлета, значна змянілі свой склад: у рэгіёне дэпутацкі корпус абнавіўся амаль на 43 %. Так, з 2389 народных абраннікаў упершыню атрымалі такі статус 1022 дэпутаты. Па кірунках дзейнасці без малога 27 % — прадстаўнікі сфер адукацыі, культуры, навукі, медыцыны, амаль столькі ж — сельскай гаспадаркі. Дарэчы, у 28-м скліканні 10 % дэпутацкага корпусу прадстаўляюць інтарэсы малога і сярэдняга бізнесу, займаюцца прадпрымальніцтвам.

— Сярод дэпутатаў дастаткова вядомых, таленавітых, паважаных кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў. Іх найбагацейшы прафесійны і жыццёвы вопыт складае вялікі патэнцыял мясцовых Саветаў, — падкрэсліў Ігар Жук. — І гэты патэнцыял павінен быць максімальна задзейнічаны пры вырашэнні праблемных пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва і для выканання прыярытэтных задач, вызначаных V Усебеларускім народным сходам і пастаўленых Прэзідэнтам краіны Аляксандрам Лукашэнкам у штогадовым Пасланні да беларускага народа.

**ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ**

На Гродзеншчыне абрана 2389 дэпутатаў мясцовых Саветаў усіх узроўняў. Сфарміраваны органы мясцовага самакіравання — абласны Савет (60 дэпутатаў), 18 Саветаў базавага ўзроўню (527) і 157 першаснага ўзроўню (1802). Сярод дэпутатаў мясцовых Саветаў 28-га склікання 65 чалавек (ці 2,7 %) ва ўзросце да 30 гадоў.

Працягваючы тэму, **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ЖАЎНЯК** падкрэсліў, што ў адным з выступленняў кіраўнік краіны канкрэтна вызначыў прыярытэты ў дзейнасці дэпутатаў мясцовых Саветаў: дапамагчы канкрэтнаму чалавеку, прыняць зацікаўлены ўдзел у яго жыцці, падтрымаць. У гэтым — прызначэнне дэпутата. Тое ж самае датычыцца і ідэалагічных работнікаў.

— Залог поспеху залежыць ад жыццёвага досведу і аўтарытэту. Важна, каб людзі ведалі вас у твар, сустракаліся з вамі і выказвалі тое, што іх хвалюе, — скіраваў увагу ўдзельнікаў семінара Уладзімір Жаўняк.

**Дырэктар Інстытута сацыялогіі Рэспублікі Беларусь, прафесар Ігар КАТЛЯРОЎ** упэўнены, што мясцовае самакіраванне — адна з асноў у развіцці беларускай дзяржавы.

Па выніках даследаванняў існуючага складу народных абраннікаў можна казаць, што яны маюць усе падставы для эфектыўнай працы. Больш за тое, Гродзеншчына знаходзіцца на першым месцы сярод рэгіёнаў па такім асноўным паказчыку, як пазнавальнасць.



— Трэба часцей праводзіць сустрэчы з насельніцтвам, ісці туды, дзе чакаюць: тэлевізар ці камп'ютар не ў стане замяніць жывую гаворку з дэпутатам. Там, на месцах, маюць патрэбу ў сумленнай размове, — падкрэсліў Ігар Катляроў.

Таксама ён расказаў і аб фактарах, якія перашкаджаюць эфектыўнай рабоце дэпутата: напрыклад, нізкім уліку грамадскай думкі пры прыняцці рашэнняў, і параіў сістэматычна вывучаць меркаванне людзей па актуальных пытаннях, а таксама задзейнічаць у рабоце Саветаў прадстаўнікоў розных груп насельніцтва.

На думку **начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама Аляксандра ВЯРСОЦКАГА,** вылучэнне найлепшых таксама скіравана на стымуляванне актыўнасці дэпутатаў. Для гэтага на Гродзеншчыне распрацавалі крытэрыі эфектыўнасці дзейнасці народных абраннікаў. У ліку іх такія паказчыкі, як колькасць праведзеных сустрэч з насельніцтвам, колькасць зваротаў і прынятых па іх рашэнняў і гэтак далей.

Ідэю растлумачыў Ігар Жук, які падкрэсліў, што ў сваёй штодзённай дзейнасці дэпутатамі шмат чаго робіцца, але з цягам часу нідзе не адлюстроўваецца. Новы падыход дазволіць падсумаваць вынікі працы дэпутатаў мясцовых Саветаў і адзначыць найлепшых.

Між іншым, трэба больш інфармаваць аб сваёй дзейнасці, карыстаючыся і сучаснымі тэхналогіямі, бо, як паказваюць даследаванні, 85 % беларускіх карыстальнікаў інтэрнэту маюць стасункі праз сацыяльныя платформы. Інтэрнэт-прастора сёння дазваляе трымаць справаздачу перад сваімі выбаршчыкамі амаль што ў рэжыме анлайн.

На думку **памочніка Прэзідэнта Беларусі — інспектара па Гродзенскай вобласці Сяргея РАЎНЕЙКІ,** адзін з асноўных крытэрыяў эфектыўнай дзейнасці народнага абранніка — наколькі ён цытуемы. І ў гэтым на дапамогу прыходзяць сучасныя сродкі сувязі і камунікацыі.

— Мясцовыя Саветы не маюць уласных сайтаў, дэпутаты практычна не выкарыстоўваюць сацыяльныя сеткі для камунікацыі з выбаршчыкамі, — дадаў старшыня абласнога Савета Ігар Жук. — У той жа час інтэрнэт-суполкі валодаюць мабільнасцю, актыўнасцю, публічнасцю. Таму нам, дэпутатам, трэба актыўна ўзаемадзейнічаць, супрацоўнічаць з актывістамі сацыяльных груп, пляцовак. Трэба выкарыстоўваць іх рэсурсы для маніторынгу праблемных пытанняў у сваёй акрузе, інфармавання выбаршчыкаў, сумеснага вырашэння пытанняў, падтрымання грамадскіх канструктыўных ініцыятыў.

Словам, як падкрэсліў выступоўца, работа па прынцыпе «як раней» сёння ўжо нікому не патрэбная.

Дарэчы, аб тым, як трэба «цяпер», многія даведаліся дзякуючы выступленню **дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Алы СОПІКАВАЙ.** Народная абранніца шмат увагі ўдзяляе інфармаванню выбаршчыкаў аб выніках сваёй працы, таму стварыла персанальны сайт. Яна самастойна яго абнаўляе і займаецца адміністраваннем, там можна знайсці гадавыя справаздачы, аб'явы, віншаванні, фотарэпартажы з сумесных праектаў з дэпутатамі мясцовага ўзроўню, правядзення сацыяльна значных акцый і гэтак далей.

Падводзячы вынікі семінара, Уладзімір Жаўняк адзначыў, што на Гродзеншчыне добра наладжана работа са зваротамі грамадзян: «Пытанні вырашаюцца, людзей чуюць, не ўсіх, але чуюць...»

— Сродкі камунікацыі, якія сёння існуюць паміж людзьмі і ўладай, разнастайныя. Калі правільна іх выкарыстоўваць, калі грамадзяне будуць ведаць, як разглядаюцца іх пытанні, якія рашэнні прымае мясцовая ўлада, — гэта будзе сведчыць аб тым, што наша ўлада працуе эфектыўна. Дэпутат мясцовага Савета павінен разумець, што ён бліжэй за іншых прадстаўнікоў улады да чалавека. Ён павінен адчуваць тую ці іншую праблему і імкнуцца яе вырашыць да таго моманту, як яна закране чыйсьці лёс, — падкрэсліў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1–й стар. «МС».)***

Гэты раён адзін з найбольш пацярпелых ад радыеактыўнага забруджвання. Праблемы людзей, якія пражываюць на гэтай тэрыторыі, характэрныя для большасці раёнаў Гомельскай і Магілёўскай абласцей, пашкоджаных радыяцыяй. Таму тут патрабуецца больш актыўна праводзіць мерапрыемствы, накіраваныя на атрыманне чыстай прадукцыі і прадуктаў харчавання, паляпшэнне санітарнага стану населеных пунктаў, якія рэабілітуюцца, і пахаванне непрыгодных для далейшага выкарыстання аб'ектаў у зоне адсялення.

Неабходна прадоўжыць работы па мадэрнізацыі ўстаноў аховы здароўя, адукацыі, культуры, бытавога і камунальнага абслугоўвання. Удзяліць увагу аздараўленню дзяцей. Усе гэтыя мерапрыемствы патрабуюць адпаведнага фінансавання.

На жаль, па выніках I квартала гэтага года бюджэты Гомельскай і Магілёўскай абласцей выкананыя з дэфіцытам, узровень даходаў не дазваляе вырашыць усе назапашаныя праблемы, нават з улікам прадугледжаных заканадаўствам ільгот для пацярпелых тэрыторый. Таму мясцовым органам улады неабходна шукаць магчымасці зніжэння датацыйнасці раённых і абласных бюджэтаў шляхам павышэння эфектыўнасці эканомікі — стварэння новых працоўных месцаў і прадпрыемстваў, росту прадукцыйнасці працы, павелічэння прыбытковасці фінансава-гаспадарчай дзейнасці, рацыянальнага выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці. У гэтай рабоце павінен быць актыўна задзейнічаны ўвесь патэнцыял выканаўчых і прадстаўнічых органаў улады.

Саветам дэпутатаў і выканаўчым камітэтам усіх тэрытарыяльных узроўняў рэкамендавана забяспечыць правядзенне эфектыўнай палітыкі садзейнічання занятасці сельскага насельніцтва на аснове рэалізацыі плана індустрыялізацыі Рэспублікі Беларусь, у тым ліку 1740 інвестыцыйных праектаў, якія змяшчаюцца ў ім. Мясцовым Саветам рэкамендавана на сесіях, пасяджэннях прэзідыумаў Саветаў дэпутатаў рэгулярна разглядаць ход рэалізацыі праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця свайго раёна. У мэтах аказання практычнай дапамогі ўвесці ў практыку замацаванне за праблемнымі прадпрыемствамі дэпутатаў мясцовых Саветаў. Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь рэкамендавана арганізаваць вучобу для новаабраных старшыняў і найбольш актыўных дэпутатаў мясцовых Саветаў. Адпаведныя рэкамендацыі дадзены дэпартаменту па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і Міністэрству па надзвычайных сітуацыях.

Падагульняючы сказанае, хачу адзначыць, што сёння, як ніколі, на мясцовыя органы улады ўскладаецца нялёгкі груз адказнасці за ўстойлівае развіццё рэгіёнаў, эфектыўную работу прадпрыемстваў, інавацыйнае развіццё эканомікі, стварэнне новых працоўных месцаў, забеспячэнне занятасці, павышэнне даходаў насельніцтва. Менавіта таму даны кірунак дзяржаўнай палітыкі знаходзіцца пад пільнай увагай як кіраўніка нашай дзяржавы, так і Савета Рэспублікі.



**Падчас выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў Слаўгарадзе.**

> Любая адміністрацыйная рэформа закранае інтарэсы насельніцтва, якое пражывае на гэтай тэрыторыі. Да таго ж гэта яшчэ і вельмі дарагое мерапрыемства.

## СЕМ РАЗОЎ АДМЕРАЙ

***— У апошні час на розных узроўнях, у тым ліку і на ўзроўні дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, усё часцей узнімаецца пытанне пра магчымасць правядзення адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы ў Рэспубліцы Беларусь. Што вы можаце сказаць з гэтай нагоды?***

— Гэта пытанне няпростае, і падыходзіць да змены тэрытарыяльнага ўпарадкавання трэба ўзважана і вельмі асцярожна, улічваючы меркаванні людзей. Любая адміністрацыйная рэформа закранае інтарэсы насельніцтва, якое пражывае на гэтай тэрыторыі. Да таго ж гэта яшчэ і вельмі дарагое мерапрыемства, якое патрабуе сур'ёзнага асэнсавання. Неабходна грунтоўна і дэталёва прапрацаваць наступствы.

У адпаведнасці з планам дзеянняў па рэалізацыі даручэнняў кіраўніка дзяржавы ў Савеце Рэспублікі створана рабочая група па вывучэнні эфектыўнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўпарадкавання Рэспублікі Беларусь і выпрацоўцы прапаноў па яго ўдасканаленні. Будзе сабрана і прааналізавана ўся аналітычная інфармацыя, якая стане асновай прапаноў па павышэнні эфектыўнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўпарадкавання ў нашай краіне. Пры гэтым будуць улічаны ўсе перспектывы развіцця рэгіёнаў, дынаміка колькасці насельніцтва, канцэнтрацыя прадукцыйных сіл, спецыялізацыя гаспадарчага комплексу, прыродныя, дэмаграфічныя і працоўныя рэсурсы, якія ёсць у рэгіёнах. Плануецца, што эканамічна абгрунтаваныя прапановы па гэтым пытанні рабочая група прадставіць у пачатку верасня.

## НЕ АДСТАЦЬ АД ЧАСУ

***— Пастаянная камісія па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, якую вы ўзначальваеце, выступіла з ініцыятывай правядзення маніторынгаў дзейнага заканадаўства. Напрыклад, сёлета праводзіцца маніторынг закона «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы». Якіх вынікаў вы чакаеце ад гэтай работы?***

— Практыка правядзення маніторынгу дзейнага заканадаўства не новая. Імклівае змяненне жыцця грамадства прыводзіць да неабходнасці ўдасканалення законаў, прынятых некалькі дзесяцігоддзяў таму. Савет Рэспублікі, як заканадаўчы орган, павінен пастаянна трымаць руку на пульсе часу і звяраць актуальнасць заканатворчай дзейнасці. Згаданы закон «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы» быў прыняты 18 лютага 1991 года. Папраўкі ў яго ўносіліся ў 2005-м. У такім выглядзе дакумент працуе дагэтуль. Прыйшоў час вывучыць нормы закона з пункту гледжання іх эфектыўнасці для рэалізацыі прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на бягучую пяцігодку. Гаворка ідзе пра павышэнне інвестыцыйнай прывабнасці фермерскіх гаспадарак, павелічэнне экспарту іх прадукцыі, стварэнне працоўных месцаў. Важна прыцягваць у гэтую сферу адукаваную, падрыхтаваную моладзь, якая выкарыстоўвае для працы на зямлі сучасныя тэхналогіі. З улікам гэтага мы і праводзім маніторынг, каб у далейшым унесці ў закон неабходныя папраўкі і стварыць прававыя ўмовы для вырашэння гэтых задач, адкрыць новыя напрамкі для развіцця нашай сельскай вытворчасці. Акрамя таго, праводзячы такую работу, мы імкнемся абагульніць сусветны вопыт, вывучыць меркаванне саміх фермераў.

> Сёння, як ніколі, на мясцовыя органы ўлады ўскладаецца нялёгкі груз адказнасці за ўстойлівае развіццё рэгіёнаў, эфектыўную работу прадпрыемстваў.

Падчас пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў Слаўгарадзе, абмяркоўваючы праблемы павышэння эфектыўнасці работы над заканадаўствам, прыйшлі да высновы, што перад прыняццем таго ці іншага закона ў парламенце неабходна абмяркоўваць яго асноўныя палажэнні на пярвічным узроўні, з удзелам мясцовых Саветаў дэпутатаў. Думаю, што гэтую практыку трэба ўвесці ўжо ў самы бліжэйшы час.

Дэпутаты на месцах таксама павінны ўдзельнічаць у падрыхтоўцы законапраектаў. Зараз праекты законаў накіроўваюцца на разгляд абласным Саветам. Будзе правільна абмяркоўваць важныя дзяржаўныя пытанні і з дэпутатамі гарадскіх і раённых Саветаў.



## ТОЛЬКІ АБ'ЕКТЫЎНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

***— У рабоце дэпутатаў, пачынаючы ад мясцовага і заканчваючы рэспубліканскім узроўнем, вельмі важна своечасова данесці дакладную інфармацыю да выбаршчыкаў, абмеркаваць з насельніцтвам набалелыя праблемы, у тым ліку і на старонках друкаваных выданняў. Якую ролю ў гэтай рабоце вы адводзіце сродкам масавай інфармацыі?***

— Работа дэпутатаў мясцовых Саветаў першапачаткова павінна будавацца на аснове цеснага супрацоўніцтва з раённымі, абласнымі і рэспубліканскімі сродкамі масавай інфармацыі. А ваша выданне — дадатак да газеты «Звязда» «Мясцовае самакіраванне» — павінна стаць галоўным друкаваным органам у асвятленні дзейнасці органаў мясцовага самакіравання, работы дэпутатаў усіх узроўняў. «Мясцовае самакіраванне» першапачаткова выдавалася як тэматычная ўкладка для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў. За невялікі прамежак часу газета стала самастойным 16-палосным выданнем і набыла папулярнасць у чытачоў з усіх рэгіёнаў краіны.

Пра гэта гаварылася і на апошнім пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў Слаўгарадзе. У ліку першачарговых задач была адзначана неабходнасць павышэння якасці інфармацыйнага забеспячэння работы мясцовых органаў улады ў сродках масавай інфармацыі. У выніковым дакуменце пасяджэння Савета прапанавана рэгулярна на старонках газеты «Звязда» і дадатку «Мясцовае самакіраванне» абагульняць і распаўсюджваць перадавы вопыт па сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёнаў, а таксама пастаянна асвятляць дзейнасць дэпутатаў мясцовых Саветаў, іх работу з насельніцтвам, ступень удзелу ў важных падзеях свайго рэгіёна. У сваю чаргу і дэпутатам мясцовых Саветаў у мэтах аператыўнага азнаямлення з работай мясцовых органаў улады і дэпутацкага корпуса, а таксама атрымання інфармацыі аб праектах законаў, якія разглядаюцца ў парламенце, прапанавана прыняць актыўны ўдзел у арганізацыі падпіскі на дадатак да газеты «Звязда» «Мясцовае самакіраванне». Таму перад творчым калектывам выдання стаіць вельмі адказная і няпростая задача — заваяваць у насельніцтва Беларусі аўтарытэт аб'ектыўнай крыніцы атрымання інфармацыі і фарміравання грамадскай думкі па ўсіх пытаннях дзяржаўнай палітыкі.

У цэлым хачу настроіць нованабраны дэпутацкі корпус пярвічнага ўзроўню на сур'ёзную і канструктыўную работу. Час адміністрацыйнага кіравання прайшоў. Трэба ствараць умовы ў сваіх акругах для самастойнага папаўнення бюджэтаў — знайсці пункты эканамічнага росту на мясцовым узроўні. Наладзіць дакладную работу прадпрыемстваў, якія ўжо ёсць, і падумаць аб адкрыцці перспектыўных вытворчасцяў, звярнуць увагу на спецыялізацыю рэгіёнаў. Кожны рэгіён павінен вызначыцца з прыярытэтамі свайго развіцця, мець выразны і выверaны план дзеянняў на найбліжэйшую і сярэднетэрміновую перспектыву. Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця павінна быць выканана. І мясцовым Саветам дэпутатаў трэба ў гэтай рабоце быць інтэгратарамі. Я нават сказаў бы, што гэта праверка нас на трываласць. Толькі аб'яднаўшы намаганні ўсіх галін улады, грамадскіх арганізацый і насельніцтва, можна дасягнуць тых вынікаў, пра якія казаў кіраўнік дзяржавы.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

# НЕ МАЁ, А НАША

## Прыклад

Кацярына Кухарчык успамінае, што ў першыя гады функцыянавання камітэта яна жыла ў адным з суседніх дамоў і, паколькі знаходзілася ў дэкрэтным водпуску, амаль што з акна дома назірала, як пераўтвараецца тэрыторыя насупраць. Людзі выходзілі ўвечары і дапамагалі будаўнікам, спецыялістам, арганізоўвалі масавыя суботнікі. А каля пад'ездаў шчыравалі пенсіянеры, якія разбівалі клумбы, высаджвалі кветкі, даглядалі іх. І на вачах усё мянялася, прыгажэла.

— А калі ўзвялі першую сучасную дзіцячую пляцоўку, — расказвае Кацярына Вікенцьеўна, — вечарамі амаль што чарга выстройвалася з дзяцей — усім хацелася там пагуляць, пакатацца. Само жыццё запатрабавала пашыраць добрую справу, далучаць да камітэта жыхароў іншых дамоў.

Так і выйшла. Паступова ў камітэт «Надзея» ўвайшлі не толькі кааператыўныя дамы, да іх далучыліся і жэсаўскія. Удасканальваліся не толькі формы работы з жыльцамі, але і арганізацыйныя моманты. Напрыклад, у 2010 годзе пасля прыняцця Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» на сходзе 23 упаўнаважаных быў абраны новы склад камітэта «Надзея». І ў яго ўжо ўвайшлі прадстаўнікі дамоў, якія абслугоўваюцца ЖЭС-5. Зараз камітэт аб'ядноўвае 25 дамоў з колькасцю насельніцтва каля пяці тысяч чалавек. Зарэгістраваная новая рэдакцыя статута «Надзеі».

## Супрацоўніцтва

Вельмі многае дае камітэту міжнароднае супрацоўніцтва, і не толькі ў фінансавым плане, што несумненна, самае важнае. Пра

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*



Кацярына КУХАРЧЫК.

сродкі грантаў ужо гаварылася. Але Шведская асацыяцыя камун і ландсцінгаў — SKL International дапамагала не толькі грашыма, яна наладзіла шэраг семінараў па развіцці мясцовага самакіравання. Прадстаўнікі «Надзеі» маглі выехаць і паглядзець замежны вопыт. Работу падобных камітэтаў яны вывучалі ў Польшчы, Літве, Украіне. У кожнай краіне ёсць свая разыначка, свае асаблівасці, але многае ўдалося прымяніць у сябе. І ўжо актывісты «Надзеі» прымалі потым дэпутатаў з Ляхавіцкага, Ганцавіцкага, іншых раёнаў, якія імкнуліся вывучыць вопыт, каб нешта падобнае зрабіць на сваіх тэрыторыях.

## Энтузіязм

— Нам многія казалі, маўляў, не надоўга хопіць вашага энтузіязму, — гаворыць старшыня камітэта. — Але жыццё паказвае, што гэта не так, да добрага таксама хутка прывыкаеш. Вось зараз у нас няма ніякага фінансавання і, можна сказаць, мы працуем на энтузіязме.

Але ж з самага пачатку агаворвалася, што грошы даюцца на стварэнне таго ці іншага аб'екта, скажам, дзіцячай пляцоўкі. А падтрымліваць яго ў належным стане — гэта ўжо справа жыльцоў. Так яно і ёсць. Людзям не трэба напамінаць, яны самі глядзяць за парадкам, самі зробяць заўвагу, калі хто паводзіць сябе не так, як трэба. У кожным доме, у кожным кааператыве ёсць свае актывісты, таксама практычна кожны пад'езд мае аматараў кветак — яны з вясны даглядаюць кветнікі, высаджваюць новыя расліны. Адразу, каб зрабіць клумбы, патрэбна была тэхнічная дапамога, тады звярталіся ў ЖЭС. Камунальнікі прывозілі зямлю. Далейшае — справа жыльцоў.

> Людзі адарваліся ад канап, выйшлі з дамоў і многае зрабілі сваімі рукамі. Калі ж агульная справа атрымала арганізацыйнае ўвасабленне, з'явілася магчымасць атрымаць і гранты.

І яшчэ: адна прыгажосць параджае іншую. Пры стварэнні і прыняцці статута камітэт «Надзея» заяўляў сябе як фарміраванне па добраўпарадкаванні агульных тэрыторый. Папрыгажэла на вуліцы — захацелася палепшыць выгляд дома. Зразумела, што пад'езды сталі клопатам саміх жыльцоў. Апошнім часам вельмі многія дамы літаральна перамяніліся. Людзі сабралі грошы, зрабілі рамонт, многія пад'езды выглядаюць сапраўды светлымі, прыгожымі, нават крэатыўнымі.



Агульная справа аб'ядноўвае па словах Кацярыны Кухарчык.

— Нашы жыльцы сталі больш камунікаваць паміж сабой. На суботнікі выходзяць разам з дзецьмі. Падлеткі, якія самі фарбавалі, рамантавалі лаўкі, не будуць іх ламаць альбо псаваць. Ды і пільныя бабулькі напагатове, калі што. З агульнай справай, у якую ўсё больш і больш людзей уцягваецца, мяняецца сам менталітэт жыхароў. Паяўляецца нават гонар за тое, што жывеш у прыгожым, цывілізаваным асяродку. Нездарма ж праваахоўнікі адзначаюць, што ў нас крымінагенная сітуацыя лепшая, чым у іншых раёнах горада.

## Развіццё

Цяпер «Надзея» падышла да таго, каб пашыраць сваю дзейнасць, выйсці на новыя формы работы. Раней людзі былі больш засяроджаны на добраўпарадкаванні. Цяпер асноўнае зроблена, варта толькі падтрымліваць, удасканальваць. Камітэт ужо разглядае магчымасці дапамогі маламаёмасным, шэфства над пенсіянерамі ў арганізацыі іх вольнага часу. Спроба стварэння клуба для пенсіянераў ужо ёсць. Цяпер варта звярнуць асаблівую ўвагу на тых, хто пражывае адзінока. Ёсць задумка прыцягнуць да работы маладых валанцёраў — недалёка размяшчаюцца карпусы Баранавіцкага ўніверсітэта. Спачатку кіраўнікі «Надзеі» замахваліся стварыць нешта накшталт цэнтра вольнага часу. Але ж зразумелі, што асобны будынак запатрабуе надта многа сродкаў. Таму рашылі выкарыстаць тую базу, якая ёсць, з дапамогай актывістаў-энтузіястаў. Такіх, на шчасце, нямала. Скажам, Рыме Андрэеўне Івашчанцы за восемдзесят, гэта чалавек надзвычай актыўнай жыццёвай пазіцыі. І яна не адна такая. Збірацца, праводзіць сходы, іншыя мерапрыемствы ім дазваляюць у памяшканні ЖЭСа і гімназіі № 1. А планаў па развіцці ў «Надзеі» шмат.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Баранавічы.*

**Рыгор КАСАБУЦКІ, старшыня Баранавіцкага гарадскога Савета дэпутатаў:**

— Па прыкладзе «Надзеі» ў Баранавічах былі створаны камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Вясёлкавы», «Сонечны», «Дамавяты», «Гай-2016», а таксама камітэт у аграгарадку Жамчужны Баранавіцкага раёна. Актывісты «Надзеі» дапамагаюць ім парадай і кансультацыяй. І новы склад гарадскога Савета, абраны сёлета, мае намер падтрымліваць грамадскія фарміраванні, развіваць іх. Такую ж пазіцыю займае і гарадскі выканаўчы камітэт.

Там, дзе яны ёсць, жыццё мікрараёнаў становіцца больш цывілізаваным

# ПЛЯЦОЎКІ

**У Гродне камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КТГС) па месцы жыхарства пачалі ствараца восем гадоў таму. Цяпер яны існуюць амаль пры кожным гарадскім ЖЭСе. Далёка не ўсе працуюць ініцыятыўна, і ўсё ж ёсць такія, дзе жыхары ведаюць сваіх актывістаў, ідуць да іх, а тыя, у сваю чаргу, турбуюць адпаведныя службы. З баявымі жанчынамі Людмілай Паўлічэнкай і Тамарай Краснавід мы сустрэліся ў камітэце тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ЖЭСа № 15 Кастрычніцкага раёна Гродна.**

## Аб'ездзілі ўвесь горад

Людміла Васілеўна была педагог, зараз актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю на пасадзе старшыні камітэта. Разам з Тамарай Вітальеўнай яны пачыналі работу новага фарміравання. Цяпер у складзе камітэта дзевяць чалавек — старшыня, яго намеснік і сем удзельнікаў, кожны з якіх мае свой сектар і прыцягвае да работы актыўных жыхароў.

Ініцыятарамі стварэння новай структуры самакіравання ў мікрараёнах сталі дэпутаты гарадскога Савета. За гэты час было прынята некалькі рашэнняў па прававым рэгуляванні дзейнасці КТГС, распрацавана сістэма заахвочванняў і конкурсаў-аглядаў. Такая структура павінна забяспечыць аператыўнае выяўленне праблем і іх вырашэнне, лічаць у Гродзенскім гарадскім Савеце дэпутатаў, а таксама прыцягнуць да работы нераўнадушных людзей. У іх ліку — і названыя жанчыны. Людміла Паўлічэнка з усмешкай гаворыць, як яе знаходзяць жыхары мікрараёна: маўляў, са сваёй праблемай трэба ісці да жанчыны з рыжымі валасамі, яна дапаможа.

У першую чаргу новая структура была скіравана на добраўпарадкаванне гарадскіх тэрыторый. (Гродна — не толькі прыгранічны горад, але і турыстычны, і мясцовыя ўлады імкнуцца захаваць тут чысціню і парадак.) Старшыня камітэта Людміла Паўлічэнка і яе былы намеснік Тамара Краснавід пачалі з дзіцячых пляцовак. Іх у мікрараёне было відавочна недастаткова, ды і стан вымушаў жадаць лепшага. Спачатку звярнулі ўвагу на цэнтр мікрараёна Фолюш.

— Мы спачатку аб'ездзілі ўвесь горад, паглядзелі, што ёсць цікавага на такіх пляцоўках. «Выбілі» ў камунальнікаў пластыкавую агароджу, аднавілі пляцоўку, пашырылі яе, і тут правялі ў маі сваё першае свята мікрараёна — Дзень сям'і, — расказвае Людміла Васілеўна.

Дарэчы, стары металічны плоцік, які быў раней на дзіцячай пляцоўцы, цяпер прыстасаваны для агароджы стаянкі машын, каб яны не заязджалі на газон. У работу па афарбоўцы і ўсталяванні пляцоўкі тады ўключыліся многія жыхары мікрараёна, маладыя сем'і. Пазней пляцоўкі пашырыліся, тут з'явіліся фігуркі розных казачных персанажаў. Адзін з іх — кракадзіл Гена — нават трапіў у дэтэктыўную гісторыю. Яго нехта ўкраў, але жанчыны змаглі знайсці казачнага героя і вярнуць назад.



Тамара КРАСНАВІД (злева) і Людміла ПАЎЛІЧЭНКА.

## Лаўкі, пандусы, падвалы...

Апошнім часам шырокая ўвага ўдзяляецца стварэнню ў горадзе безбар'ернага асяроддзя. Члены КТГС даведаліся, што сям'і, дзе выхоўваецца дзіця-інвалід, патрэбна спецыяльная каляска. З дапамогай дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Сяргея Пацэвіча і спонсараў з прадпрыемства «АВС» набылі каляску і перадалі сям'і. Таксама дэпутат распарадзіўся, каб у доме зрабілі пад'ёмны пандус. Праўда, ён аказаўся не вельмі зручным.

— Пандусы патрэбны многім, — удакладняе Людміла Паўлічэнка, — у нашых дамах шмат інвалідаў, асабліва сталага ўзросту, і чуць, як іх каляскі грукаюць па ступеньках, проста немагчыма. Пандусы «прабіваем» хоць бы да дзвярэй пад'езда. Ужо вырашылі, што самі купім цэмент і ноймем рабочых. Але справа гэта вельмі марудная.

Даводзіцца вырашаць розныя пытанні, і не толькі па добраўпарадкаванні тэрыторыі, па словах Людмілы Васілеўны. Звярнуліся да яе жыхары мікрараёна з праблемай — у падвалах завяліся пацукі. І жанчыны-актывісткі разам з прадстаўніком санітарнай службы лазілі па падвалах, каб упэўніцца, што спецыяльная атрута будзе пакладзена паўсюдна, а не проста закінута праз акенца.

*(Заканчэнне на 13-й стар. «МС».)*

■ Пасля балю

# БАЦ, БАЦ І — МІМА!

## або Чаго нам зноў не хапіла на «Еўрабачанні»?

**Адшумеў, адспяваў чарговы — ужо 63-і — міжнародны песенны конкурс «Еўрабачанне». Артысты і фаны даўно раз'ехаліся з Лісабона па сваіх краінах, цярпліва чакаючы, чым гэткім здзівіць налета краіна-пераможца Ізраіль. А вось для Беларусі пятнаццатая спроба замахнуцца на крышталёвы мікрафон атрымалася да крыўднага беспаспяховай. Як падлічылі крытыкі, выступленне ўкраінца Мікіты Аляксеева, які сёлета прадстаўляў нашу краіну, дало адзін з найгоршых для нас вынікаў — 16-е месца ў паўфінале і 37-е — у агульным заліку. Што не так у кансерваторыі, і якія ўрокі «Еўрабачання» мы ўпарта не вучым?**



Выпрабаванне 20-тысячнай «Алціс-Арэнай» праходзіць далёка не кожны артыст.

### Ніжняй бялізны для шоу мала

Колькі гадоў беларусы выступаюць на еўрасцэне, столькі доўжацца спрэчкі: ці трэба рабіць з выступлення яскравае шоу, каб зачапіць тэлеаўдыторыю, альбо дастаткова толькі адной, але выдатнай песні?

Зірнём на прыклады. Трэнд «Еўрабачання-2018» — эфектныя паўпразрыстыя сукенкі ў тон з бялізнай. Іх сёлета было так многа, як быццам спявачкам сказалі, што гэта новы дрэс-код. Але ведаеце, што цікава? У фінал з усіх смела распранутых паненак трапіла толькі адна, прадстаўніца Славеніі. І тое таму, што да сукенкі і ніжняй бялізны дадаваліся «фішка» з выключэннем гуку і ўпэўненае жывое выкананне. Альбо ўзяць эстонку Эліну Нячаеву. Яе сукенка-экран вагой у 8 кілаграмаў і плошчай спадніцы ў 53 метры, канешне, забяспечыла карцінку. Але наўрад ці яна спрацавала б, калі б не бездакорны оперны вакал спявачкі — прывітанне з фільма «Пяты элемент».













Ад спявачак у ніжняй бялізне, мяркуючы па выніках «Еўрабачання», гледачы, а тым больш прафесіяналы музыкі ўжо стаміліся.

Зрэшты, тое самае датычыцца і мужчын-выканаўцаў. Сурова-абаяльны датчанін Расмусен растапіў мноства жаночых сэрцаў далёка не падведзенымі чорным вачыма. Аўстрыец Сезар, італьянцы Эрмаль і Фабрыцыа, швед Бенджамін наогул не выкарыстоўвалі ніякіх грувасткіх дэкарацый і нават падтанцоўкі — але ўсе ўвайшлі ў топ-10. А ўкраінец Меловін, чый нумар з трунойраялем і палаючай лесвіцай стаў адным з самых запамінальных выступленняў на конкурсе, у выніку толькі 17-ы... Значыць, чагосьці таксама не хапіла?

Парваць на сабе кашулю, распрануцца да немагчымасці, застрэліцца ружамі, зладзіць вогненны феерверк, скарыстаць робатаў ці галаграму — усё гэта «фішкі», якія могуць спрацаваць, а могуць і падвесці. Аднак калі ў артыста няма глыбіннай харызмы, стрыжня і веры ў свае сілы, то хваляванне і фальшывыя ноты дакладна перакрыюць любую крэатыўную рэжысёрскую задумку.

### Спевы і сэнсы

Па старой звычцы многія называюць «Еўрабачанне» шоу для хатніх гаспадынь і конкурсам фрыкаў, дзе песня стаіць на апошнім месцы. Але гэта, прынамсі ў апошняе дзесяцігоддзе, далёка не так. З кожным годам павялічваецца колькасць артыстаў, якія вязуць на конкурс з больш чым 200-мільённай тэлеаўдыторыяй не проста «хоп-хей, ла-ла-лэй», а песню з дадатковым сэнсам, або, як гаворыць пакаленне хіпстараў, месэджам. Такі быў і ў пераможцы 2015 года Монса Зелмерлёва, які заклікаў кожнага быць героем і абараняць слабых ад жорсткіх нападак, і ў гістарычна-палітычным хіце Джамалы, якая ў 2016-м распавяла песню — гісторыю дэпартацыі крымскіх татар 1944 года, і нават у пранізліва-лірычнай кампазіцыі леташняга пераможцы Сальвадора Сабрала быў свой месэдж — вярнуць на конкурс музыку, спяваць і слухаць яе душой...

Тэндэнцыя працягнулася і сёлета. Міхаэль Шульц з Германіі прысвяціў кранальную песню свайму памерламу бацьку, а дзяўчаты з Сан-Марына праспявалі заклік супраць булінгу падлеткаў у школах. Французскі дуэт Madame Monsieur не выйграў конкурс, але атрымаў спецыяльную ўзнагароду за найлепшую метафару — дакладней, самыя моцныя радкі з усіх песень гэтага года. Песня Францыі «Mercy» прысвечана нігерыйскай дзяўчынцы, якой пашанцавала нарадзіцца і выжыць на судне нелегальных мігрантаў у Міжземным моры, а самі радкі гучаць так: «Я — усе тыя дзеці, якіх забрала мора, я пражыву сто тысяч гадоў, мяне завуць Мерсі». Нарэшце, дуэт музыкаў з Італіі таксама выйграў Сан-Рэма і ўвайшоў у топ-5 «Еўрабачання» не проста так. Песня нарадзілася пасля тэрарыстычнай атакі ў Манчэстары год таму і ўвабрала ў сябе боль мноства сучасных тэрактаў і ваенных канфліктаў. Атрымаўся надзвычай моцны хіт, а разам з ім і танец супраць страху. Кліп на песню ў інтэрнэце паглядзелі ўжо звыш 20 мільёнаў чалавек, а на «Еўрабачанні», кажуць, нават цынічныя журналісты слухалі яе са слязьмі.

Але найбольш яркі і кідкі месэдж быў у пераможцы — ізраільцянкі Неты Барзілай, аўтары песні якой скарысталі тэму сексуальнага пераследу. Кан'юнктура? Быць можа. Аднак гэта песня мае ўжо звыш 43,3 мільёна праглядаў на YouTube і па расповедах маіх сяброў і знаёмых з розных краін, як вірус, гучыць з кожнага прасу, у тым ліку з тэлефонаў падлеткаў.

Словам, гэта ўсё да чаго? Трэба дакладна ведаць і разумець, што артыст хоча сказаць публіцы. І гэта «штосьці» мусіць быць значна, значна больш глыбокім, чым проста «паглядзіце на мяне, у мяне класная песня». Нават у конкурсах прыгажосці знешнасць перастае быць адзіным важным крытэрыем — дык чаму ў песенным конкурсе трэба трэніраваць толькі вакал, а не пасыл? Няма яго — трэба змадэляваць, прыдумаць або шукаць таго, каму і прыдумляць не трэба. Памятаеце леташняе выступленне Naviband? Ксюша і Арцём хацелі прадэманстраваць Еўропе прыгажосць беларускай мовы і зрабілі гэта — натуральна, ненатужна, нясорамна паказалі беларусаў нават лепшымі, чым мы самі сябе лічым.

### Каб любіць Беларусь нашу мілую

Асабіста я далёкая ад звышаптымізму, з якім украінскі прадзюсар Алег Баднарчук назваў выступленне свайго падапечнага перамогай (над сабой). Аднак і «найгоршым вынікам Беларусі на конкурсе» спевы юнага Мікіты Аляксеева таксама кляйміць не збіраюся — былі, былі ў нашай нядоўгай еўравізійнай гісторыі тыя, за каго значна больш сорамна. На жаль, атрымаць каментарыі ад прадстаўнікоў артыста не атрымалася; ён працягвае гастрольны чос: сёння выступае ў Адэсе, заўтра ў Маскве, а там не за гарамі чарговая музычная прэмія маячыць. Прадстаўнікі Белтэлерадыёкампаніі таксама вырашылі захоўваць маўчанне і каментаваць вынікі «Еўрабачання-2018» не сталі. Што ж, паспрабуем зрабіць высновы самастойна.

Мяркую, калі б ALEKSEEV'а (ці любога іншага легіянера) у гісторыі Беларусі на «Еўрабачанні» не было, яго варта было б прыдумаць. І нават не таму, што легіянеры бываюць рознага ўзроўню, і на беларускую вуліцу таксама аднойчы можа прыйсці свая Элені Фурэйра — гарачая грачанка албанскага паходжання, якая сёлета ледзь не падарыла перамогу Кіпру.

Пачнём з таго, што гэта першы падобны — а таму асабліва карысны — вопыт для нашых тэлевізійнікаў. Не ўмешвацца наогул у працэс падрыхтоўкі, даць творчую свабоду і паглядзець, што атрымаецца — у выпадку са «сваім» артыстам такое не пракаціла б, бо зразумела, на каго ў выніку зваляць усякую няўдачу і марнатраўства дзяржаўных грошай.

Па-другое, наяўнасць замежных канкурэнтаў мабілізуе айчынных аўтараў і выканаўцаў. З аднаго боку, каб разварушвалі шоу-бізнес не толькі ўнутранымі скандаламі, а ўдарна працавалі часцей, чым раз на год, і не дасылалі на нацыянальны адбор шэдэўры, ад якіх часам вушы вянуць. (Не згодныя? Перагледзьце інтэрнэт-трансляцыі адбораў апошніх гадоў.) З іншага — каб тыя самыя артысты, нарэшце, пераканаліся, што «Еўрабачанне» — не «Славянскі базар», а прынцыпова іншы конкурс з іншай публікай і напружанымі ўмовамі, у якіх пеўня можа даць нават раскручаная «зорка эстрады»: усе гэта пачуюць і крыўдна абмяркуюць у сацсетках.

Нарэшце, гэты вопыт карысны і для беларускіх гледачоў. Проста, каб запомніць, што «легіянер» ахвотна прыме словы падтрымкі і захапленне фанатаў, а вось ад нашай крытыкі яму, хутчэй за ўсё, не будзе ні горача ні холадна. У адрозненне ад тых артыстаў, каму тут яшчэ жыць і выступаць.

### Замест маралі

Давайце зноў прыгадаем, што шлях да поспеху цярністы не для нас адных. У Літвы з 1994 года найлепшы вынік — як і ў беларусаў, 6-е месца ў фінале, Албанія за 15 гадоў удзелу толькі аднойчы станавілася 5-й, у Славеніі за 25 год — дзве дыскваліфікацыі і найлепшы вынік 7-е месца, Сан-Марына наогул за дзесяць гадоў толькі аднойчы прабівалася ў фінал. Ну і Партугалія, якая ішла да трыумфу 49 гадоў — больш, чым Маісей вадзіў свой народ па пустыні... Так што, спадарства, не тыя нашы гады і вопыт, каб скардзіцца на лёс!

Што рабіць налета — адмовіцца ад удзелу наогул і вырошчваць уласных Сальвадораў Сабралаў, прызначыць аднаго кандыдата закрытым адборам альбо зноў дапусціць у яго ўсіх ахвотных — вырашаць Белтэлерадыёкампаніі як адзінаму ў краіне ўдзельніку Еўрапейскага вяшчальнага саюза. У артыстаў застаецца свабода выбару: падпісвацца на гэта (і адпаведна прымаць правілы гульні) ці пастаяць убаку. Ну а мы, гледачы, можам альбо падтрымаць кагосьці з выканаўцаў рублём і ўсёй душой, альбо ляніва сачыць з канапы за чарговымі калямузычнымі скандаламі і інтрыгамі. А калі вынік будзе зусім ужо не даспадобы, ёсць ідэальнае выйсце: выключыць тэлевізар.



Не толькі мы капіруем іншых. Хто заручыцца, што прычоска Неты з Ізраіля не падгледжана летась у беларускі Ксеніі Жук?



**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота eurovision.tv**

■ Сядзі і глядзі

# У ГЛЫБІНЯХ ПАЧУЦЦЯЎ

**«ДОБРЫЯ НАМЕРЫ»**
**«Беларусь 1», з 24 мая**



Заможная сям'я Фірсавых — фактычна гаспадары правінцыйнага гарадка Заазерска. Бацька сямейства насамрэч любіць малую радзіму і не дазваляе вялікім грашам сапсаваць сябе. Аднак матэрыяльныя даброты не прыносяць шчасця ягоным дзецям.

Старэйшы сын, Сямён, фактычна выкупіў свабоду сваёй каханай Інгі — танцоркі з начнога клуба. Аднак тая так і не змагла пакахаць мужа і знайшла адзінае суцяшэнне ва ўроках танцаў для школьнікаў. Муж сярэдняй дачкі Наташы аказаўся алкаголікам і аматарам азартных гульняў, чые прыгоды перашкаджаюць нават яе мацярынскаму шчасцю. Малодшая дачка Юля, спешчаная бацькам, прызвычаілася атрымліваць усё, што пажадае, — і аднойчы пажадала сэрца прыезджага архітэктара. А той выпадкова і ўзаемна закахаўся ў жонку старэйшага брата... Словам, атрымаўся заблытаны меладраматычны шматкутнік — даўжынёй у 20 серый.

**«САБАКА НА СЕНЕ»**
**«Беларусь 3», 26 мая**



Музычна-камедыйны двухсерыйны экскурс у XVII стагоддзе, Іспанію часоў Лопэ дэ Вега. Прысвячаецца ўсім тым, хто шануе савецкую сінематэку і пяшчотна любіць загадкавую ўсмешку Церахавай, вусы маладога Баярскага і смаляныя кучары Джыгарханяна.

**«СПАТКАННЕ ДЛЯ МАМЫ»**
**«Беларусь 2», з 27 мая**



Рамантычнае рэаліці-шоу, якое стартуе на наступным тыдні ў эфіры маладзёжнага тэлеканала, заснавана на суровых рэаліях. Справа ў тым, што яго галоўныя ўдзельнікі — адзінокія мамы з дзецьмі.

Паводле ўмоў праекта, у кожным з 20 выпускаў за ўвагу ўдзельніцы будуць спаборнічаць некалькі прэтэндэнтаў. Аднак толькі двое з іх атрымаюць магчымасць запрасіць гераіню на спатканне, прычым тых, хто варты рамантычнай сустрэчы, вызначаюць... дзеці. Так, у першай праграме асабістае шчасце паспрабуе адшукаць дырэктар па маркетынгу Ірына, а яе дачка-падлетак Адэліна павесяліцца напоўніцу, прыдумляючы выпрабаванні для кандыдатаў у пошуку самага-самага... Чым скончыцца гэта знаёмства і ці ўхваліць маці выбар дачкі? У тым, уласна кажучы, і цымус рэаліці-шоу!

## Панядзелак, 21 мая

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.05** «Зона Х». (16+).
**9.10** «Галоўны эфір».
**10.15, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Лабірынты» (16+).**
**12.40, 13.05, 14.35, 15.25 Меладрама «Як змучыць палюбоўніцу за 7 дзён». (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** «Нашы».
**22.10 Серыял «След» (16+).**
**23.45** Арэна.
**0.45** «Дзень спорту».

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 18.40, 22.00** Тэлебарометр.
**9.30, 20.00 Серыял «Зразумець. Даравацъ». (16+).**
**10.30** Капейка ў капейку. (12+).
**11.00** Камень, нажніцы, папера. (16+).
**11.35, 22.10** «Спатканне з будучыняй». (16+).
**12.35** «Свет навыварат. Непал». (16+).
**13.35** М/с «Качыныя гісторыі». (0+).
**14.50** Анімацыйны фільм «Прынцэса і жаба». (0+).
**16.30 Фантастыка «Трон: спадчына». (12+).**
**19.15** Суперлато.
**21.00** «Паненка-сялянка». (16+).
**22.05** КЕНО.
**23.05** Хадзі сюды і танцуй.
**23.10 «Анжаліка». Сіткам. 1—2-я серыі. (16+).**
**0.10** Сыграй мяне, калі зможаш. (12+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Пернік з макам.
**8.05, 12.00, 19.55** Навіны культуры.
**8.20, 12.15** Гэты дзень.
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.20, 17.55** «Навукаманія» (6+).
**9.50** «Музеі Беларусі».
**10.15, 17.35** «Любоў Палішчук. Жорсткае танга». Дак. фільм (12+).
**10.50, 16.30 «Толькі ў мюзікхоле». Мюзікл (12+).**
**12.50** «Я хачу гэта ўбачыць!» Навагрудак (6+).
**13.20** «Наперад у мінулае».
**13.45** «Беларусь як песня». Віктар Вуячыч.
**14.10, 22.45** «Сталінград. Перамога, якая змяніла свет». «На Берлін!» (12+).
**14.50, 21.05 «Лёс чалавека». Драма (12+).**
**18.15 «Верныя сябры». Камедыя (12+).**
**20.10** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Яўген Колчаў.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.20** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Міхаіла Даўгялы.

### Беларусь 5

**7.05** Хакей. Чэмпіянат свету. Матч за 3-е месца.
**9.05** Хакей. Чэмпіянат свету. Дзённік.
**9.35** Вынікі тыдня.
**10.15** Вялікі спорт. Ток-шоу.
**11.00** Хакей. Чэмпіянат свету. Фінал.
**13.25** Тэніс. Турнір WTA. Рым. Фінал.
**15.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**15.50** Змешаныя адзінаборствы. UFC.
**17.55** Час футбола.
**18.40** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Віцебск» — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**20.40** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Гомель» — «Нёман» (Гродна). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**22.40** Настольны тэніс. Кваліфікацыя каманднага ЧЕ-2019. Жанчыны. Беларусь — Швецыя.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здарова!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.25, 13.10 Серыял «Ліквідацыя» (16+).**
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Легенды цырка» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Наша жыццё».
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Практыка» (12+).**
**23.00** «Спартклуб» (12+).
**23.30 Серыял «Асабістыя абставіны» (16+).**
**1.25** «Начныя навіны».

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**9.00** «Тыдзень».
**10.00** «Тыдзень спорту».
**10.40** «Вялікае снеданне» (12+).
**11.15** «Следакі» (16+).
**11.45 «Дэпартамент». Серыял (16+).**
**13.50 Фантастыка «Эквілібрыум» (16+).**
**15.35** «Ежа багоў» (16+).
**16.50** «Вялікі горад».
**17.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**17.45 «Правінцыялы». Серыял (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял (16+).**
**22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**23.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**23.45** «Загадкі чалавецтва» (16+).

### МІР

**6.00, 8.05, 10.05, 13.15 Серыял «У вас будзе дзіця» (16+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**14.00, 4.15** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.10, 2.25 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20 Серыял «Джамайка» (12+).**
**23.00, 0.10 Маст. фільм «Самы лепшы вечар» (16+).**
**1.00** «Гульня ў кіно» (12+).
**1.55** «Іншы свет» (12+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пакой смеху». (16+).
**13.35** «Наша справа». (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу .
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.40 Серыял «Сядзелка». (12+).**
**22.30, 23.10 Серыял «Скліфасоўскі». (12+).**
**0.25** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.10 Серыял «Мухтар. Новы след». (16+).**
**8.50 Серыял «Сужэнцы». (16+).**
**9.45** «За гранню».
**10.20 Маст. фільм «Чорны горад». (16+).**
**12.05** «Чакай мяне». (12+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Ляснік». (16+).**
**16.35 Серыял «Пасольства». (16+).**
**17.25** «ДНК». (16+).
**19.45 Серыял «Марскія д' яблы. Смерч». (16+).**
**21.20 Серыял «Справа гонару». (16+).**
**23.10** «НЗ.by».
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Сведкі». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.40, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.15, 23.00 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.10 Серыял «Макс» (16+).**
**9.00, 19.45 Серыял «Імператрыца Кі» (16+).**
**10.05 Баявік «Ліцэнзія на забойства» (12+).**
**12.20** «Сад і агарод».
**12.30 Серыял «Каханне цудоўнае» (16+).**
**14.15 Дэтэктыў «Самурай» (16+).**
**16.00** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**16.05** «Мультпарад» (0+).
**16.30** «Здароўе».
**17.20 Серыял «Анёлы» (16+).**
**18.50 Серыял «Справядлівая справа» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05 Камедыя «Заліковы выкладчык» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 12.40** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**6.20** «Паспець за 24 гадзіны» (16+).
**7.20. 4.15** М/ф «Скубі Ду». (0+)
**7.50, 4.40** М/ф «Тры каты». (6+)
**8.10, 4.55** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+)
**8.30, 4.00** «Ералаш» (6+).
**8.45** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**9.20, 20.00** Серыял «Ад нянавісці да кахання» (16+).
**10.25, 3.30** «Проста кухня» (16+).
**11.00** «Шоу выхаднога дня» (16+).
**13.00, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**14.00, 1.50** Серыял «Маладзёжка» (12+).
**15.10** Серыял «Кухня-6» (16+).
**16.15, 23.15** «Уральскія пельмені». (16+).
**17.00** «Узважаныя і шчаслівыя людзі» (16+).
**19.00** Серыял «Атэль «Элеон» (16+).
**20.00** Серыял «Ад нянавісці да кахання» (16+).
**21.10** Меладрама «Жорсткія гульні». (16+).
**0.00, 2.40** Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства». (16+).
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Уладзімір Валодзін.
**7.05** «Эфект матылька». Дак. серыял.
**7.35, 20.05** «Правілы жыцця».
**8.10** «Небяспечны ўзрост». Маст. фільм.
**9.40, 1.25** Сусветныя скарбы.
**10.15, 17.45** «Назіральнік».
**11.10, 0.40** «Зямля пад акіянам». Дак. фільм.
**12.10** «Мы — грамацеі!»
**12.55** «Так, скіфы — мы!» Дак. фільм.
**13.35, 20.45** «Убачыць пачатак часоў». Дак. фільм.
**14.30** «Біблейскі сюжэт».
**15.10, 1.40** Маскоўскі дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам Паўла Когана. Юбілейны канцэрт.
**16.15** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**16.45** «Агора». Ток-шоу.
**18.45** «Доктар Трапезнікаў. Выжыць, а не памерці...» Дак. фільм.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**21.35** «Сацi. Нясумная класіка...»
**22.20** «Пустая карона: вайна Пунсовай і Белай ружы. Генрых VI». Серыял.
**23.10** «Асмолаў. Псіхалогія перамен». Дак. фільм.
**0.00** «Карэніна і я». Дак. фільм.
**2.50** «Хрысціян Гюйгенс». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**6.45, 12.45, 13.35, 19.00, 20.20, 21.40, 23.00, 0.45, 2.10, 3.40** Музычная настальгія (12+).
**6.50** Праграма «У коле сяброў. Уладзімір Вінакур». 1986 год (12+).
**8.05** Фільм-канцэрт «Вячэрнія мелодыі». 1985 год (12+).
**9.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**10.00** Маст. фільм «Міг удачы» (16+).
**11.10** «Музычны рынг». Гурт «Рондо» і С. Мінаеў. 1989 год (12+).
**12.00** Дак. фільм «Чым пахнуць грошы?» (12+).
**12.55** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Багатыя і бедныя». 1992 год (16+).
**13.50** Праграма «Вясёлыя рабяты». 1985 год (12+).
**15.00** Маст. фільм «Транзіт» (16+).
**17.05** «Музычны рынг». Гурт «Своя игра» і С. Мінаеў. 1989 год (12+).
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Паэзія андэграўнду». 2005 год (18+).
**19.10** Маст. фільм «Капітан Нэма». 1-я серыя (16+).
**20.45, 2.45** «Прэс-экспрэс». 1993 год (16+).
**21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1977. 4-я частка. 2009 год (12+).
**1.05** Маст. фільм «Варыянт «Амега». 5-я серыя (16+).
**4.00** «Колба часу» (16+).
**5.05** «Музычны рынг». Гурт «АукцЫон» і гурт «Своя игра». 1989 год (12+).

### EuroSport 1

**4.00, 6.00, 8.15, 22.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**5.00, 7.15, 9.30, 0.15** Веласпорт. «Джыра д'Італія».
**10.00** Тэніс. Australian Open.
**11.00, 14.00, 17.00, 18.30** Тэніс. «Ралан Гарос». Кваліфікацыя.
**13.00, 17.30, 21.20, 2.30** Аўтагонкі. WTCR.
**21.00** Тэніс. «Рыхтуйся да «Ралан Гарос».
**1.30** Watts.
**1.45** Аўтагонкі. Формула Е.

### Кінакамедыя

**0.20** Як снег на галаву. (16+).
**2.10** Дом з паранармальнымі з'явамі. (16+).
**3.45** Дом з паранармальнымі з'явамі-2. (18+).
**5.20** З 5 да 7. Час палюбоўнікаў. (16+).
**7.10** Вялікае вяселле. (16+).
**8.45** Маё вялікае грэчаскае лета. (16+).
**10.30** Як украсці брыльянт. (16+).
**12.15** Каханне і іншыя катастрофы. (12+).
**14.00** Мідлтан. (16+).
**15.55** Махляры. (16+).
**17.45** Без пачуццяў. (16+).
**19.30** Малавіта. (16+).
**21.35** Формула 51. (16+).
**23.20** Аднакласніцы. (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.55** «10 самых» (16+).
**8.25** «Доктар І...» (16+).
**8.55, 18.55, 1.30** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.35, 3.05** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10** «Асцярожна, махляры!» (16+).
**12.40** «Без падману» (16+).
**13.30** «Партрэт другой жонкі». Меладрама (12+).
**15.20** «Нераскрытыя тайны» (16+).
**16.15** «Мой герой» (12+).
**17.05** «Развітанне» (16+).
**18.00** «Мода з рызыкай для жыцця». Дак. фільм (12+).
**20.45** «Дылетант». Дэтэктыў (12+).
**21.45** «Нераскрытыя тайны» (16+).
**22.40, 4.35** «Уся Праўда» (16+).
**23.10** «Грань». Серыял (16+).
**0.00** «Брыльянтавы паліцэйскі». Камедыя (12+).
**5.05** «Часова даступны» (12+).

### ТБ1000

**6.10, 15.50** Шанхайскія рыцары. (12+).
**8.30** Вясельны пярэпалах. (12+).
**10.40** Іржа і костка. (16+).
**13.10** Легенды восені. (16+).
**18.10** Трусіная нара. (16+).
**20.10** Прывітанне, Джулі! (16+).
**22.00** Рымскія спатканні. (16+).
**23.50** Зільс-Марыя. (18+).
**2.20** Афера па-англійску. (18+).
**4.10** Сэрцаед. (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Граф Мантэнегра (12+).
**8.30** Цёмны свет: раўнавага (12+).
**10.30** Кампенсацыя (16+).
**12.20** Якая цудоўная гульня (12+).
**14.20** Пра што гавораць мужчыны. Працяг (16+).
**16.20, 4.20** Пляменніка. (12+).
**18.20** Апошні забой (16+).
**20.20** Любовь-морковь (12+).
**22.25** Івановы (12+).
**0.20** Ракавыя яйкі (18+).
**2.35** Выкрутасы (12+).

### National Geographic

**6.00, 14.50** Цуды інжынерыі. (12+).
**6.50, 10.10** Зона будаўніцтва. (12+).
**7.15** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.40, 13.20** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.30, 11.45, 16.20, 20.25** Аўта-SOS. (12+).
**9.20** Невядомая планета зямля. (12+).
**11.00** Дзікі тунец. (16+).
**14.05** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**15.35, 19.40, 0.25, 2.50** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**17.10, 21.10, 1.10, 4.25** Геній: Пікаса. (16+).
**18.55** Уварванне на Зямлю. (16+).
**22.50, 2.05** Гісторыя Гары: чатыры вяселлі і адно пахаванне. (12+).
**23.40** Ліхтугі за мяжой. (18+).
**5.15** Найцяжэйшы ў свеце рамонт. (6+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары.
**9.00, 15.00, 21.00** Як гэта ўстроена?
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на рэліквіі.
**11.00** Выжыць разам.
**14.00, 7.10** Выжыванне без купюр.
**18.00, 6.20** Хуткія і гучныя.
**20.00** Залатая ліхаманка.
**0.00** Бітва за нерухомасць.
**1.00** Турбадуэт.
**2.00, 5.30** Самагоншчыкі.
**2.55** Вулічная навука.

## Серада, 23 мая

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.05** «Зона Х». (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След» (16+).**
**10.50, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Лабірынты» (16+).**
**13.10** «Дзіцячы доктар».
**13.40** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.40, 15.25 Серыял «Клан ювеліраў. Адплата». (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**23.45** «Сфера інтарэсаў».
**0.45** «Дзень спорту».

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 19.40** Тэлебарометр.
**9.05, 19.45 Серыял «Сляпая». (16+).**
**10.05, 17.40 Серыял «Акадэмія». (16+).**
**12.10, 22.05** «Арол і рэшка. Кругасветка». (16+).
**13.05** «Паненка-сялянка». (16+).
**14.15** «Бітва салонаў». (16+).
**15.15, 23.05** «Анжаліка». Сіткам. (16+).
**16.15, 0.05** Нічога сабе ньюз. (12+).
**16.20, 0.10** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.10** «Багіня шопінгу». (16+).
**20.50** «Абмен жонкамі». (16+).
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Клёцкі з душамі.
**8.05, 12.00, 19.55** Навіны культуры.
**8.20, 12.15** Гэты дзень.
**8.25, 18.35 «Галіна». Маст. фільм. (16+).**
**9.20, 17.55** «Нона Мардзюкова. «Как на свете без любви прожить...» Дак. фільм (12+).
**10.00** «Музеі Беларусі».
**10.25** «Міхась Пазнякоў. Слова паэта». Дак. фільм (12+).
**10.40, 16.35 «Надзвычайнае здарэнне». Маст. фільм. 1-я серыя (12+).**
**12.45** «Хата на хату».
**13.40** «Славянскі базар у Віцебску — 2014». Алег Газманаў.
**15.10, 21.50** «Курская бітва. Час перамагаць». «Разменная манета фюрэра» (12+).
**15.50, 21.05 «Смяротная схватка». Маст. фільм. (12+).**
**19.30** «Камертон». Народная артыстка Беларусі Ніна Шарубіна.
**20.10** «Беларуская кухня». Крапанікі.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.30** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Максім Пятруль.
**22.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастачкі, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Нінэль Шчаснай.

### Беларусь 5

**7.05** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Гарадзея» — «Шахцёр» (Салігорск).
**8.55** Спорт-кадр.
**9.25** Легенды сусветнага спорту.
**9.55** Настольны тэніс. Кваліфікацыя каманднага ЧЕ-2019. Мужчыны. Беларусь — Славакія.
**11.40** Козел пра футбол.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA. Страсбург.
**15.55** Валейбол. Залатая Еўраліга. Жанчыны. Беларусь — Славакія.
**17.55** На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**18.25** Слэм-данк.
**18.55** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. БГК імя Мяшкова — СКА-Мінск. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**20.35** Спорт-цэнтр.
**20.45** Валейбол. Сярэбраная Еўраліга. Мужчыны. Беларусь — Харватыя.
**22.45** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — БАТЭ (Барысаў).

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Валянціна Лявонцьева. Прызнанне ў каханні» (12+).
**10.00** «Жыць здорава!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.25, 13.10 Серыял «Ліквідацыя» (16+).**
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Легенды цырка» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Практыка» (12+).**
**23.05** «Рэпарцёр».
**23.25 Серыял «Асабістыя абставіны» (16+).**
**1.20** «Начныя навіны».

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**9.00, 17.45 «Правінцыялы». Серыял (16+).**
**10.40, 23.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30** «Аўтапанарама» (12+).
**11.50** Дакументальны спецпраект (16+).
**13.50, 20.15 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял (16+).**
**15.35** «Ежа багоў» (16+).
**16.50** «Самая карысная праграма» (16+).
**17.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**23.55** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.45 «Каманда Чэ». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00 Серыял «АСА» (16+).**
**7.15, 8.05, 10.05, 13.15 Серыял «Адналюбы» (16+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**14.00** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 1.00** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.10, 2.25 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20 Серыял «Джамайка» (12+).**
**23.00, 0.10 Маст. фільм «Камень» (16+).**
**1.55** «Іншы свет» (12+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 20.40 Серыял «Сядзелка». (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**22.30, 23.10 Серыял «Скліфасоўскі». (12+).**
**0.25** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.10 Серыял «Мухтар. Новы след». (16+).**
**8.50 Серыял «Сужэнцы». (16+).**
**9.40, 23.10** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Алібі» на дваіх». (16+).**
**12.05** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Ляснік». (16+).**
**16.35 Серыял «Пасольства». (16+).**
**17.15** «ДНК». (16+).
**19.45 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч». (16+).**
**21.20 Серыял «Справа гонару». (16+).**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Сведкі». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 16.05, 19.40, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.15, 23.10 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.05 Серыял «Я чакаю цябе» (16+).**
**8.55, 19.45 Серыял «Імператрыца Кі» (16+).**
**10.00** «Сад і агарод».
**10.30** «Дыялогі з усім светам».
**11.00 Драма «Мой ласкавы і пяшчотны звер» (16+).**
**12.50 Серыял «Каханне цудоўнае» (16+).**
**14.25 Камедыя «Сямейка Джонсаў» (16+).**
**16.10** «Мультпарад» (0+).
**16.35** «Здароўе».
**17.20 Серыял «Анёлы» (16+).**
**18.20 Серыял «Справядлівая справа» (16+).**
**19.10** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05 Трылер «Заложнік смерці» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 16.15** Серыял «Варонiны». (12+).
**7.20. 4.00** М/ф «Скубі Ду». (0+)
**7.50, 4.25** М/ф «Тры каты». (6+)
**8.10, 4.40** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+)
**8.30, 5.00** М/ф «Наватар». (0+)
**8.50, 3.30** «Ералаш» (6+).
**9.20, 20.00** Серыял «Ад нянавісці да кахання» (16+).
**10.25** Камедыя «Голая праўда». (16+).
**12.30** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**13.00, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**14.00, 1.50** Серыял «Маладзёжка» (12+).
**15.10, 19.00** Серыял «Атэль «Элеон» (16+).
**17.50, 23.40** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.10** Камедыя «Думай, як мужчына». (12+).
**0.00, 2.40** Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства». (16+).
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Абрам Роам.
**7.05** «Пешшу...» Масква залатагаловая.
**7.35, 20.05** «Правілы жыцця».
**8.05, 22.20** «Пустая карона: вайна Пунсовай і Белай ружы. Генрых VI». Серыял.
**8.55** Замежная справа. «Вялікі пасол».
**9.40, 19.45** «Галоўная роля».
**10.15, 17.45** «Назіральнік».
**11.10, 0.40** «Міхаіл Ульянаў чытае апавяданні Васіля Шукшына». 1977.
**12.25** «Алтайскія кержакі». Дак. фільм.
**12.55** «Штучны адбор».
**13.35, 20.45** «Вулкан, які змяніў свет». Дак. фільм.
**14.30, 23.10** «Асмолаў. Псіхалогія змен». Дак. фільм.
**15.10** Міцука Учыда і аркестр «Камерата Зальцбург». Моцартэум. Вялікая зала.
**16.15** «Пешшу...» Масква транспартная.
**16.45** «Блізкае кола Аляксандра Шырвінта».
**17.35** Колер часу. Ж.-Э. Ліятар. «Прыгожая шакаладніца».
**18.45** Да 105-годдзя з дня нараджэння Мікіты Багаслоўскага. «Астравы».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**21.35** «Абсалютны слых».
**0.00** Дакументальная камера. «Іерогліф «Японія».
**1.55** «Лебедзь з Пезара. Невядомы Расіні». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Навгародцавым: «Паэзія андэграўнду». 2005 год (18+).
**7.00, 8.20, 9.40, 11.00, 12.45, 14.20, 15.40, 17.00, 20.20, 21.40, 23.00, 0.45, 1.35** Музычная настальгія (12+).
**7.10, 13.10, 19.15** Маст. фільм «Капітан Нэма» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Нараджаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Самая чытаючая краіна». 2007 год (12+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год (12+).
**0.00** Дак. фільм «Чым пахнуць грошы?» (12+).
**0.55** Праграма «Тэма» з Уладзіславам Лісцьевым: «Багатыя і бедныя». 1992 год (16+).
**1.50** Праграма «Вясёлыя рабяты». 1985 год (12+).
**3.00** Маст. фільм «Транзіт» (16+).
**5.05** «Музычны рынг». Гурт «Своя игра» і С. Мінаеў. 1989 год (12+).

### EuroSport 1

**4.00, 6.00, 8.15, 18.30, 1.30** Тэніс. АТР.
**5.00, 7.15, 9.50, 12.45, 14.15, 21.20, 0.35, 2.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія».
**9.30, 21.00** Тэніс. «Рыхтуйся да «Ралан Гарос».
**11.00** Алімпійскія гульні. «Анатомія спорту».
**12.00, 0.00** Аўтагонкі. WTCR.
**14.00, 18.15** Веласпорт. «Джыра»-экстра.
**23.00** Футбол. «ФІФА».
**23.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.

### Кінакамедыя

**0.30** Як украсці брыльянт. (16+).
**2.15** Шоу «Камедыянты». (16+).
**2.40** Мамы. (12+).
**4.40** Маё вялікае грэчаскае лета. (16+).
**6.30** Супермозг. (16+).
**8.40** З 5 да 7. Час палюбоўнікаў. (16+).
**10.25** Махляры. (16+).
**12.15** Вой, мамачкі. (18+).
**14.05** Халасцякі ў адрыве. (16+).
**16.00** Малавіта. (16+).
**18.05** Аднакласніцы: новы паварот. (16+).
**19.30** Гордасць. (18+).
**21.45** Найноўшы запавет. (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.10** «Доктар I...» (16+).
**8.40, 18.55, 2.05** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.15, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.55, 17.15** «Варажбітка» (12+).
**13.00, 16.15** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.00** «Сакрэты экстрасэнсаў» (16+).
**14.55** «Простыя складанасці» (12+).
**15.25** «Натуральны адбор» (12+).
**20.45** «Дылетант». Дэтэктыў (12+).
**21.40, 5.15** «Дзікія грошы» (16+).
**22.30** «Лінія абароны» (16+).
**23.05** «Грань». Серыял (16+).
**23.55** «Залатое вока». Баявік (12+).

### ТБ1000

**6.10** Як баязлівы Роберт Форд забіў Джэсі Джэймса. (16+).
**9.10** Банды Нью-Ёрка. (16+).
**12.15** Сезон палявання-2. (12+).
**13.45** Іржа і костка. (16+).
**16.05** Вечнасць. (16+).
**18.20** Усё або нічога. (16+).
**20.30** Кірмаш ганарыстасці. (12+).
**23.10** Іншы свет: абуджэнне. (18+).
**0.55** Эван Усемагутны. (12+).
**2.45** Вясельны пярэпалах. (12+).
**4.30** Асуджаныя заручаныя. (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Любовь-морковь-2 (12+).
**8.20** Прыватнае піянерскае (12+).
**10.20** Пра што гавораць мужчыны. Працяг (16+).
**12.25** Дама з сабачкам (6+).
**14.20** Добры хлопчык (12+).
**16.20, 4.20** Жонка напракат. (12+).
**18.20** Цёмны свет (16+).
**20.20** Любовь-морковь-3 (12+).
**22.15** Скрыпка (12+).
**0.15** Бумер-2 (16+).
**2.25** Граф Мантэнегра (12+).

### National Geographic

**6.00** Цуды інжынерыі. (12+).
**6.50** Зона будаўніцтва. (12+).
**7.15** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.40, 13.20** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.25, 11.45, 16.25, 20.25** Аўта-SOS. (12+).
**10.05, 15.30** Геній: Пікаса. (16+).
**10.55, 18.00, 22.00, 1.05, 4.20** Дзікі тунец. (16+).
**14.05** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**14.50** Непаражальныя канструкцыі. (12+).
**18.45, 22.45, 1.55** Ізумруд за 400 мільёнаў долараў. (12+).
**19.35, 0.20, 2.45** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**23.35** Ліхтугі за мяжой. (16+).
**5.10** Найцяжэйшы ў свеце рамонт. (6+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары.
**9.00, 15.00, 21.00** Як гэта ўстроена?
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на рэліквіі.
**11.00, 13.30** Паляўнічыя на склады.
**14.00, 7.10** Выжыванне без купюр.
**18.00** Залаты шлях.
**19.00, 6.20** Хуткія і гучныя.
**20.00** Залатая ліхаманка.
**0.00** Вірусы.
**1.00, 5.30** Самагоншчыкі.
**2.00** Сакрэты падзямелля.
**2.55** Не спрабуйце паўтарыць.

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** На гэтым тыдні паспрабуйце быць аднолькава ветлівымі і настойлівымі, менавіта такая схема паводзін будзе ключом да поспеху і ў прафесійнай сферы, і ў асабістым жыцці. У аўторак не варта перабольшваць, апісваючы камусьці свае магчымасці, лепш нават некалькі прыніжаць патрабаванні да сябе, тады вы зможаце выратавацца ад расчараванняў. У пятніцу практычна з усімі справамі справіцеся з лёгкасцю.



**ЦЯЛЕЦ.** Ваша сабранасць і дасціпнасць будуць пазітыўна дзейнічаць на навакольных. Калі не разгубіцеся ў незвычайнай сітуацыі, то рыхтуйцеся да рамантычнага знаёмства. З панядзелка задайце выразны рытм працы і няўхільна прытрымлівайцеся яго. У чацвер з'явіцца шанц значна ўмацаваць аўтарытэт. Вырашайце праблемы па меры іх узнікнення, не марнуючы лішніх сіл на крытыку і жаль да самога сябе. У нядзелю актыўны адпачынак дазволіць аднавіць сілы, а вось ляжанне на канапе ператворыць вас у падабенства кісялю.



**БЛІЗНЯТЫ.** Наступны тыдзень — выдатны час для творчай працы і цікавых знаёмстваў. Зможаце праявіць дзелавую хватку, падмацаваўшы яе інфармаванасцю і надзейнымі сувязямі. Аднак не перашчырыце, узяўшы ініцыятыву ў свае рукі і дыктуючы свае правілы гульні. Аўторак — удалы дзень для пачатку новага праекта. У чацвер верагодныя рэзкія змены настрою, аднак усё скончыцца на пазітыўнай ноце.



**РАК.** Час пазбаўляцца ад шкодных звычак, калі такія ў вас маюцца. Спрыяльныя дні для важных кар'ерных пачынанняў. Для гэтага ў вас ёсць усё: веды, сілы, рашучасць. Стаіць цікавая задача — неабходна выбраць сродкі і аптымальны тэмп. Але спадзявацца давядзецца толькі на свае сілы. Цяпер час адточвання майстэрства. У выхадныя хатнія справы запатрабуюць увагі, але пастарайцеся не ўзвальваць усе праблемы на сябе, лепш пашукайце каго-небудзь менш занятага.



**ЛЕЎ.** Ні ўзлётаў у паднябессе поспеху, ні балючых удараў аб цвердзь зямную не чакаецца. У першай палове тыдня з'явіцца магчымасць умацаваць свае пазіцыі, вас могуць павысіць на пасадзе. Пачынаючы з пятніцы, паспрабуйце ўдзяляць больш увагі рашэнню асабістых неадкладных праблем, работа можа трошкі пацярпець. Толькі не бярыцеся усіх выхоўваць, неасцярожна прамоўленае слова здольна распаліць канфлікт у сям'і.



**ДЗЕВА.** Вы зараз на варце справядлівасці і заклікаеце вінаватых да адказу. Аднак паспрабуйце не спакушацца абяцаннямі з фальшывай начынкай, нядобразычлівцы паспрабуюць уставіць вам палкі ў колы. У аўторак не варта сумнявацца ва ўласных сілах, недаверлівасць можа стаць прычынай няўдач. У сераду і чацвер інтэнсіўнасць вашай работы будзе прама прапарцыянальная заробку. У выхадныя можаце разлічваць на дапамогу і клопат сябра ці сваякоў. І самі больш уважліва ставіцеся да блізкіх людзей.

# ТАМ, ДЗЕ ТЫ ЖЫВЕШ

## Карэспандэнт «МС» паназірала, як у Магілёве праходзілі перавыбары ў Савет тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання

**СХОД Савета мікразоны № 2 уразіў. І той работай, якая была зроблена тутэйшымі актывістамі летась, і стаўленнем да гэтага мерапрыемства прадстаўнікоў мясцовай улады. Выслухаць праблемы насельніцтва завіталі старшыня Магілёўскага гарсавета дэпутатаў Андрэй КІБЛОЎ і кіраўнік адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Магілёва Міхаіл ГАЛУШКОЎ. Ён прыбыў на сустрэчу адразу ж пасля прыёму грамадзян па асабістых пытаннях. А перад гэтым праехаў па дварах і праверыў іх стан.**

### ПЕРШЫЯ Ў ГОРАДЗЕ

У гэтую мікразону можна звяртацца па вопыт работы. Менавіта яна прызнаная найлепшай па выніках спаборніцтва за мінулы год у горадзе. Тут шмат неабыякавых і ініцыятыўных людзей. Мікрараён стары — дарогі, дваровае абсталяванне чакаюць рамонту, а часцей наогул замены, але тут шмат чаго робіцца рукамі саміх жыхароў. Натхняе іх на гэта дырэктар мясцовай школы № 7 Аляксандр Крамачоў, а па сумяшчальніцтве — старшыня Савета тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання па рабоце з насельніцтвам мікразоны № 2. Месяц таму ён пайшоў на «павышэнне» — узначаліў пункт аховы правапарадку № 6. Школа тут — сапраўдны сацыякультурны цэнтр, вакол якога згуртаваліся ўсе: жыхары, арганізацыі, прадпрыемствы, прадпрымальнікі.

Аб актыўнай сумеснай дзейнасці сведчаць шматлікія фота. Вось жыхары робяць клумбы, вось школьнікі прыбіраюць смецце, а вось камунальнікі манціруюць дваровыя «атракцыёны». У Савеце мікразоны можна атрымаць кансультацыю па любых пытаннях, пакінуць заяўку аб праблеме, даведацца, калі ў доме пачнецца капрамонт. Сюды для сустрэч з насельніцтвам запрашаюцца розныя спецыялісты. Тэрыторыя мікразоны вялікая, але тут умеюць падтрымліваць парадак. Прычым самі, не чакаючы, калі прыйдуць камунальнікі і прыбяруць.

— У нас для эфектыўнай работы створаны Савет старшых, у які ўвайшлі старшыні дамавых камітэтаў, старшыя па пад'ездах, найбольш ініцыятыўныя жыхары, — расказвае Аляксандр Крамачоў. — Мы не толькі заахвочваем насельніцтва і распрацоўваем лістоўкі з заклікам прыняць удзел у суботніку або пасадцы дрэў, але і арганізоўваем культурныя мерапрыемствы, уцягваем жыхароў у рэалізацыю сацыяльных праектаў. І вынікі ёсць.

Савет цесна сябруе з валанцёрамі і актывістамі школьнай пярвічкі БРСМ, разам з імі ладзяць дабрачынныя святы і акцыі. Члены Савета разам з ратавальнікамі і міліцыянерамі праводзяць рэйды, займаюцца прафілактыкай няшчасных выпадкаў і надзвычайных сітуацый.

### БОЛЕВЫЯ КРОПКІ

Старасты, старшыя па пад'ездах, проста ініцыятыўныя людзі прыйшлі на сход, каб разам з кіраўніцтвам падвесці вынікі леташняй работы, а таксама агучыць тое, што набалела. Актывістаў ад грамадскасці хвалюе перш за ўсё пытанне парадку на вуліцах, непрыбранае смецце.

**Старшыня Магілёўскага гарсавета Андрэй КІБЛОЎ**, які мае вялікі вопыт работы ў сістэме ЖКГ, з веданнем справы супакойвае, што знайсці гаспадара «закінутай» тэрыторыі не праблема, але ж і самі жыхары могуць дапамагчы яе прыбраць.



Падчас работы сходу.

А вось ушчэнт разбітыя дваровыя дарогі — як з імі быць?

— Двары дамоў № 6а і № 10 па Віцебскім праспекце — наогул жах, там няма нават дзіцячых пляцовак, — бярэ ў рукі ініцыятыву адна з удзельніц. — ЖЭУ нешта зрабіла па мінімуме і ўсё. Звярталіся ў адміністрацыю Кастрычніцкага раёна, але зрухаў ніякіх. Нам паабяцалі дапамагчы, а потым паведамілі, што грошай няма.

**Старшыня Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй КІБЛОЎ:**

— Мне цікава прысутнічаць на падобных пасяджэннях і назіраць за выбарамі ў Саветы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Я хачу, каб прадстаўнікі гэтых Саветаў ведалі сваіх дэпутатаў у твар, каб народныя абраннікі таксама ўваходзілі ў склад Саветаў мікразон. Людзі павінны бачыць, што мы ў курсе іх праблем, якія будзем вырашаць разам з імі. Хочацца, каб і актывісты расказвалі насельніцтву пра тое, што робяць улады ў горадзе. Нам дайсці да кожнага цяжка, а вось старшыням Саветаў грамадскага самакіравання, вулічкамаў, дамоў, пад'ездаў прасцей пераказаць суседзям усё, што яны пачулі на сустрэчы. Вельмі важна, каб на такіх сходах прысутнічалі і прадстаўнікі адміністрацыі раёна. Яны каардынуюць работу актыву мікразон і павінны ведаць, чым жыве народ.

**Кіраўнік адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Міхаіл ГАЛУШКОЎ** згодны з тым, што ў раёне шмат болевых кропак, і на ўсе адначасова сапраўды не хапае грошай.

Але пустых абяцанняў ён даваць не прывык, трэба вызначаць прыярытэты.

— Па мікрараёне сёлета запланаваны рамонт дваровых праездаў, пешаходных дарожак, дзіцячага абсталявання і гэтак далей побач з некаторымі дамамі па вуліцы Аўтазаводскай, а таксама па адрасе: Віцебскі праспект № 22, — дзеліцца ён планамі. — Што да ўсяго астатняга, будзем наводзіць парадак сумеснымі намаганнямі з жыхарамі.

Кіраўнік адміністрацыі дзеліцца з грамадскасцю добрай навіной. Пры перадачы стадыёна «Тарпеда» (галоўнага спартыўнага аб'екта ў маштабах Кастрычніцкага раёна) прадпрыемства «БелАЗ» выдзеліла 1,2 мільярда рублёў на яго рэканструкцыю. Грошы ўжо паступілі, распрацоўваецца праект. На другім паверсе будынка будзе фітнес-зала з сучасным абсталяваннем, на 1-м — аздараўленчы комплекс з басейнам.

### І НІЯКАЙ КРЫЎДЫ!

Як камунальнік з вялікім вопытам, Андрэй Кіблоў бачыць рашэнне праблемы з добраўпарадкаваннем дваровых тэрыторый у выпрацоўцы новай стратэгіі.

— Кожны год у Магілёве зацвярджаецца адпаведны план, куды ўключаюцца тэрыторыі, якія трэба правесці ў належны від, — тлумачыць ён. — Асноўная задача, якую я бачу, — распрацоўка такіх планаў з удзелам Саветаў мікразон. Раней усё рабілася па прапановах ЖЭУ. Цяпер будзем прымаць пажаданні ад органаў самакіравання, абмяркоўваць іх з ЖЭУ і выбіраць у першую чаргу тыя двары, дзе самі грамадзяне выказалі жаданне актыўна паўдзельнічаць. Каб не было ніякай крыўды, што суседскі двор робяць, а наш не.

— Пра Саветы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання мы раней крыху забываліся, спрабавалі абысціся камунальнымі службамі, прадпрыемствамі. Але гэта няправільна, — лічыць Міхаіл Галушкоў. — Трэба самім захоўваць парадак там, дзе жывеш.

Часта людзі скардзяцца, што ў іх пад'ездзе або двары не прыбіраюць, а самі нешта карыснае зрабіць не могуць. Але ж ёсць і тыя, якія хацелі б удзельнічаць у развіцці свайго мікрараёна. А калі ёсць ініцыятыва, прасцей і грошы знайсці. У раёне шмат прыкладаў, калі добрую ідэю падтрымлівалі прадпрыемствы і прадпрымальнікі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ДЛЯ АКТЫЎНЫХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 4-й стар. «МС».)*

Падчас «рэйду» выявілася шмат праблем: лямпачкі, якія даўно перагарэлі, смецце, стыхійныя кладоўкі... Пры тым, што тэхнічныя памяшканні павінны адпавядаць супрацьпажарным нормам. Дабіліся, каб кладоўкі разабралі, а смецце вывезлі. Былы начальнік ЖЭСа атрымаў тады штраф у пяць базавых велічынь, затое зараз там і святло ёсць, і парадак, кажа Людміла Васілеўна. Трэба праверыць яшчэ нямала дамоў. Яна прызнаецца, што працаваць у камітэце не проста. Трэба прайсці не адну інстанцыю, каб дабіцца выніку. Бо сродкі акумуляваны ў гарадской ЖКГ, а на кожны аб'ект патрэбны тэндар. Напрыклад, зараз павінны былі выдзеліць дзве тысячы рублёў, а іх няма. А людзі працягваюць звяртацца, бо КТГС бліжэй за ўсіх да іх.

### Тут не смецяць

Жанчыны праводзяць мяне па тэрыторыі мікрараёна. Раней Фолюш быў ваенным гарадком, а ў 90-я яго перадалі гораду. Многія тут ведаюць адзін аднаго, таму і працаваць у такім асяроддзі лягчэй. Паўсюдна каля дамоў разбіты клумбы, шмат кветак і дэкаратыўных раслін. На некаторых будынках вісіць шыльда «Дом узорнага ўтрымання». У пад'ездах — карціны, на пляцоўках — вазы і дыванкі, на вокнах — занавескі. І ўсюды — аб'явы: курыць і распіваць спіртныя напіткі забаронена.




**Барыс ФЁДАРАЎ, старшыня Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў:**

— У нас ёсць актыўныя людзі, якія гатовы добраўпарадкаваць горад, дапамагаць дэпутацкаму корпусу, адміністрацыі. Ініцыятыўныя групы прапануюць дэпутатам і ЖЭСам розныя праекты — ад установкі вулічных трэнажораў да будаўніцтва паркінга. Многае зроблена. Разам з тым ёсць праблемы. Напрыклад, як актывізаваць моладзь? Тут варта больш шырока задзейнічаць сацыяльныя сеткі, як гэта робяць нашы расійскія калегі. Таксама неабходна звярнуць увагу на амаладжэнне складу членаў камітэтаў, іх узаемадзеянне з дзяржаўнымі структурамі. Існуе праблема месцаў збору членаў КТГС. Недастаткова фінансуюцца святы мікрараёнаў, іншыя лакальныя мерапрыемствы. Людзі часта не лічаць гэтыя фарміраванні дзейсным органам, які зможа вырашыць праблему. Да таго ж мала сапраўдных лідараў, якія карыстаюцца аўтарытэтам у жыхароў мікрараёна. Таму і «карціна» на сённяшні дзень у гэтым плане няроўная. Пакуль шмат фармалізму ці наогул бяздзейнасці. Задача дэпутатаў — аказваць падтрымку камітэтам, заўважаць іх ініцыятывы.

Тамара Вітальеўна, якая абраная старшай па пад'ездзе, гаворыць, што тут ніхто не смеціць, раз у месяц уборку праводзіць работнік ЖЭСа, а пры неабходнасці свае пляцоўкі мыюць самі жыхары.

**На першы погляд можа здацца, што камітэты падмяняюць работу камунальных службаў, але гэта не зусім так. Гэтыя фарміраванні хутчэй адыгрываюць ролю «звязкі» паміж адміністрацыяй і жыхарамі раёна. А стаўка на грамадскасць дазваляе ўбачыць нават самыя нязначныя праблемы, якія тым не менш хваляюць людзей.**

Вось адзін з альбомаў, дзе прадстаўлена дзейнасць КТГС за год. Тут і перадвыбарная кампанія, і дабрачынныя акцыі, і дапамога састарэлым і адзінокім, і работа са школьнікамі, і клуб пенсіянераў.

Важным момантам у рабоце тэрытарыяльнага камітэта з'яўляецца наяўнасць свайго «кутка». Тут ёсць месца і для кабінета, і для клуба па інтарэсах. На думку Людмілы Васілеўны, варта часцей праводзіць агульныя сустрэчы, вучобу з прыцягненнем прадстаўнікоў розных службаў і ўстаноў, ствараць пляцоўкі для кантактаў і абмену вопытам. Добра было б праводзіць такія мерапрыемствы на тэрыторыі ЖЭСаў, чые тэрытарыяльныя камітэты сталі пераможцамі конкурсу, — каб сваімі вачыма ўбачыць добрую работу.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

“ Падчас «рэйду» выявілася шмат праблем: лямпачкі, якія даўно перагарэлі, смецце, стыхійныя кладоўкі... Пры тым, што тэхнічныя памяшканні павінны адпавядаць супрацьпажарным нормам.

ГЛЯДЗІЦЕ, ХТО ПРЫЙШОЎ!

# ШТО Ў ПРЫЯРЫТЭЦЕ?

**НАШ карэспандэнт пагутарыў са старшынямі раённых Саветаў дэпутатаў Віцебшчыны, якіх упершыню абралі на гэтыя пасады. Што, на іх погляд, неабходна ў першую чаргу зрабіць на канкрэтнай тэрыторыі для сацыяльна-эканамічнага развіцця? Якія актуальныя праблемы мясцовасці патрабуюць вырашэння?**

**Старшыня Ушацкага раённага Савета дэпутатаў Наталля МАРКОВІЧ** расказала, што ў Год малой радзімы шмат увагі будзе ўдзяляцца навядзенню парадку на зямлі. Адпаведныя планы распрацаваны ўсімі сельвыканкамамі. У населеных пунктах плануюць ствараць, добраўпарадкаваць месцы для сямейнага адпачынку, прывесці ў парадак лаўкі, альтанкі, драўляныя «грыбкі»...

— У раёне рэалізуецца праект "Мая вёска — мой клопат". Актывізуем у ліку іншага знішчэнне баршчэўніку, якога ў нас, на жаль, нямала, — дадала старшыня райсавета.

У райцэнтры дзякуючы падтрымцы старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзіміра Андрэйчанкі (у парламенце ён прадстаўляе інтарэсы выбаршчыкаў раёна) будуецца дзіцячая школа мастацтваў, робяць рамонт у бальніцы і капітальны рамонт у дзіцячым садку № 3. А дэпутат абласнога савета Сяргей Даніловіч актыўна спрыяе, каб быў праведзены рамонт стадыёна ў райцэнтры.

**Старшыня Аршанскага раённага Савета дэпутатаў Анатоль СІЛЬЧАНКА** не толькі расказаў пра тое, што плануецца зрабіць у Год малой Радзімы, а і нагадаў, што ўся краіна глядзіць на Аршаншчыну.

— Шмат задач у сувязі з тым, што кіраўнік дзяржавы даручыў зрабіць наш раён узорным. Тут павінны быць створаны найлепшыя ўмовы для жыцця і працы. Дарэчы, каб Аршаншчына стала больш прыцягальнай для прадпрымальных людзей, у ліку іншага створаны бізнес-інкубатар, — расказаў суразмоўнік.

**Старшыня Віцебскага раённага Савета дэпутатаў Віктар ДАРОЖКІН** упэўнены: для таго каб эфектыўней рэалізоўваць інвестыцыйныя праекты, трэба ствараць больш спрыяльныя ўмовы. Напрыклад, калі б зямельныя ўчасткі рэалізоўваліся не на аўкцыёнах, а па заяўным прынцыпе — пад бізнес-справу, дзелавыя людзі зацікавіліся б такой магчымасцю...

— Таксама хочацца, каб у раёне павялічылася колькасць аб'ектаў турыстычнага бізнесу, аграрных сядзіб. У нас шмат добрых месцаў для прыёму турыстаў, як і цікавых аб'ектаў гісторыі і культуры, — удакладніў ён.

**Старшыня Лепельскага раённага Савета дэпутатаў Ігар УРБАН** лічыць, што ў Год малой радзімы трэба прывучаць землякоў, каб самі наводзілі парадак, бралі ўдзел у добраўпарадкаванні. І ў першую чаргу — на сваіх участках. Плануецца больш актыўна рэалізоўваць зямельныя ўчасткі на аўкцыёнах...

**Старшыня Пастаўскага раённага Савета дэпутатаў Пётр КУРТО** расказаў, што трэба яшчэ шмат зрабіць для выкарыстання аб'ектаў нерухомасці. Нагадаў, што ў раёне нядаўна адбылося выязное пасяджэнне прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў па гэтым пытанні. Пастаўскі вопыт быў адзначаны як станоўчы. У самым заходнім рэгіёне вобласці, на мяжы з ЕС засталося шмат нерухомасці, якая ў часы СССР была пабудаваная для патрэб ваенных.

— У дадатак трэба ўключаць у гаспадарчы абарот будынкі і збудаванні прадпрыемстваў, якія закрыліся, устаноў адукацыі, культуры, — дадаў суразмоўнік.

Дарэчы, усё больш прыкладаў, калі яны эфектыўна выкарыстоўваюцца новымі гаспадарамі: пад вытворчасць, гатэлі, іншыя аб'екты для турыстаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ЭКАЛОГІЯ

# СОНЕЧНЫ «ПАДАГРАВАЛЬНІК»

**НА даху дзіцячага садка ў Браславе з'явяцца сонечныя калектары. Яны дазволяць практычна цалкам закрыць патрэбы дашкольнай установы адукацыі ў гарачай вадзе, па меншай меры, у цёплую пару года.**

Спецыялісты адзначаюць: у добрае сонечнае надвор'е ў Беларусі за суткі можна атрымаць 10 кілават-гадзін энергіі з аднаго квадратнага метра. Гэта значыць, што з красавіка да кастрычніка да 80 працэнтаў неабходнай дзіцячаму садку вады будзе падагрэта менавіта сонцам.

Калектары з'явяцца ў яслях-садзе № 1 менавіта таму, што дашкольная ўстанова загружана круглы год: у адрозненне ад школ, сады не робяць перапынкаў, а менавіта ў летнія месяцы можна атрымаць максімальную аддачу ад абсталявання — выкарыстаць сонца на ўсе 100 працэнтаў.

— Устанаўленне сонечных калектараў для нагрэву вады падыходзіць і для ўстаноў іншага тыпу — тых, што загружаны наведвальнікамі сезонна, пераважна летам, — адзначае каардынатар праекта ад Цэнтра экалагічных рашэнняў Дзмітрый БУРОНКІН. — Для курортнага Браслава гэта, напрыклад, базы адпачынку, санаторыі, лагеры, аграсядзібы. Яны якраз могуць узяць на ўзбраенне рашэнне з сонечнымі калектарамі. Для Браслаўскага раёна, які пазіцыянуе сябе як турыстычны і першы кліматычна нейтральны рэгіён, — гэта ідэальнае рашэнне. А для насельніцтва — добры ўзор выкарыстання ўзнаўляльнай энергіі на мясцовым узроўні.

Такія станоўчыя змяненні сталі магчымыя дзякуючы рэалізацыі ў рэгіёне праекта «Браслаўскі раён — першы кліматычна нейтральны муніцыпалітэт Беларусі», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Браслаўскім райвыканкам і Цэнтрам экалагічных рашэнняў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

БУДЗЬ У КУРСЕ!

## На Гомельшчыне нельга ў лясы

**У сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я, якія ўстанавіліся на тэрыторыі Гомельскай вобласці (працягляя адсутнасць ападкаў), адбылося рэзкае павелічэнне колькасці лясных пажараў, паведамілі ў МНС.**

У сувязі з гэтым, каб не дапусціць ускладнення аператыўнай абстаноўкі і папярэдзіць узнікненне лясных пажараў ва ўсіх раёнах, прыняты рашэнні і распараджэнні аб увядзенні забароны на наведванне лясных угоддзяў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Гайненский сельский исполнительный комитет просит опубликовать следующее объявление:**
**Гайненский сельский исполнительный комитет проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по изготовлению документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Беланы, ул. Березовая, уч. № 1, кадастровый номер 623280800801000043 | 0,1451 | Подъездные пути удовлетворительные | 6000,00 | 1200,00 | 1516,79 |
| 2 | д. Родевичи, ул. Школьная, У-14А, кадастровый номер 623280810601000071 | 0,1824 | Подъездные пути удовлетворительные | 3200,00 | 640,00 | 1689,90 |
| 3 | д. Селец, ул. Озерная, 44, кадастровый номер 623280811201000074 | 0,1484 | Подъездные пути удовлетворительные | 5000,00 | 1000,00 | 1574,66 |

**Аукцион проводится 18.06.2018 г. в 10.00 по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, 2, Логойского района, Минской области, здание Гайненского сельского исполнительного комитета. Документы принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, кроме субботы и воскресенья, до 13 июня 2018 года (последний день подачи документов 12.06.2018 г. до 17.00) по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, 2, Логойского района Минской области.**

Задаток перечисляется на р/с № BY60AKBB36006190211080000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, г. Минск, код – 795, ОКПО 04431493, УНН 600537220, Гайненский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести оплату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Контактные телефоны: 8 01774 56436, 56498

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### об открытом повторном аукционе по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь в Кобринском районе Брестской области 21 июня 2018 года в 11.00

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | д. Полятичи, ул. Новая, 25, Батчинский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380403601000170 | 0,1597 | Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения, водоснабжения | 3000 | 300 | 1551,30 |
| 2. | д. Полятичи, ул. Восточная, 23, Батчинский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380403601000111 | 0,1594 | Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения, водоснабжения | 3000 | 300 | 63,00 |
| 3. | д. Андроново, ул. Дружная, 1, Батчинский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380400101000386 | 0,1585 | Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения, водоснабжения | 3000 | 300 | 1274,44 |

***Дополнительно возмещаются расходы на публикацию извещения в СМИ***

Организатор аукционов – Кобринский районный исполнительный комитет
**Аукцион состоится 21 июня 2018 года** по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.
**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу:**
**г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403, с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**
**Последний день приема заявлений – 15 июня 2018 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.**
Продажа земельных участков осуществляется только гражданам Республики Беларусь.
К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
На основании подпункта 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, предоставленному для строительства одноквартирного жилого дома в районах индивидуальной жилой застройки, подлежат возмещению в порядке, установленном положением о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 1 апреля 2014 г. № 298.
Величина затрат, возмещаемых гражданином, юридическим лицом, являющимся застройщиком жилого дома, определяется Кобринским райисполкомом при выдаче разрешительной документации на возведение одноквартирного жилого дома.
Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте http://kobrin.brest-region.gov.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### об открытом повторном аукционе на право заключения договора аренды земельного участка в г. Кобрине Брестской области 21 июня 2018 года в 11.30

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Срок аренды земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Кобрин, ул. Интернациональная | Строительство и обслуживание многоквартирного жилого дома (для размещения объектов многоквартирной жилой застройки) | 10 лет | 124350100001007780 | 1,1621 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения | 170000 | 17000 | 1570,28 |

***Дополнительно возмещаются расходы на публикацию извещения в СМИ***

Организатор аукциона – Кобринский районный исполнительный комитет
**Аукцион состоится 21 июня 2018 года по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.**
**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу:**
**г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403, с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**
**Последний день приема заявлений – 15 июня 2018 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.**
Продажа права заключения договора аренды земельного участка осуществляется индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам.
К участию в аукционе допускаются индивидуальные предприниматели, юридические лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо), подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте http://kobrin.brest-region.gov.by

# ЗЯМЛЯ ПАД НАГАМІ

## Асабістая падсобная гаспадарка становіцца спосабам утрымання сям'і

**Хоць Тамашоўскі сельсавет самы аддалены ў Брэсцкім раёне — адлегласць да горада складае 60 кіламетраў — тут зусім няшмат зямлі, якую можна аддаць пад асабістую падсобную гаспадарку. Сельсавет «заціснуты» паміж дзвюма суседнімі дзяржавамі — Польшчай і Украінай. На карце яго выцягнутая з поўначы на поўдзень тэрыторыя акрэслена з двух бакоў дзяржаўнымі межамі. Напрыклад, выехаўшы з Орхава, можна было б за чвэрць гадзіны пабываць у трох дзяржавах — каб не строгі памежны рэжым, вядома.**

### Доўгатэрміновая арэнда

Кожны лапік зямлі тут на ўліку. А людзей, якія хочуць працаваць на зямлі, хапае. Рашэннем сельвыканкама ўчасткі перадаюцца грамадзянам для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, а таксама для агародніцтва, у часовае карыстанне да 10 гадоў альбо ў арэнду. У кожным выпадку заява разглядаецца індывідуальна і прымаецца адпаведнае рашэнне. Часцей людзі звяртаюцца, каб узаконіць свой «агарод», які яны карыстаюцца шмат гадоў. Гаворка ідзе пра 15, 20, 30 сотак зямлі, размешчаных побач з домам. Вядома, такія ўчасткі перадаюцца ў пажыццёвае спадчыннае карыстанне.

Але цяпер з'яўляецца ўсё больш людзей, якія падсобную гаспадарку робяць асноўным заняткам. Вяскоўцы выбіраюць сабе для вырошчвання якую-небудзь сельгаскультуру, займаюцца ёй амаль што прафесійна, з выкананнем тэхналогіі, а ў выніку атрымліваюць добры ўраджай і адпаведны прыбытак. Такія гаспадары бяруць да трох гектараў зямлі, якая выдзяляецца ў арэнду на доўгі тэрмін, звычайна на 50 гадоў, у асобных выпадках — на 90 гадоў. Гэта фактычна азначае пажыццёвае карыстанне. Гаспадар плаціць фіксаваны падатак за карыстанне зямлёй і лічыцца занятым. Хоць яму не налічваецца працоўны стаж, але і ў шэрагі непрацуючых грамадзян ён не трапляе.

Было б па меншай меры дзіўна называць утрыманцам чалавека, які працуе на зямлі ад цямна да цямна. Такіх гаспадароў нямала ў Тамашоўскім сельсавеце. З адным з іх, Сяргеем Глушуком, мы сустрэліся ў полі каля вёскі Орхава. Поле Глушукоў шчыльна прымыкае да лесу, дзе стаіць вялікі інфармацыйны стэнд. Апошні папярэджвае аб забароне наведваць лес, бо гэта ўжо памежная тэрыторыя. Мабыць, таму гэты кавалак зямлі паміж вёскай і пагранзонай гістарычна застаўся нібы і нічыйным. Сельгаспрадпрыемства не праяўляла цікавасці не толькі праз блізкасць мяжы, але і праз балоцістасць участка. Таму калі вырашылі асвойваць зямлю, найперш заняліся меліярацыяй. «Гаспадар выкапаў сажалку, куды сышла лішняя вада. Ну і значна палепшыў участак, акуратыўны яго», — расказала карэспандэнту МС **старшыня Тамашоўскага сельскага Савета Алена БУРАК.**

### Працуем разам

Тры сям'і — Сяргей Ульянавіч з жонкай і двое іх дарослых сыноў з сем'ямі — арандуюць цяпер шэсць гектараў зямлі, на якой вырошчваюць буякі.

— Буякі — культура для цярплівых — расказвае Сяргей Глушук. — Людзі ж прывыклі разважаць, як вядомы персанаж: ранкам грошы — вечарам крэслы. А тут трэба працаваць пяцьсем гадоў настойліва, карпатліва, а потым ужо разлічваць на дывідэнды. Гэтая культура забірае час з ранку да вечара. Раней я займаўся гандлем як прадпрымальнік, потым разводзіў рыбу. Але вось тут адчуў сябе найлепш. Пададбаецца, што ўся сям'я шчыруе на зямлі побач са мной, мае сыны, нявесткі, жонка. Усе разам працуем, пралічваем рызыкі, разлічваем на нейкі вынік,— працягвае гаспадар. — Так і напішыце, што вельмі правільна зрабіла дзяржава, калі павярнулася тварам да сельская гаспадара. Не трэба нават афармляць фермерства альбо рэгістравацца як прадпрымальнік — працуй паводле закону і атрымлівай прыбытак, які дазволіць утрымліваць сям'ю.

Родам Сяргей Глушук з суседняй вёскі. Бацькі-дзяды працавалі на зямлі, у калгасе. Таму невыпадкова гаспадар з Орхава зразумеў, што гэта менавіта яго справа. Як сказаў яго калега Аляксандр Сцепанюк: «Калі заняўся падсобнай гаспадаркай, упершыню нібы адчуў цвёрдую аснову пад нагамі». Сяргей Ульянавіч кажа, што спадзяецца атрымаць сапраўдны ўраджай, рэалізаваць яго, і ўбачыць рэальны прыбытак. Пакуль жа маладыя расліны даюць невялікі ўраджай, які толькі часткова пакрывае расходы. А іх шмат: купілі свой трактар, бо без тэхнікі апрацаваць такое поле нерэальна. Пэўныя выдаткі ідуць на паліў. Індывідуальным гаспадарам не даюць крэдыт, а ў саміх пакуль не атрымліваецца купіць аўтаматычную сістэму кропельнага паліву.



Мікалай ЛАГОДЗІЧ, Юрый ПАНАСАВЕЦ, Ігар ЛАГОДЗІЧ даглядаюць буякі.

### Законы — пад жыццё

Яшчэ адну праблему, якую ўзняў гаспадар з Орхава, думаю, варта агучыць. Аднойчы ў размове з ім адна чыноўніца выканкама папярэдзіла: маўляў, калі вы прыцягнеце да ўборкі ўраджаю рабочую сілу, скажам, з Украіны, — можаце страціць сваё права арэнды зямлі.

— І тады я задумаўся: а чаму? Мы ж усе ведаем, што нашы людзі ездзяць на заработкі ў суседнія краіны. А чаму наадварот нельга? Можна ж стварыць сістэму, калі такая практыка будзе выгадная і грамадзяніну, і дзяржаве. Скажам, я атрымаў ураджай, і да мяне збіраюцца прыехаць на ўборку некальскі чалавек з вёскі, якая цяпер за мяжой. Я іду ў падатковую інспекцыю, пакідаю там заяву, плачу вызначаную суму за кожнага наёмнага работніка, вырашаю фармальнасці на заставе і вязу людзей у поле... Чаму не? Думаю, вось такі падыход выглядае цывілізаваным, а не забароны і пагрозы, якія даводзіцца чуць гаспадарам. У мяне пакуль няма гэтых праблем, але яны ўзнікнуць праз пару гадоў, калі пачне прырастаць ураджай. Лічу, што надышоў час перагледзець сістэму, якая прымушае людзей ісці на рызыку і парушаць закон. Проста яго трэба падстроіць пад жыццёвыя рэаліі. І ўсё будзе добра для ўсіх, — лічыць Сяргей Глушук.

### Селяхоўская кааперацыя

Побач з вёскай Селяхі таксама быў кавалак зямлі, які не выкарыстоўваўся. Гаспадарцы з вялікай тэхнікай там круціцца не выпадала, вось і застаўся ён зарастаць кустоўем паміж лясамі. Не вельмі законапаслухмяныя грамадзяне прывычаіліся паціху вывозіць сюды бытавыя адходы. Прыбярэ сельвыканкам з дапамогай ЖКГ несанкцыянаваны сметнік, а праз некаторы час ён зноў утворыцца. Так было, пакуль чатыры гады таму названы ўчастак не ўзялі ў арэнду трое жыхароў Тамашоўкі: Ігар і Мікалай Лагодзічы і Юрый Панасавец. Узялі таксама з разлікам на вырошчванне буякоў. Першыя паўтара года новыя гаспадары вывозілі рэшткі смецця, выкарчоўвалі хмызняк, прыводзілі ў парадак зямлю. Потым пасадзілі маладыя саджанцы. І вось летась атрымалі першы, хоць зусім невялікі, ураджай.

Ігар Лагодзіч, як, дарэчы, і астатнія гаспадары з Селяхоў, мае сельскагаспадарчую адукацыю, праўда, па спецыяльнасці заатэхнік. Але, гаворыць, калі заняўся сваёй справай, адчуў пэўны азарт: хочацца эксперыментаваць, знаходзіць у інтэрнэце і літаратуры нешта новае, прымяняць на практыцы. Разам яны адвялі невялікую плантацыю пад розныя сарты маліны, экзатычную расліну годжы, ягады якой багатыя на вітаміны і карысныя для тых, хто хоча скінуць вагу. Карацей кажучы, людзі маладыя, здольныя да авантур у добрым сэнсе слова. Можа, і сапраўды іх гаспадарка стане вядомай у ваколіцы і да іх многія захочуць прыехаць па прадукцыю.

А яшчэ ў Селяхах узнікла тое, што можна назваць сельскагаспадарчай кааперацыяй. Бо гэтыя тры гаспадары купілі адзін на ўсіх трактар, змантавалі адзіную сістэму кропельнага арашэння буякоў. І працуюць разам, спачатку на адным полі, потым пераходзяць на іншы ўчастак. Тая ж ідэя, якую некалі выкарыстоўвалі пры арганізацыі калгасаў, толькі ў значна меншым маштабе.

Наогул буякамі ў гэтай зоне людзі пачалі займацца ўжо з дзясятак гадоў таму. Хто адводзіць 30 сотак пад названую культуру, а хто, як бачым, і тры гектары. Калі выконваць тэхналогію, гэтыя ягады здольныя даваць добры ўраджай і служыць спосабам утрымання сям'і для гаспадара. Галоўнай праблемай для вяскоўца становіцца рэалізацыя вырашчанага. Пакуль гэта пытанне вырашаецца з дапамогай перакупшчыкаў, якія прыязджаюць, забіраюць ягаду з фуры-халадзільнікі і вязуць на Расію. Калі ягаднікі падрастуць і аб'ёмы рэалізацыі павялічацца ў разы, узнікне пытанне аб стварэнні хоць бы аптовых рынкаў, як гэта зроблена, напрыклад, у Альшанах, куды прыязджаюць пакупнікі агароднін.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**

*Брэсцкі раён.*


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белсантехмонтаж-2», г. Минск, ул. Брилевская, 15 |

**Предмет аукциона**
**Имущество, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Промышленный, 12, в составе:**

| Наименование | Назначение | Общ. пл., кв. м | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| **Навес-склад (литер В 1/кп)** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 3433 | 500/С-29825 |
| **Цех изоляции труб и открытая площадка № 1, № 2 (литер Е 1/кп)** | Здание неустановленного назначения | 1147 | 500/С-31742 |
| **Д 1/к. Гараж** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 380 | 500/С-29823 |
| **Насосная станция. Литер Ж 1/к** | Здание неустановленного назначения (составные части и принадлежности: два подземных резервуара) | 51 | 500/С-31729 |
| **Здание административно-хозяйственное** | Здание административно-хозяйственное | 4343,8 | 500/С-29809 |
| **Пост сварки** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 52,3 | 500/С-31254 |
| **Пост сварки** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 26,9 | 500/С-35219 |
| **Внутренние сети связи** | Сооружение специализированное связи | 96,7 | 500/С-1025198 |
| **Хозяйственно-бытовая канализационная сеть** | Сооружение специализированное коммунального хозяйства | 261,8 | 500/С-1025197 |
| **Ливневая канализационная сеть** | | 1170,7 | 500/С-1025196 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок, общ. пл. 4,6795 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания административно-бытового, производственных и складских зданий и сооружений. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,2250 га; в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,0210 га; обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ, площадь 4,8772 га |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **4 980 840,00 белорусских рублей** |
| **Обременения** | Аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона www.cpo.by |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **18.06.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **14.06.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |



**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**
**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**
**220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А**

Режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел.: 327-52-36, 226-03-01.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3 лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

ул. Щорса, д. 1 – 41 мес., ул. Налибокская, д. 34 – 20 мес., ул. Одинцова, д. 54 – 13 мес., ул. Г. Ширмы, д. 7 – 18 мес., пр-т Газеты «Правда», д. 1 – 15 мес., ул. Одинцова, д. 56 – 13 мес., ул. Горецкого, д. 36 – 13 мес., ул. Академика Высоцкого, д. 3 – 9,8 мес., ул. Героев 120-й Дивизии, 2 – 23,9 мес., ул. Пономарева, 9А – 22 мес.

Объединение осуществляет строительство объекта «Комплексный проект застройки жилой территории в границах улиц Притыцкого, Скрипникова, Одинцова, Лобанка (микрорайон № 3)». Жилой дом № 32 по генплану.

Свидетельство (удостоверение) № 500/938-5799 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 24 октября 2016 года.

Земельный участок площадью 0,1645 га.

Проектом предусмотрено строительство односекционного 19-этажного 132-квартирного жилого дома в конструкциях серии М111-90 с техническим подпольем и теплым чердаком.

Начало строительства жилого дома – 26 июля 2017 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – 25 июня 2018 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу (заключение от 04.08.2015 № 374-15/15, дополнение к заключению от 12.01.2017 № 675-15/16).

Договор строительного подряда от 04.07.2017 № 205с-07-17, генподрядчик – ОАО «МАПИД».

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить, на строительство квартир:

Однокомнатные №№ 2, 4, 6, 36, 38, 40, 43, 45, 47, 50, 52, 54, 68, 71, 73, 75, 78, 80, 82, 85, 87, 89, 92, 94, 96, 99, 101, 103, 106, 108, 110, 113, 115, 117, 120, 122, 124, 127, 129, 131.

Двухкомнатные №№ 1, 3, 5, 35, 37, 39, 42, 44, 46, 49, 51, 53, 56, 63, 70, 72, 74, 77, 79, 81, 84, 86, 88, 91, 93, 95, 98, 100, 102, 105, 107, 109, 112, 114, 116, 119, 121, 123, 126, 128, 130.

Трехкомнатные №№ 41, 48, 55, 62, 69, 76, 83, 90, 97, 104, 111, 118, 125, 132.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

2 200 руб. – для 1-комнатных, 2-комнатных и 3-комнатных квартир, расположенных на 1, 6–19 этажах, при условии оплаты согласно графику платежей.

Первоначальный взнос при условии оплаты согласно графику платежей составляет 50 % от стоимости квартиры, оплата должна быть произведена дольщиком в течение 3 (трех) календарных дней со дня регистрации в Мингорисполкоме договора создания объекта долевого строительства.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений.

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## РАЗАМ ЛЯГЧЭЙ

**Карэспандэнт газеты «Ляхавіцкі веснік» завітала ў аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў Ляхавіцкага ТЦСАН, дзе распытала наведвальнікаў пра іх радасці і праблемы.**

Галоўны плюс гэтых устаноў у тым, што ты не застаешся са сваімі пакутамі сам-насам. **Анастасіі РАКАШЭВІЧ** з Гаслаўшчыны 19 гадоў, днямі яна ўпершыню завітала ў аддзяленне. Спачатку не хацела, але сяброўка, якая займаецца ў такім жа цэнтры ў іншым горадзе, пераканала. У выніку засталася задаволеная: «Цягне паспрабаваць многае, мару навучыцца шыць лялькі ў стылі тыльда, асвоіць тэхніку дэкупаж. Уразіла камфортная абстаноўка, асаблівая ўтульнасць, адчуваеш сябе па-дамашняму. Тут знайшла тое і тых, чаго і каго мне вельмі не хапала апошнія два гады пасля вучобы ў Асіповіцкай школе-інтэрнаце, — аднадумцаў, якія разумеюць цябе без слоў», — гаворыць дзяўчына.

Не абышлося і без размовы пра надзённыя клопаты. **Ала ШАПЕЛЬ** наведвае аддзяленне восем гадоў: «Дабірацца складана: спецыяльны транспарт не прадугледжаны, а на калясцы няма магчымасці. Дзе тратуары вузкія, дзе бардзюры высокія, на горку пад райбальніцу на інваліднай калясцы нялёгка падымацца. Сюды сябры падвозяць, **старшыня раённай арганізацыі інвалідаў Людміла ГНЯЦЕЦКАЯ** часта дапамагае дабрацца да аддзялення». Цяжкасці сустракаюцца і ў іншых месцах. Анастасія дадае: «У Русінавічах на адным з павароташ не прадугледжаны пешаходны пераход, і пакуль дойдзеш да бліжэйшай «зебры», трэба пераадолець высокі бардзюр. Зрабіць гэта з хадулямі для мяне складана: даводзіцца ісці па праезнай частцы. Небяспечна, ды і перашкаджаю транспарту».

## ДЗЕНЬ З ФЕЛЬЧАРАМ

**Часова змяніць рэдакцыю на медкабінет вырашыла карэспандэнт газеты «Хойніцкія навіны». Яна з васьмі гадзін раніцы працавала разам з фельчарам выязной брыгады аддзялення хуткай медыцынскай дапамогі Хойніцкай ЦРБ Максімам ЗАЛУЖНЫМ.**



www.hoiniki.by

**Максім ЗАЛУЖНЫ правярае абсталяванне перад выездам.**

За гэты, шчыра кажучы, няпросты дзень атрымалася адчуць розныя эмоцыі. Ужо праз дзесяць хвілін да фельчара звярнуўся жыхар вёскі Слабажанка са скаргай на галаўны боль. Максім зрабіў укол і даў таблетку. Пасля аказання дапамогі пачаў праверку медыцынскага абсталявання. Паглядзеў, ці зараджаны кардыёграф і дэфібрылятар, ці дастаткова кіслароду ў балонах, ці хапае лекаў. Апоўдні паступіў выклік: у хаце стала дрэнна бабулі. Фельчар паспеў і аказаў усю неабходную дапамогу, пасля чаго жанчыну адвезлі ў бальніцу.

А потым яго чакаў выклік з прычыны смяротнага выпадку. Максім канстатаваў смерць мужчыны, пакуль на месца з'язджаліся міліцыя, следчы і судэксперт. За два гады на гэтай пасадзе фельчар абслужыў 2150 выклікаў, нават дапамог нарадзіцца двум дзеткам. Па-за працай Максім марыць дасканала авалодаць італьянскай мовай, а аднаўляе свой эмацыянальны стан, катаючыся на роліках.

## СЯМ'Я — ПЕРАМОЖЦА

**У Зельве жыве сям'я Вольгі і Андрэя ЛЯНЕЦ. Яны разам з дзецьмі — Арцёмам і Ульянай — перамаглі ў абласным анлайн-фестывалі «Сям'я ў XXI стагоддзі», паведамляе раённая газета «Праца».**

Упершыню будучыя муж і жонка ўбачылі адно аднаго ў летнім лагеры, але пазнаёміліся толькі праз некаторы час у сяброў. Праз год згулялі вяселле. Андрэй працуе ў праваахоўных органах, Вольга — метадыст цэнтра творчасці дзяцей і моладзі. Сын Арцём зараз вучыцца ў чацвёртым класе, іграе на баяне, разам з татам займаецца фізкультурай і глядзіць спартыўныя перадачы. Дачцэ Ульяне пяць гадоў, яна танцуе і малюе. Традыцыйнымі сталі ўжо сямейныя святы, калі ўсе разам гатуюць смачненькае, прыдумляюць конкурсы і сюрпрызы. У вольны час сям'я Лянец любіць вандраваць па Беларусі, ездзіць у велапаходы, на прыроду, наведвае новыя гарады.

## ГАНДАЛЬ ПАРУШЫЎ ПРАВІЛЫ

**Спецыялісты Маладзечанскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі знайшлі ў гандлёвых аб'ектах парушэнні патрабаванняў санітарна-эпідэміялагічнага заканадаўства па рэалізацыі харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, паведамляе «Маладзечанская газета».**

З пачатку гэтага года былі абследаваны 110 розных гандлёвых кропак, у тым ліку вядомых сеткавых крамаў. На 13 аб'ектах не выконваліся патрабаванні да маркіроўкі харчовай прадукцыі, на 11 рэалізоўвалася пратэрмінаваная, на чатырох не выконваўся тэмпературны рэжым захоўвання і рэалізацыі, на 78 выяўлены іншыя парушэнні. У выніку забаронена рэалізацыя 246 кілаграмаў недабраякасных харчовых прадуктаў. У адрас кіраўнікоў суб'ектаў гаспадарання накіраваны рэкамендацыі па ліквідацыі выяўленых парушэнняў.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

СІТУАЦЫЯ

# ПРЫГАЖОСЦЬ ПАТРАБУЕ АХВЯР

## Чаму ў Жодзіне высякаюць дрэвы

**ГЭТАЙ вясновай парой Жодзіна нагадвае сапраўдны мурашнік. Туды-сюды снуюць машыны з будаўнічымі матэрыяламі, асфальтуюцца вуліцы, выкладваюцца пліткай тратуары, парадкуюцца дваровыя тэрыторыі. Значныя змены закранулі і гарадскі парк. Тут з'явіцца шмат новых зон, аб'ектаў для адпачынку, заняткаў фізкультурай і спортам. Вядома, такія маштабныя работы ствараюць і нязручнасці для жыхароў, хоць большасць з іх ставіцца з разуменнем да часовых цяжкасцяў: напярэдадні юбілей Жодзіна, які сёлета прымеркаваны да Дня вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. А свята, як правіла, сустракаюць належным чынам.**



Але ёсць і незадаволеныя. У рэдакцыю звярнулася жыхарка горада Галіна Мілько. «Не магу маўчаць, хочацца паведаміць усяму свету пра, як мне здаецца, дзікунства, што робіцца ў нашым горадзе, — піша ў сваім лісце жанчына. — У Год малой радзімы ў Жодзіне аб'явілі сапраўдную вайну дрэвам. Цяжка палічыць, колькі за апошні год загінула зялёных прыгажуноў. Вуліца Маскоўская — уся прыдарожная шарэнга, вуліца 40 Год Кастрычніка — ліпы ўздоўж агароджы каля «БелАЗа». На праспекце Міру для таго каб зрабіць алею ліхтароў, зноў пілавалі ліпы. На тэрыторыі санаторнага дзіцячага садка № 22 па вуліцы 50 Год Кастрычніка загубілі каля 20 маладых здаровых ліп».

Мы папрасілі растлумачыць сітуацыю **намесніка старшыні Жодзінскага гарвыканкама па жыллёва-камунальнай гаспадарцы Аляксандра ШЫЛА:**

—Што датычыцца дзіцячай установы, то тут высякаліся так званыя вялікія ветравыя дрэвы, якія пад парывамі ветру раскачваліся і хісталіся. І нават калі яны не аварыйныя, то пры моцных парывах ствараюць небяспеку для людзей, бо могуць упасці. Месца там прахадное, як транзітны калідор, ходзяць дзеці, рабочыя аўтамабільнага завода. Таму ўсе крайнія дрэвы прыбіраліся. Але перш чым іх зрэзаць, мы правялі адпаведную работу сумесна з прадстаўнікамі гарадскога аддзела Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, узгаднілі пытанне з экалагічнай службай, стварылі спецыяльную камісію. І толькі затым было прынята рашэнне гарвыканкама.

Акрамя таго, як адзначыў Аляксандр Шыла, дрэвы высякаюцца ў межах капітальнага рамонту або па ўзгадненні з адпаведнымі службамі там, дзе патрабуецца павелічэнне колькасці паркавачных месцаў для транспарту. Пры распрацоўцы праектна-каштарыснай дакументацыі гэтыя дрэвы абавязкова ўказваюцца ў дакументце. Разам з тым прадугледжваюцца кампенсацыйныя пасадкі, замест аднаго дрэва будзе пасаджана некалькі. «Таму ні адно дрэва беспадстаўна не высякаецца, кожнае адзначана ў праекце. І ніякіх лішніх рухаў па высечцы мы не робім», — сцвярджае спецыяліст.

> Праблема машына-месцаў становіцца ўсё больш актуальнай і канфліктнай: каму ж прыемна бачыць пад вокнамі кватэры на газоне суседскае аўто?

Перад тым як приступаць да справы, канстатуе ён, улады збіраюць людзей, каб выслухаць іх меркаванне. У прыватнасці пры капітальным рамонце былі звароты грамадзян па ўладкаванні пляцоўкі для смецця, адходаў, устаноўцы кантэйнераў. «Але заадно мы закранулі і тэму высечкі дрэў. Са згоды жыхароў выдалілі чатыры для пашырэння дарогі, на якой не маглі размінуцца дзве машыны. Праблема яшчэ ў тым, што часам пры ўпарадкаванні дарог у дрэва закранаюцца карэнні, і праз год-другі яно гіне. Мы ўжо сутыкаліся з такой практыкай. Напрыклад, па тым баку вуліцы, дзе аўтастаянка, не планавалася краінаць зялёныя насаджэнні, — абклалі іх пліткай. Але праз паўгода яны высахлі», — паказвае Аляксандр Шыла.

Не ўсе ставяцца з разуменнем да сітуацыі. Людзі пажылога ўзросту, якія калісьці пасадзілі гэтае дрэва, супраць таго, каб яго высякалі. Маладыя лічаць інакш: пляцоўкі трэба расшыраць, паколькі даводзіцца ставіць машыны на газонах, паміж дрэвамі, што небяспечна падчас буры, навальніцы. Праблема машына-месцаў становіцца ўсё больш актуальнай і канфліктнай: каму ж прыемна бачыць пад вокнамі кватэры на газоне суседскае аўто? Тым не менш тыя, хто паркуецца на зялёнай траве, разводзяць рукамі: а куды дзявацца.

—Таму мы імкнёмся тлумачыць сітуацыю, знаходзіць агульную мову як з праціўнікамі высечкі зялёных насаджэнняў, так і з яе прыхільнікамі. Калі адбываецца капітальны рамонт, сустракаемся з жыхарамі літаральна кожнага дома, — кажа спецыяліст.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 17 мая 2018 года.**